WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

15 ВЕРАСНЯ 2009 г.
АЎТОРАК
№ 173
(26531)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

На выхадныя ўначы — першыя замаразкі

На працягу тыдня тэрыторыя Беларусі будзе знаходзіцца пад уплывам зоны павышанага ціску, таму нас чакае пераважна сонечнае надвор'е, паведамляе рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.

Толькі ў аўторак месцамі па поўдні Беларусі, 16 верасня — у паўночна-заходніх раёнах, а ў пятніцу месцамі на ўсходзе краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Выключэннем стане чацвер, калі кароткачасовыя дажджы пройдуць паўсюдна ў краіне. Верагодныя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы на працягу тыдня будзе вагацца ад 5 градусаў на поўначы да 14 цяпла на поўдні Беларусі. Удзень у першай палове тыдня 16—23, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях — да 25 градусаў. Удзень у пятніцу — 15—20 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, на выхадныя да нас завітае Скандынаўскі антыцыклон, і істотна пахаладае ўначы. Тэмпература — 3—10, на тарфяніках Палесся магчымыя невялікія замаразкі — да 0 — мінус 2 градусаў. Удзень у суботу — 15—20, па паўднёвым захадзе — да 22 цяпла. У нядзелю крыху пацяплее.

Сяргей КУРКАЧ.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«БЕЛАРУСЬ ГАТОВА ВЕСЦІ ДЫЯЛОГ З ЛІТВОЙ НА ЛЮБЫМ УЗРОЎНІ»

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю літоўскім СМІ.

«Мы адкрыты для стасункаў і гатовы весці дыялог на любым узроўні», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым ён адзначыў, што «не перажывае за адносіны з Літвой, з нашымі суседзямі». «Мы павінны супрацоўнічаць, мы суседзі, і ад гэтага карысць і вам, і нам», — перакананы Прэзідэнт. Што датычыцца планаемага візіту ў Вільнюс, Аляксандр Лукашэнка чакае «добрай сустрэчы» са сваёй калегай. «У нас ёсць пра што пагаварыць, — дадаў ён. — Нам трэба прарэзіваваць нашы адносіны, намеціць шляхі развіцця супрацоўніцтва з Літвой». Гаворачы аб адносінах Беларусі з Еўрасаюзам, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што тут не павінна быць нейкіх бар'ераў. «Мы павінны адзін на аднаго глядзець прама, у вочы, а не праз нейкую сцяну, «Берлінскую сцяну», якую перанеслі на Усход. Чаму беларусы і літоўцы павінны праз яе глядзець адзін на аднаго?» — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

БЕЛТА.

АФІЦЭР ІДЗЕ Ў БОЙ ЗА РАДЗІМУ, А НАЁМНІК — ЗА ГРОШЫ

Міністэрства абароны напярэдадні актыўнай фазы вучэнняў «Захад-2009» сабрала кіраўнікоў рэспубліканскіх СМІ на вучэбны семінар, каб расказаць пра працэс падрыхтоўкі ваенных спецыялістаў у краіне. Журналісты мелі магчымасць ацаніць падрыхтоўчую базу вайсковага факультэта БНТУ і Вайсковай акадэміі, дзе зараз вучацца будучыя афіцэры.

Міністр абароны Леанід Мальцаў, які і праводзіў экскурсію для журналістаў, лічыць, што ўзровень адукацыі на ўсіх вайсковых факультэтах рэспублікі прыкладна аднолькавы і што сама ідэя вайсковых факультэтаў, інтэграваных у агульную сістэму адукацыі, сябе апраўдала — курсантам чытаюць лекцыі тыя ж прафесары і дактары навук, што і звычайным студэнтам, а калі трэба было б запрашаць іх толькі для курсантаў, то выдаткі на падрыхтоўку афіцэраў былі б значна большыя.

СТАР. 2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ІМКЛІВАЯ МАМА

в. Дабрамыслі, Лёзненскі раён.

СУСВЕТНЫ КРЫЗІС УЗНІК НЕ НА ПУСТЫМ МЕСЦЫ

Сёння спаўняецца роўна год пасля таго, як фінансавы гігант банк Lehman Brothers аб'явіў аб банкруцтве, што прывяло да абвалу амерыканскага рынку і надыходу найбуйнейшага крызісу. У свеце гэты дзень называюць афіцыйным пачаткам «Вялікай Рэцэсіі». Хаця не ўсе эксперты схільныя менавіта 15 верасня аб'яўляць датай пачатку глабальнага крызісу. У прыватнасці, вядомы эксперт, намеснік дырэктара Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Георгій ГРЫЦ лічыць гэтую дату дастаткова ўмоўнай.

— Таму што крызісу, які называюць глабальнай рэцэсіяй ці сусветным крызісам, — тлумачыць эксперт, — папярэднічала чарада крызісаў, якія не спыняліся. Гэта і крызіс высокатэхналагічных кампаній у першыя гады новага стагоддзя, і іпатэчны крызіс у ЗША, які з'явіўся штуршком для глабальнага і пачаўся не ў 2008 годзе, а раней, калі былі дастаткова ясныя сімптомы. Дзесьці з другога паўгоддзя мінулага года, сапраўды, ён фактычна стаў сусветным крызісам і прывёў да масавых абвалаў фондавых рынкаў, банкруцтва банкаў, гандлёвых войнаў. Гэта значыць, не было пад'ёму, агульнага росквіту — і раптоўна, на пустым месцы, узнік крызіс.

— Георгій Васільевіч, некаторыя эксперты з ахвотай разважаюць аб магчымых сцэнарыях далейшага развіцця сітуацыі, іншыя больш асцярожныя і не бяруцца рабіць прагнозы. Па-рознаму ацэньваецца і тое, чаму ўсё здарылася. Таму і невядома, ці спадзявацца нам на хуткі пад'ём сусветнай эканомікі, альбо замест хуткага развіцця будзе адбывацца далейшае падзенне?

— Што датычыцца ацэнкі крызісу, то, як мне падаецца, дастаткова шчыра выказаўся наконт гэтага Джордж Сорас, якога некаторыя называюць аналітыкам, экспертам, а іншыя — фінансавым спекулянтам. Ён расцэньвае цяперашні крызіс не проста як падзенне рынку іпатэчнага жылля, а фактычна як канец 60-гадовага перыяду развіцця сусветнай сістэмы неалібэральнай эканомікі, заснаванай на глабалізацыі і на двух стаўпах — сучаснай сістэме крэдытавання, у тым ліку фізічных і юрыдычных асобаў, і долары як сусветнай валюце рэзерваў. Стан, які сёння нагадвае сусветная грашова-крэдытная сістэма, Сорас параўнаў з калапсам савецкай сістэмы: ні тады, ні зараз людзі не разумеюць, чаму гэта адбылося і што будзе ў выніку. Вось такі ў чорна-белых танах прагноз.

— За крызісны год прайшло некалькі самітаў «вялікай дваццаткі», на якіх лідары краін-удзельніц узялі на сябе шэраг антыкрызісных абавязацельстваў. Пасля кожнага з іх сусветную грамадскасць інфармуюць аб тым, што на сустрэчы дасягнутыя важныя рашэнні, якія датычацца фінансавай стабільнасці. Тым не менш пра істотнае паляпшэнне сітуацыі казаць пакуль не выпадае.

— На самітах G20 прымаюцца дастаткова традыцыйныя антыкрызісныя захады, сярод якіх, напрыклад, заклік да ўрадаў адмовіцца ад пратэкцыянізму на нацыянальным узроўні, а таксама менш знакавыя, напрыклад, барацьба з афшорамі, з чыноўнікамі банкаў, каб апошнія не атрымлівалі прэміяльных. Аднак будзем шчырымі, адна рэч — размовы, а іншая — што зроблена рэальна. Напрыклад, той жа пратэкцыянізм як працягваўся, так і працягваецца. Я мяркую, што пакуль не адбудзецца цыкл грамадскага абнаўлення сістэмы грашова-крэдытных адносінаў — ад крэдытавання да вытворчасці і збыту (эканамічная тэорыя паказвае, што гэты цыкл у залежнасці ад відаў прадукцыі займае 2-3 гады), найбліжэйшае паляпшэнне сітуацыі наўрад ці можна будзе назваць. Хутчэй за ўсё, сёння трэба весці гутарку не пра тое, што ўраган прайшоў, а пра тое, што спынілася менавіта катастрафічнае падзенне, і цяпер размова ідзе пра стагнацыю сусветнай эканомікі, на працягу якой, магчыма, за год-два будуць выпрацаваны нейкія новыя інструменты.

Айчыннай жа эканоміцы ў прынцыпе не былі ўласцівыя, магчыма, шэраг недахопаў, якія з'явіліся першапрычынай крызісу, у прыватнасці, адсутнічалі гіпертрафаваныя спекулятыўныя фінансавыя рынкі. З аднаго боку, нас заўсёды папракалі замежныя эксперты, што гэта дрэнна, а з іншага — дзякуючы захаванню рэальнага сектара, абвалу не адбылося. Іншая рэч, што ў нас доля экспарту складае 65 працэнтаў ад ВУП. Таму падзенне сусветнай эканомікі непасрэдна ўплывае на экспартную дзейнасць беларускіх прадпрыемстваў, і апошняе, як наступства, уплывае на эканамічны стан Беларусі. Таму нешта трэба рабіць. І Урад прыняў тут шэраг захадаў: маецца на ўвазе лібералізацыя, падтрымка банкаўскага сектара, грашова-крэдытнай сістэмы ў цэлым, падтрымка рэальнага сектара. Разам з тым, неабходная доўгатэрміновая стратэгія ў пасткрызісны перыяд, таму што той эканомікі, якая была ў 2007-2008 гадах, проста не будзе. Трэба казаць пра выпрацоўку новай доўгатэрміновай стратэгіі, і яна на ўзроўні ўказа кіраўніка дзяржавы вызначаная — гэта інавацыйная эканоміка. Але трэба дакладна разумець, што інавацыйны цыкл для прамысловасці складае 5-7 гадоў. У нас такога часу, на жаль, няма. Таму павінна быць дакладна выпрацаванае на ўзроўні канкрэтных планаў стварэнне сапраўды новых вытворчасцяў, менавіта пятага пакалення. Як гэта ні сумна, неабходна вызначыць пункты росту, гэта значыць, сёння, ва ўмовах дэфіцыту крэдытных рэсурсаў, дапамагчы ўсім прадпрыемствам, усім галінам немагчыма. Я упэўнены, што неабходна вызначыць галіны, якім трэба аказваць прыярытэтную фінансавую падтрымку. І падтрымку дзяржавы, таму што сёння ва ўмовах глабалізацыі ідзе канкурэнцыя не на ўзроўні асобных кампаній, а на ўзроўні дзяржаўнага прыватнага партнёрства. І вось гэтыя прыярытэты неабходна вызначаць як мага хутчэй. З майго пункту гледжання, выпрацоўка менавіта доўгатэрміновай пасткрызіснай стратэгіі з'яўляецца несумненным прыярытэтам як Адміністрацыі, так і Урада Беларусі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ГІСТОРЫЯ НЕ ЦЕРПІЦЬ ПЕРАПІСВАННЯЎ

Напярэдадні 17 верасня прадстаўнікі левых партый і грамадскіх аб'яднанняў, парламентарыі і навукоўцы абмеркавалі падзеі 70-гадовай даўніны. Аналізавалі гістарычнае значэнне ўз'яднання Заходняй Беларусі і БССР, ацэньвалі падзею ў кантэксце сучасных рэалій. На канферэнцыі прысутнічалі таксама кіраўнікі дыпмісій В'етнама і Кубы.

— Мы бачым, як з'яўляюцца новыя трактоўкі тых падзей, — дзеліцца сваімі развагамі з журналістамі **старшыня арганізацыі канферэнцыі, другі сакратар ЦК КПБ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Ігар КАРПЕНКА.** — Мы не можам мірыцца з тымі палітычнымі і прававымі ацэнкамі, якія сёння даюцца. Чаму? Таму што прававую і палітычную ацэнку Другой сусветнай вайне далі Ялцінская і Патсдамская канферэнцыі. Нюрнбергскі працэс асудзіў ваенных злачынцаў, а Хельсінкская нарада, якая стаяла ля вытокаў утварэння АБСЕ, таксама заклікала прытрымлівацца дасягнутых дамоўленасцяў. Сёння вось гэтыя ідэолагі роўнай адказнасці СССР і Германіі за развязванне Другой сусветнай вайны нас падштурхоўваюць да своеасаблівага перагляду яе вынікаў. І ў сувязі з гэтым у грамадскасці, вядома ж, узнікае пытанне: што гэта — чарговыя тэрытарыяльныя перадзелы, пераразмеркаванне сфер уплыву? Што за гэтым стаіць? Мы да сваёй незалежнасці, і цэласнасці ішлі доўгія гады і не можам мірыцца з такім падыходам, з такой ацэнкай гісторыі...

На думку палітыка, сёння ўсе працэсы ў Еўропе сведчаць пра тое, што ідзе фактычна перагляд вынікаў Другой сусветнай вайны.

— Хацелася б нагадаць усім гэтым дзеячам ад палітыкі, якія, мусіць, дрэнна ведаюць гісторыю: менавіта з моманту перагляду версальскіх мірных дамоўленасцяў стварылася тая ваенна-палітычная сітуацыя, якая і прывяла да Другой сусветнай. Дык давайце адумаемся і будзем жыць рэаліямі сённяшняга свету, а не выкарыстоўваць смажаныя гістарычныя факты для апраўдання нейкіх сваіх ідэалагічных і палітычных замераў.

Зоя ВАРАНЦОВА.

ПАЦЯРПЕЛА ЖЫТКАВІЦКАЯ «НЯВЕСТА»

У Жыткавічах затрыманы 35-гадовы раней судзімы мінчанін, які сярод белага дня кінуў бутэльку з запальнай сумессю ў прыватную салон-краму «Нявеста», які знаходзіцца ў будынку мясцовай гарадской бібліятэкі. Праведзеная пажарна-тэхнічная экспертыза пацвердзіла факт падпалу. Прычыны ліхадзейскага ўчынку высвятляюць цяпер у мясцовым аддзеле міліцыі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НЕПРАЦУЮЧАГА ЗАТРЫМАЛІ З $300 ТЫСЯЧАМІ...

У Мінску з «авансам» у 300 тысяч долараў ЗША затрыманы мужчына, які падбухторваў да дачы хабару прадстаўніка аднаго з буйных камерцыйных прадпрыемстваў сталіцы.

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» оперупаўнаважаны па асабліва важных справах галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічных злачынствах МУС Вераніка Пасмеццева, з прапановай напачатку «раскашэліцца», каб пасля апынуцца ў выйгрышы, на камерсанта выйшаў непрацуючы жыхар Фаніпаля. Апошні заявіў, што за грошы, якія нібыта прызначаюцца службовым асобам выканаўчай улады, у прадпрыемства з'явіцца рэальная магчымасць перамагчы ў аўкцыёне на права праектавання і будаўніцтва капітальных будынкаў на тэрыторыі сталіцы. Цана ж, якую выставіў за падобную паслугу падбухторшчык, склала пяўмільёна долараў ЗША.

Затрымалі падазронага ў адной са сталічных гасцініц, калі ў яго на руках была частка ад заяўленай ім сумы — 300 тысяч долараў. Падбухторшчык арыштаваны, пракуратурай Фрунзенскага раёна ў дачыненні да яго заведзена крымінальная справа.

ГОРКАЯ РАСПЛАТА...

Чатыры чалавекі загінулі і два пацярпелі пасля таго, як аўтамабіль «Опель», якім кіраваў мужчына без вадзіцельскага пасведчання, перакуліўся на дарозе.

Дарожна-транспартнае здарэнне адбылося паблізу вёскі Лазяны Лідскага раёна. Кіроўца аўтамабіля, між іншым, раней быў судзімы за кіраванне транспартным сродкам у стане ап'янення. Адсутнасць вадзіцельскага пасведчання не спыніла і на гэты раз: у выніку — такія трагічныя наступствы. У гэтай аварыі загінуў сам 28-гадовы кіроўца, яго цесць і швагер, а жонка, малая дачка і цешча, якія ехалі ў злашчасным аўто, былі змешчаны ў бальніцу, дзе жыццё апошняй, на жаль, медыкі не змаглі выратаваць.

Ігар ГРЫШЫН.

ЗАТРЫМАНА ГАНДЛЯРКА ГЕРАІНАМ

Пад покрывам ночы 55-гадовая жыхарка вёскі Рудня Светлагорскага раёна прадала пераапранутым супрацоўнікам міліцыі 5 палімерных пакункаў з рэчывам белага колеру.

Экспертыза пацвердзіла, што парашок з'яўляецца гераінам, яго агульная вага — амаль 2,5 грама. Кантрольная закупка дазволіла затрымаць немаладую жанчыну да суда. Нават калі прысуд па артыкуле за незаконны абарот наркотыкаў будзе мінімальным, на волю яна выйдзе ў глыбока пенсійным узросце.

«ГАРАЧАЕ» ШКЛО

Яшчэ адна крымінальная справа ўзбуджана ў дачыненні да генеральнага дырэктара ААТ «Гомельшкло», які быў затрыманы ў канцы мая супрацоўнікамі КДБ па падазрэнні ў атрыманні хабару. Зараз кіраўніка буйнога прадпрыемства абвінавачваюць у злоўжыванні службовым становішчам.

Як паведамілі ў Камітэце дзяржаўнага кантролю Гомельскай вобласці, новая крымінальная справа ўзбуджана КДБ па выніках праверкі, праведзенай КДК на прадпрыемстве. Выяўлены факты неэфектыўнага выкарыстання сродкаў, накіраваных на рэалізацыю інвестыцыйнага праекта па арганізацыі вытворчасці ліставога паліраванага шкла. Амаль 175 мільёнаў беларускіх рублёў «Гомельшкло» залішне выплаціла прадпрыемству «Рэмкомплекс» — у парушэнне ўмоў дагавораў арэнды будаўнічых машын — не за фактычны час працы, а за час іх знаходжання на аб'екце. Таксама беспадстаўна спісаная дэбіторская запазычанасць украінскіх камерцыйных структураў за адгружанае шкло з-за нерааценкі абавязацельстваў (запазычанасці пакупнікоў за тавар) без правядзення гаспадарчых аперацый. У выніку ў рэспубліку не паступіла экспартная выручка і нанесеная шкода амаль на 288 тысяч долараў ЗША. За дапушчаныя парушэнні ААТ «Гомельшкло» прыцягнутае да адміністрацыйнай адказнасці на агульную суму ў 16,8 мільёна рублёў, на галоўнага энергетыка накладзены штраф у 800 тысяч рублёў, а ў дачыненні да былога кіраўніка прадпрыемства ўзбуджана яшчэ адна крымінальная справа.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЗВЕСТКІ АБ КАМАНДЗІРОЎКАХ ЭСТОНСКІХ ЧЫНОЎНІКАЎ ЗАСАКРЭЦІЛІ НА 75 ГАДОЎ

Дзяржаўная канцылярыя Эстоніі на 75 гадоў засакрэціла загады аб камандзіроўках і адпачынках сваіх чыноўнікаў.

Такім чынам ведамства мае намер абараняць кватэры служачых ад рабаванняў. Паводле меркавання канцылярыі, інфармацыяй аб тым, калі чалавек знаходзіцца ў камандзіроўцы, могуць зацікавіцца кватэрныя зладзеі.

У КАЗАХСТАНЕ ПРАПАНАВАЛІ ПРЫНЯЦЬ ЗАКОН АБ НАЗАРБАЕВЕ

У Казахстане прапанавалі прыняць адмысловы закон («Закон аб лідары нацыі»), прысвечаны прэзідэнту краіны Нурсултану Назарбаеву. З такой ініцыятывай, як паведамляе IA «Kazakhstan Today», выступіў першы намеснік старшыні кіруючай партыі «Нур Атан» Дархан Калятаеў.

Паводле яго словаў, у законе будзе адлюстраваны не толькі канстытуцыйны, але і грамадскі статус прэзідэнта. Апошні Калятаеў ахарактарызаваў наступным чынам: «Кіраўнік нашай дзяржавы — прызнаны лідар краіны, які карыстаецца ўсеагульнай падтрымкай народа». У гэты дакумент, як паведаміў намеснік старшыні «Нур Атан», можа быць уключаная норма аб пажыццёвым прэзідэнцтве Нурсултана Назарбаева.

УКРАІНСКІМ ПАРЛАМЕНТАРЫЯМ УДВАЯ «ЗРЭЖУЦЬ» ЗАРПЛАТЫ

З 1 студзеня 2010 года зарплата дэпутатаў Вярхоўнай Рады будзе паменшаная ў два разы. Гэта прадугледжвае праект дзяржбюджэту Украіны, распрацаваны ўрадам, паведаміў выканаўца абавязкаў міністра фінансаў краіны Ігар Уманскі.

Чыноўнік адзначыў, што, уносячы скарачэнне дэпутацкіх зарплат у бюджэт, кабінет міністраў выконвае рашэнне саміх парламентарыяў, паводле якога выдаткі на ўтрыманне органаў дзяржулады павінны быць мінімізаваныя ў перыяд крызісу.

КІТАЙ АДКАЗАЎ НА ЗАГАРАДЖАЛЬНЫЯ МЕРЫ ЗША

Кітай пачынае антыдэмпінгавае расследаванне ў дачыненні імпарту аўтапрадукцыі і мяса птушкі з ЗША. Міністэрства гандлю КНР мае намер разгледзець скаргі нацыянальных вытворцаў на тое, што амерыканскія курацінa і аўтамабільная прадукцыя прадаюцца на кітайскім рынку па зніжаных цэнах або выйграюць дзякуючы дзяржсубсідыям, перадае АР.

Пры гэтым у заяве кітайскага ведамства адзначаецца, што Кітай па-ранейшаму рашуча процістаіць пратэкцыянізму ў сусветным гандлі. Заява Пекіна — чарговая мера ў адказ у гандлёвай «вайне» Кітая і ЗША. 11 верасня прэзідэнт ЗША Барак Абама ўвёў загараджальныя мыты на імпарт аўтамабільных пакрышак з Кітая, чым выклікаў пратэст афіцыйнага Пекіна.

белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

СООБЩАЕТ, ЧТО 23 СЕНТЯБРЯ 2009 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ

220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

Повестка дня

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 11 сентября 2009 года.

Акционеры банка могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк»: г. Минск, проспект Жукова, 3.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 21 сентября 2009 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 2 октября 2009 года.

Телефоны для справок: 8(017) 250 36 53, 250 60 01.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136
время работы 8.00-22.00 без выходных и праздничных дней;
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) - по тарифам операторов мобильной связи.
www.belapb.by

ОАО «Белагропромбанк». Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 22.07.2009 г. № 2 УНП 100693551.

Мой родны Мінск, ты — сэрца Беларусі!

У святочных мерапрыемствах, прысвечаных Дню горада Мінска, узялі ўдзел больш за 120 тысяч мінчан і гасцей сталіцы.

У розных кутках горада прайшлі канцэрты, кірмашы, выставы, спартыўныя праграмы, творчыя пленэры. Усіх ахвотных парадавалі Свята духавой музыкі, Горад майстроў, святы для дзяцей і моладзі.

Марына БЕГУНКОВА.
Фота аўтара.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 15.09.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 791,00
▼ 1 еўра	4 064,53
1 латвійскі лат	5 791,06
1 літоўскі літ	1 177,14
1 чэшская крона	159,40
1 польскі злоты	964,08
▼ 1 расійскі рубель	90,44
1 украінская грыўня	326,43

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РБ

USD	30,8617
UAH	36,0745
1000 BYR	11,0814
EUR	44,8575

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

КАНТРАФАКТНЫЯ DVD-ДЫСКІ

Буйную партыю кантрафакту — амаль на 191 мільён рублёў — знайшлі і канфіскавалі праваахоўнікі ў Мінску на рынку «Ждановічы».

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, «шэры» тавар належаў тром індывідуальным прадпрымальнікам і двум прыватным гандлёвым унітарным прадпрыемствам. Супрацоўнікі галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі МУС і інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Цэнтральным раёне канфіскавалі ў іх больш за 27 тысяч кантрафактных DVD-дыскаў.

Ігар ГРЫШЫН.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«Італьянскі канцэрн «Фінмеканіка» знойдзе ў Беларусі надзейных партнёраў»

Беларусь зацікаўлена ў развіцці сумесных праектаў з буйным італьянскім капіталам. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час сустрэчы ў Мінску з прэзідэнтам і выканаўчым дырэктарам італьянскага канцэрна «Фінмеканіка» П'ерам Франчэска Гуаргуальіні.

«Калі ў такога буйнога канцэрна, як ваш, ёсць інтарэсы ў Беларусі (а мне ўжо далажылі аб магчымых напрамках узаемадзеяння Беларусі з канцэрнам — і толькі іх пералік заняў амаль старонку), то мы рады вітаць італьянскіх бізнэсменаў у нашай краіне», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«У час нашай сустрэчы са старшынёй урада Італіі Сільвіо Берлусконі мы дамовіліся аб тым, што ён наведае Беларусь, — сказаў Прэзідэнт. — І мне вельмі хацелася б, каб мы былі падрыхтаваны да гэтага візіту». Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што «да гэтага моманту хацелася б мець у наяўнасці калі не канкрэтныя кантракты, то, прынамсі, дакладна вызначаныя напрамкі супрацоўніцтва».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў такіх сустрэчах узнікае пытанне: чаму сустрэча з бізнэсменамі праходзіць на прэзідэнцкім узроўні? Як растлумачыў Аляксандр Лукашэнка, дастатковым аргументам для гэтага будзе пералік тых галін, у якіх працуе канцэрн «Фінмеканіка»: гэта і верталётабудаванне, і самалётабудаванне, і касмічныя тэхналогіі, і ўзбраенне, узоры якога выкарыстоўваюцца ў розных кутках свету, і энергетыка, і транспарт, і інфармацыйнае забеспячэнне сістэм бяспекі, і многае іншае. «Фінмеканіка» мае свае вытворчасці ў 29 дзяржавах свету. У першым паўгоддзі 2009 года выручка фірмы, нягледзячы на сусветны крызіс, у параўнанні з мінулагоднім паказчыкам павялічылася на 32 працэнты.

«Таму для мяне гонар сустрэцца з такімі акуламі сусветнага бізнэсу», — сказаў Прэзідэнт. Пры гэтым ён выказаў упэўненасць, што канцэрн «Фінмеканіка» адыграе дастойную ролю ў развіцці беларуска-італьянскага супрацоўніцтва.

Асаблівасць работы канцэрна ў тым, што «Фінмеканіка» траціць амаль 2 млрд еўра на навукова-даследчыя і доследныя распрацоўкі. «Думаю, у гэтым плане вы зможаце знайсці добрых партнёраў у Беларусі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу П'ер Франчэска Гуаргуальіні адзначыў, што канцэрн «Фінмеканіка» спадзяецца на пашырэнне супрацоўніцтва з Беларуссю. «Мы гатовы весці перагаворы з мэтай вызначэння плённых напрамкаў нашага ўзаемадзеяння», — сказаў кіраўнік канцэрна. «Перакананы, што ўрад Італіі і яго кіраўнік Сільвіо Берлусконі будуць задаволены, калі нам удасца прыйсці да станоўчых вынікаў», — дадаў ён. Лідар канцэрна нагадаў, што італьянскаму ўраду належыць больш за 30 працэнтаў акцый яго прадпрыемства, такім чынам, дзяржава выступае буйнейшым акцыянерам «Фінмеканікі».

Заказы канцэрну паступаюць з усяго свету: каля 20 працэнтаў — з Італіі, 25 працэнтаў — з ЗША і Вялікабрытаніі, а таксама многіх іншых краін свету. П'ер Франчэска Гуаргуальіні адзначыў, што яго прадпрыемства пастаянна імкнецца да пашырэння вытворчасці і робіць стаўку на новыя віды прадукцыі і новыя тэхналогіі. «Фінмеканіка» ўваходзіць у дзясятку вядучых сусветных вытворцаў аэракасмічнай прадукцыі, сістэм абароны і бяспекі, абсталявання для энергетыкі і транспарту. Перспектыўнымі напрамкамі ўзаемадзеяння Беларусі з канцэрнам «Фінмеканіка» могуць стаць праекты сферы тэхналогій, у тым ліку стварэнне інтэграванай інфраструктуры сувязяў і маніторынгу ўздоўж транспартных калідораў № 2 (Берлін — Варшава — Мінск — Масква) і № 9 (басейн Чорнага мора — басейн Балтыйскага мора), стварэнне сістэм спадарожнікавай сувязі і навігацыйных сістэм, а таксама розныя аспекты энергатэхналогій, машынабудавання і іншых галін.

Аляксандр Лукашэнка пацвярджае гатоўнасць да далейшага дыялогу з Расіяй для паглыблення саюзніцкіх адносінаў

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева з нагоды дня нараджэння.

«Уласцівыя Вам якасці таленавітага кіраўніка, сапраўднага патрыёта сваёй Айчыны Вы энергічна накіроўваеце на служэнне Расіі ў імя яе працвітання і павышэння дабрабыту грамадзян», — адзначаецца, у прыватнасці, у віншаванні. Аляксандр Лукашэнка выказаў задавальненне сустрэчай у Сочы ў жніўні гэтага года, якая прайшла ў атмасферы ўзаемнага даверу і разумення, і пацвердзіў гатоўнасць да далейшага дыялогу ў мэтах паглыблення стратэгічных саюзніцкіх адносінаў паміж Беларуссю і Расіяй.

Прэзідэнт Беларусі павіншаваў інфармацыйнае агенцтва «Інтэрфакс»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванне калектыву інфармацыйнага агенцтва «Інтэрфакс» у сувязі з 20-годдзем з дня ўтварэння агенцтва.

«У Беларусі высока цэняць ваша імкненне даць узважаную і ўсебаковую інфармацыю ад дынаміцы развіцця нашай рэспублікі, а таксама канструктыўны погляд на расійска-беларускія інтэграцыйныя ўзаемаадносіны», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы пажадаў калектыву агенцтва і ў далейшым захоўваць высокі ўзровень прафесіяналізму, дух творчага пошуку і стваральнасці.

У Беларусі вызначаны парадак прадастаўлення ўчасткаў ляснога фонду юрыдычным асобам у арэнду і карыстанне

У Беларусі вызначаны парадак прадастаўлення ўчасткаў ляснога фонду юрыдычным асобам у арэнду і (або) карыстанне для ажыццяўлення лесакарыстання. Адпаведнае палажэнне зацвердзіў Прэзідэнт Беларусі ўказам № 444 ад 9 верасня 2009 года.

У адпаведнасці з палажэннем арэндная плата ўстанаўліваецца зыходзячы з кошту лясных рэсурсаў, што перадаюцца ў арэнду, і стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка. Пры гэтым арандатар не вызваляецца ад платы за лесакарыстанне па таксах за лясныя карыстанні. Унесеная арандатарам сума будзе залічвацца на рахунак юрыдычнай асобы, якая вядзе лясную гаспадарку, на тэрыторыі якой знаходзіцца ўчастак ляснога фонду, што перадаецца ў арэнду.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Уладзіміра Співакова

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў мастацкага кіраўніка і галоўнага дырыжора Нацыянальнага філарманічнага аркестра Расіі, народнага артыста СССР Уладзіміра Співакова з 65-годдзем.

«Вы з'яўляецеся адным з самых вялікіх скрыпачоў і дырыжораў сучаснасці, чые неперавыдзены талент, віртуознае майстэрства і тонкі мастацкі густ набылі сусветную славу і прызнанне», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы высока ацаніў добрыя адносіны Уладзіміра Співакова да Беларусі, шчырыя клопаты аб лёсах маладых беларускіх выканаўцаў і няспыннае імкненне сваім мастацтвам умацоўваць дружбу паміж брацкімі народамі. Аляксандр Лукашэнка пажадаў яму невычэрпнай энергіі і творчых сілаў, натхнення, поспехаў, здароўя, шчасця, клопату і любві блізкіх людзей.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Дэпутацкая трыбуна

І НАСТАЎНІК, І МАЛЯР, І Ў КЛАСЕ ГАСПАДАР...

Дэпутаты выступаюць за вызваленне школы ад шматлікіх побытавых нагрузак

З дапамогай Кодэкса аб адукацыі дэпутаты спрабуюць знайсці адказы не толькі на прыватныя пытанні аб тым, што апрануць, ідучы на заняткі, ці па якой шкале выстаўляць адзнакі вучням, але і вырашыць шэраг сістэмных праблем, якія тычацца школы. Сярод іх: прыцягненне педагагічных работнікаў да выканання спраў, якія не адносяцца да іх прафесійнай дзейнасці; памяншэнне колькасці справаздач, якія патрабуюць цяпер ад настаўнікаў розныя арганізацыі, у тым ліку грамадскія; навядзенне парадку з расходаваннем фінансавых сродкаў, што выдзяляюцца з бюджэтаў усіх узроўняў на ўтрыманне будынкаў школ і іншых збудаванняў; арганізацыя харчавання вучняў.

Ужо не навіна, што настаўнікі і кіраўнікі школ і гімназій літаральна не могуць дыхаць ад шквалу папяровых справаздач і інфармацыйных даведак рознага кшталту, якія ім даводзіцца складаць, марнуючы час, такі неабходны для непасрэднай працы з дзецьмі ці для самаадукацыі. Пытанне аб памяншэнні папяровага патоку неаднаразова ставілася ў час сустрэч дэпутатаў беларускага парламента і ўрада, але пасля гэтага колькасць папер не памяншалася, хутчэй наадварот, расла. Міністэрства адукацыі сцвярджае, што ад школ яно патрабуе мінімальную колькасць справаздач. Магчыма, гэта і так, але ж акрамя міністэрства існуюць абласныя і раённыя кіраўніцтвы адукацыі, аховы здароўя, культуры, а таксама ваенкаматы, міліцыя, МНС, БРСМ, спарткамітэты і мноства іншых арганізацый, якія не толькі патрабуюць ад настаўнікаў, але і прадугледжаных у калектыўным дагаворы паміж адміністрацыяй і работнікамі школы, дазваляецца толькі са згоды саміх педагагічных работнікаў і толькі на ўмовах платы ці на іншых прымальных для зацікаўленых бакоў умовах, у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам». У любым выпадку, вопыт Мінска трэба заканадаўча пашыраць на рэгіёны, бо працу настаўніка трэба цаніць усюды. Дарэчы, зараз даволі складаная сітуацыя з вучэбнай нагрузкай настаўнікаў, яна зменшылася з-за змяненняў вучэбных планаў і змяншэння колькасці школьнікаў. **Таму калі не праз Кодэкс, то праз ініцыяванне пастаноў урада мы зноў будзем вяртацца да пытання аб паніжэнай колькасці гадзін на стаўку пры захаванні яе грашовага эквіваленту і магчымасці выхаду на пенсію, не дасягнуўшы пенсійнага ўзросту (50 і 55 гадоў для жанчын і мужчын адпаведна).**

У парламенцкай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе абмяркоўваюцца таксама пытанні, якія тычацца матэрыяльнага забеспячэння школ і часткова звязанага з ім павышэння заробку педагогаў. Быццам бы і грошай з году ў год выдзяляюць школам з павелічэннем, школы сталі самі зарабляць, ды і школ, вучняў і настаўнікаў становіцца менш, а вось колькасць скаргаў ад сістэмы адукацыі на недахоп фінансаў не змяншаецца. Як выйсці з гэтага зачараванага кола?.. Пасля доўгіх спрэчак дэпутаты профільнай камісіі прыйшлі да высновы аб неабходнасці... перараз мяркавання абавязкаў паміж школьнай адміністрацыяй і іншымі арганізацыямі, якія маюць дачыненне да дзейнасці школы, а таксама звязанага з ім некаторага змянення кірункаў фінансавых патокаў. Гутарка ідзе вось аб чым. Зараз дырэктары школ і гімназій, акрамя якасці навучання і выхавання сваіх падапечных, нясуць адказнасць практычна і за ўсё астатняе: асвятленне класных пакояў, ацяпленне, посуд на кухні, якасць прыгатаванай там ежы, бягучы і капітальны рамонт, супрацьпажарную бяспеку і г.д. І за самую маленькую неадпаведнасць будынка школы ці яе абсталявання вызначаным нормам і стандартам на дырэктара ці яго наменікаў накладаюць спагнанні ў выглядзе штрафу. Напрыклад, за тое, што не працуе пажарны паведамляльнік; талерка ў сталоўцы трэснула; перагарэла лямпачка на калідоры; трава ля агароджы высокая, у класе на падлозе абгортка ад марожанага і г.д. Прычым штрафы не маленькія: 175, 350, 710 тысяч і вышэйшыя. Каб заплаціць такія сумы, не хапае часам месячнага заробку, асабліва маладога педагога. Таму, каб дапамагчы пакаранаму, педагогі добраахвотна-прымусова «скідаюцца» па 5-10 тысяч. Часам дзеля гэтай жа мэты выпісваецца каму-небудзь з іх фіктыўная прэмія ці матэрыяльная дапамога ва ўрон тым, хто сапраўды павінен быць падтрыманы ў цяжкую хвіліну ці за напружаную і эфектыўную працу. Зразумела, што калі б такіх штрафаў не было, то і сапраўдны сярэдні заробак педагогаў стаў бы крыху вышэйшым. Але як пазбегнуць гэтых штрафаў?.. Бо дырэктар і яго намеснікі — звычайныя людзі, абсалютна за ўсім не дагледзяць. Ды і не могуць яны быць прафесіяналамі ва ўсіх галінах і кірунках — ад электрыфікацыі, ацяплення, каналізацыі, будаўніцтва да тэхналогій прыгатавання ежы (не будзем забываць і пра тое, што ўсё больш жанчын пачынаюць кіраваць школамі).

Выйсце дэпутаты бачаць у тым, каб перагледзець функцыі людзей, якія працуюць у школах. Так, напярэдадні новага навучальнага года ствараюцца кантрольныя камісіі, у склад якіх уваходзяць прадстаўнікі выканкамаў, МНС, санітарна-эпідэміялагічных службаў, камунгасаўцы і інш. Кіраўнікі школ выступаюць у ролі тых, хто абараняецца. Дырэктарам тых школ, якія вытрымалі праверку, выдаюць пашпарты гатоўнасці, а тых, якія яе не прайшлі, караюць за выяўленыя недахопы. **На погляд дэпутатаў, працу па падрыхтоўцы школ да новага навучальнага года трэба істотна змяніць, як кажуць, паставіць з галавы на ногі. Яе павінны весці менавіта такія арганізацыі, прадстаўнікамі якіх і з'яўляюцца сённяшнія канталёры, а прымаюць выкананыя работы — кіраўнікі адукацыі, дырэктары школ, педагогі, бацькі і вучні.** Тая ж служба МНС, у якой працуюць адукаваныя спецыялісты, павінна кваліфікавана выканаць размяшчэнне вогнетушыцеляў і паведамляльнікаў, пры неабходнасці замяніць састарэлыя сродкі тушэння, а таксама забяспечваць на працягу навучальнага года бяспеку жыцця і здароўя дзяцей у частцы, якая адносіцца да МНС, і несці за гэта адказнасць. Прадпрыемства грамадскага харчавання, у сваю чаргу, павінна, арандуючы плошчы ў школе, абнавіць посуд, забяспечыць працу тэхналагічных прыбораў і абсталявання (да ведама, прадпрыемства грамадскага харчавання вызначае 40-працэнтную надбаўку да кошту ежы, што прадаецца дзецям), несці адказнасць за якасць прыгатаванай ежы. ЖЭСы ў буйных гарадах і арганізацыі ЖКГ на перыферыі і без настаўнікаў поўнасцю справяцца з прамыўкай, рамонтам і замеранай сістэм ацяплення, каналізацыі, падфарбоўкай фасадаў, ды і траву на прылеглай тэрыторыі пакосяць. Зразумела, што гэтым структурам для вызначаных мэтаў трэба напрамую планаваць у бюджэце сродкі, памяншаючы на гэтыя ж сумы асігнаванні ва ўстановы адукацыі. І нараць дырэктара павінны не гэтыя службы. Наадварот, дырэктар павінен прад'яўляць да іх прэтэнзіі. Загарэлася (не давядзі Божа!) нешта на кухні з-за непаладак абсталявання — адказваюць і нясуць пакаранне служба МНС і прадпрыемства грамадскага харчавання. Трэснула труба ацяплення, холадна ў класах — «на дыван» да старшыні выканкама павінен выклікацца кіраўнік камунальнай службы. Кормяць дзяцей пратэрмінаванымі прадуктамі, адмаўляюцца дзеці есці гарэлыя катлеты ці селядцы «з душком» — штраф не дырэктару, а начальніку санстанцыі, дырэктару прадпрыемства грамадскага харчавання і загадчыку школьнай сталовай.

Што можа даць такая навацыя?.. Па-першае, дазволіць пазбегнуць нерацыянальных трат бюджэтных сродкаў. Не будуць ЖКГ, прадпрыемства грамадскага харчавання, іншыя арганізацыі, якія маюць дачыненне да школы, пры тых жа патрабаваннях да аб'ёмаў і якасці работ завышаць іх кошт ці рабіць прыпіскі, ды і перарабляць па некалькі разоў работы з-за дрэннай іх якасці будзе ім эканамічна нявыгадна. А паспрабуюць — дык для гэтага ёсць кантрольныя органы, той жа камітэт дзяржкантролю. Дарэчы, мы з гонарам кажам, што ў рамонце школ прымалі ўдзел настаўнікі і вучні, але неяк не звяртаем увагі на тое, што, напрыклад, у нявопытнага ў фарбаванні сцен настаўніка ці вучня старэйшых класаў расход фарбы значна вышэйшы, а якасць фарбавання значна ніжэйшая, чым у маляра-прафесіянала. Дык што выгадней бюджэту і краіне?.. Па-другое, знікне частка пасрэднікаў паміж выканаўцамі работ і школамі ў выглядзе так званых гасгруп, што патрабуюць грошай для свайго ўтрымання. А яшчэ ліквідуецца размеркаванне сродкаў на ўтрыманне школ па прынцыпе «кумаўства». Бо спецыялізаваныя арганізацыі будуць адказваць за знешні выгляд і ўнутраны стан усіх школ, а не толькі абраных. Але галоўнае — дырэктар школы, вызваліўшыся ад ролі «выбівалы» і «даставалы», не будзе знаходзіцца пад пастаянным прэсам атрымання штрафу, а атрымае нарэшце магчымасць засяродзіцца на асноўнай працы — нацэльваць калектыў на забеспячэнне высокай якасці навучальна-выхаваўчага працэсу, пра які так многа гавораць у апошні час.

Замацаваць такія падыходы ў заканадаўстве таксама можна шляхам уключэння новых нормаў у Кодэкс аб адукацыі. Напрыклад, так: «Арганізацыя падрыхтоўкі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі да новага навучальнага года і падтрымання іх у належным стане ажыццяўляецца органамі мясцовай выканаўчай улады. Непасрэднае выкананне неабходных работ праводзіцца спецыялізаванымі арганізацыямі (як правіла, дзяржаўнымі) за кошт залічэння на іх рахунак сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, а таксама іншых сродкаў, якія не забаронены дзейным заканадаўствам».

Заўважу, што гэтыя прапановы не з'яўляюцца нейкімі летуценнямі дэпутатаў, а ўзніклі ў выніку аналізу выказванняў непасрэдных удзельнікаў адукацыйнага працэсу — школьных настаўнікаў і кіраўнікоў школ. Таму не трэба ўспрымаць іх, як кажуць, «у штыкі», лепш пастарацца пабачыць рацыянальнае зерне. І яшчэ: мы ніколькі не прэтэндуем на «ісціну ў апошняй інстанцыі», таму будзем удзячныя ўсім людзям, якія жадаюць паляпшэння стану сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь, за прапановы якіх прымальных варыянтаў вырашэння адзначаных, а таксама іншых праблем, якія ўзніклі ў школе. Тым больш, што праца над праектам Кодэкса аб адукацыі будзе весціся яшчэ доўга.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе, Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Хто што сказаў учора...

Уладзімір ЗДАНОВІЧ,
старшыня Камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў — **пра тое, што школьнікам трэба вярнуць ільготны праезд у грамадскім транспарце:**

— Хоць эканамічная сітуацыя ў краіне не самая лепшая, мы ўсё ж павінны вярнуцца да пытання льготнага праезду школьнікаў у грамадскім транспарце. Гэта сваты абавязак краіны — забяспечыць усім дзецям роўны доступ да атрымання адукацыі, незалежна ад таго, у якой сям'і нарадзілася дзіця — у беднай ці багатай. Зараз не ўсе бацькі могуць знайсці ў сваім бюджэце грошы, каб аплачваць праезд дзіцяці на заняткі ў секцыі ці гурткі, асабліва калі гэта трэба рабіць часта. Адсутнасць ільгот на праезд школьнікаў, на мой погляд, супярэчыць забеспячэнню роўных магчымасцяў у атрыманні пазашкольнай адукацыі.

Валянціна КАЧАН,
намеснік міністра аховы здароўя — галоўны санітарны ўрач Беларусі — **пра тое, як засцерагчыся ад грыпу, які наступае:**

— Паводле звестак Нацыянальнага цэнтра па грыпе, у гэты эпідсезон у нас будуць цыркуляваць добра знаёмыя нам вірус грыпу А (H3N2) і вірус грыпу В, чакаецца таксама ўдзел віруса высокапатагеннага грыпу А (H1N1). Сёння на тэрыторыі Беларусі цыркулююць вірусы парагрыпу, адэнавірусы, рэспіраторна-сінцытыяльны вірус, вірусы грыпу А і В. Найбольш эфектыўны сродак прафілактыкі грыпу — імунізацыя супрацьгрыпознымі сродкамі. Паколькі кожны год склад вакцын мяняецца і імунітэт захоўваецца да 9 — 12 месяцаў, неабходна штогод рабіць прышчэпкі супраць грыпу. Вакцынацыя не заўсёды можа прадухіліць захворванне на грып, але прынамсі дапаможа перанесці хваробу ў лёгкай форме і прадухіліць развіццё ўскладненняў пасля перанесенага грыпу.

Анатоль БАЙДАЧНЫ,
беларускі футбольны трэнер — **пра тое, чаму ён больш не хоча кіраваць беларускай футбольнай зборнай:**

— Я туды не вярнуся нават пад пагрозай расстрэлу. Не з-за крыўды нават. Ты прыходзіш, траціш гады на тое, каб штосьці стварыць, і яно ствараецца, рухаецца! А пасля перастаеш камусьці падабацца — і цябе спрабуюць выкінуць. Логіка простая: ён стварыў, а мы цяпер без яго даробім. Мяне ўразіла, калі адзін з кіраўнікоў нашай футбольнай федэрацыі, які ўсяго паўгода прапрацаваў на сваёй пасадзе, сказаў мне: «Вы лічыце, што я не разбіраюся ў футболе?» На што я яму з горкай усмешкай адказаў: «Гэта я, напэўна, не разбіраюся, я ў футболе больш за 30 гадоў, і кожны раз адкрываю для сябе штосьці новае». Народ верыў той, «маёй» зборнай, для запаўнення трыбун не трэба было запрашаць вайскоўцаў. Але я цяпер шкадую аб тым, што марна патраціў сілы і здароўе...

Свае сцягі з'явіліся ў Ліды і Слоніма

Свае геральдычныя сімвалы з'явіліся ў населеных пунктаў Гродзенскай вобласці: сцягі ў горада Ліды, Слоніма і Слонімскага раёна, герб і сцяг у вёскі Цырын Карэліцкага раёна. Гэтыя афіцыйныя геральдычныя сімвалы сваім указам заснаваў Прэзідэнт Беларусі, а таксама зацвердзіў адпаведныя палажэнні, апісанні і выявы. Такое рашэнне прынята ў мэтах адраджэння гісторыка-геральдычных традыцый Гродзенскай вобласці.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Грашовыя даходы насельніцтва за студзень-ліпень узраслі на 3,5 працэнта

Паводле аператыўных звестак, у студзені-ліпені гэтага года рэальныя грашовыя даходы насельніцтва Беларусі ўзраслі на 3,5 працэнта ў параўнанні са студзенем-ліпенем 2008 года. Аб гэтым паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2009 год прадугледжаны рост грашовых даходаў насельніцтва ў рэальным выражэнні на 14-15 працэнтаў.

БЕЛТА.

Спорт-тайм

У БЕЛАРУСАК — СЕРАБРО І БРОНЗА

13 верасня ў Японіі фіналамі ў групавых практыкаваннях завяршыўся чэмпіянат свету па мастацкай гімнастыцы. У заключны дзень беларуская каманда ў складзе Алесі Бабушкінай, Дзіны Гайцюкевіч, Марыны Ганчаровай, Настассі Іваньковай, Ксеніі Санковіч і Аліны Туміловіч заваявалі два медалі.

У групавых практыкаваннях з трыма стужкамі і дзвюма скакалкамі беларускі заваявалі серабро. Перамагла каманда Італіі, трэцяй стала зборная Расіі. У групавых практыкаваннях з пяццю абручамі беларуская каманда заваявала бронзу. Лепшымі тут сталі расіянкі, серабро ў актыве італьянак. Раней, у мнагабор'і (5 абручоў, 3 стужкі і 2 скакалкі) беларуская каманда стала сярэбраным прызёрам, уступіўшы дружыне Італіі. У індывідуальных практыкаваннях на рахунку беларускіх мастачак дзве ўзнагароды. У камандным першынстве зборная Беларусі (Любоў Чаркашына, Святлана Рудалава, Меліта Станюта, Аляксандра Осіпава) заняла 2-е месца. Яшчэ адзін медаль Беларусі прынесла Меліта Станюта, якая выйграла бронзу ў практыкаванні з абручом.

ФАВАРЫТЫ Ў ТОНУСЕ

У матчах 18-га тура чэмпіянату Беларусі ўсе фаварыты атрымалі перамогі. БАТЭ ў Брэсце прайграваў па ходу сустрэчы 0:1, але ў другім тайме не толькі зраўнаваў рэзультат, але забіў пераможны мяч. Мінскае «Дынама», якое ідзе другім, на сваім полі перайграла гасцей з гродзенскага «Нёмана» — 2:0. Вынікі астатніх сустрэч: «Днепр» — «Нафтан» — 2:1, «Гомель» — «Шахцёр» — 2:1, «Смаргонь» — «Віцебск» — 0:3, «Мінск» — «Граніт» — 1:0, «Тарпеда» — МТЗ-РІПА — 2:1. Становішча ў турнірнай табліцы: БАТЭ — 41 ачко, «Дынама» (Мінск) — 31, «Днепр» — 29, «Нафтан», «Тарпеда» і «Шахцёр» — па 28, «Нёман» — 27, «Гомель» — 25, «Мінск» — 23, «Віцебск» і «Дынама» (Брэст) — па 22, «Граніт» — 20, МТЗ-РІПА — 16, «Смаргонь» — 8.

АСТАПЧУК І МІХНЕВІЧ СТАЛІ ПРЫЗЁРАМІ ФІНАЛУ ІААФ

Беларускія штурхальніцы ядра Надзея Астапчук і Наталля Міхневіч сталі прызёрамі Сусветнага фіналу ІААФ, які завяршыўся 13 верасня ў грэчаскім горадзе Салонікі. Надзея Астапчук адправіла снарад на 19,56 м і выйграла сярэбраны медаль. Наталля Міхневіч заваявала бронзу з вынікам 19,27 м. Выйграла турнір у штурханні ядра Валеры Вілі з Новай Зеландыі. Яна ўстанавіла рэкорд спаборніцтваў 21,07 м.

«ДЫНАМА» ПАЧАЛО З ПАРАЖЭННЯ

Хакеісты мінскага «Дынама» з паражэння стартавалі 12 верасня ў чэмпіянаце КХЛ, уступіўшы ў Санкт-Пецярбургу мясцоваму клубу СКА з лікам 0:2. З-за траўмы ў Санкт-Пецярбург не паехаў варатар мінскага «Дынама» Андрэй Мезін.

КУЛЕБІН — МАЦНЕЙШЫ

Беларускія байцы муай тай святкавалі перамогу на турніры ў Мінску, які адбыўся 12 верасня. За неафіцыйны тытул «чэмпіёна шасці кантынентаў» у вагавой катэгорыі 67 кг змагаліся восем мацнейшых байцоў шасці частак свету. Перамогу святкаваў чатырнаццацікратны чэмпіён свету беларус Андрэй Кулебін.

Наш суайчыннік адолеў па ачках прадстаўніка Еўропы Мікалая Талочку (Украіна) і паўднёваамерыканца Леанарда Мантэйра (Бразілія), а затым у фінале — байца з Азіі Напарата Кеаткхамторна (Тайланд). У турніры таксама ўдзельнічалі паўночнаамерыканец Вільям Рамера (Канада), прадстаўнік Аўстраліі і Акеаніі Курт Фіналсан (Аўстралія), афрыканец Ахмед Саадзі (Туніс) і расіянін Ігар Пятроў, які атрымаў Wild Card.

Абзац

◢ У Плешчаніцах (Лагойскі раён) хворы з нажом напаў на санітарку. Інцыдэнт адбыўся раніцай. 54-гадовы мясцовы жыхар, які знаходзіўся на стацыянарным лячэнні ў інфекцыйным аддзяленні, узламаў дзверы ў тэрапеўтычнае аддзяленне і без прычыны ўдарыў нажом у грудзі 38-гадовую санітарку. Ён затрыманы і дастаўлены ў Рэспубліканскую псіхіятрычную бальніцу «Навінкі». Распачата крымінальная справа.

◢ **Міні-завод па вытворчасці фальсіфікаванай гарэлкі знішчаны ў Гродзенскім раёне. Падпольную вытворчасць алкагольнай прадукцыі ў вёсцы Каробчыцы наладзіў жыхар Гродна. Ён выпускаў «левую» гарэлку, выкарыстоўваючы вядомыя маркі айчынных і замежных вытворцаў. За яго дзейнасцю міліцыя сачыла больш за месяц, а машыну з падробленай гарэлкай затрымалі супрацоўнікі ДАІ. У салоне было знойдзена 50 бутэлек гарэлкі розных найменняў ёмістасцю па 0,7 л кожная. Пасля гэтага была ліквідаваная вытворчасць у в. Каробчыцы. Канфіскавана прадукцыі і прыстасаванняў для яе выпуску на суму амаль Br13 млн. Выявілася, што летась мужчына прыцягваўся да адказнасці за аналагічныя супрацьпраўныя дзеянні, аднак высноў не зрабіў.**

◢ Аршанскі пенсіянер загінуў у выніку двайнога наезду машын. ДТЗ адбылося ў цёмны час сутак каля вёскі Юрцава Аршанскага раёна. Жыхар Украіны на аўтамабілі «Мерседэс» збіў 68-гадовага пенсіянера, які не быў абазначаны святлоадбівальным элементам. Следам на мужчыну наехала аўтамашына «Ман» якой кіраваў жыхар Брэста. У выніку жыхар Аршанскага раёна загінуў. Вядзецца следства.

◢ **Бішкекскі міжраённы суд задаволіў іск грамадскага фонду «Ліга абаронцаў правоў дзіцяці» да ўрада рэспублікі аб прызнанні таго, што пастанова кабінета міністраў аб увядзенні школьнай формы для навучэнцаў 1-4 класаў супярэчыць заканадаўству. Як высветлілася, продаж школьнай формы праводзіцца нягледзячы на тое, што санітарная служба Кіргізіі не давала заключэння аб яе адпаведнасці санітарна-эпідэміялагічным патрабаванням. Суд палічыў довады праваахоўнікаў аб'ектыўнымі і адмяніў рэалізацыю пастановы. У Кіргізіі ў большасці сем'яў — па некалькі дзяцей, і многія бацькі скардзяцца, што проста не ў стане купіць усім ім форму. Акрамя гэтага, яна часта нізкай якасці і шыецца з сінтэтычных матэрыялаў.**

Поўны абзац

◢ У Жытоміры з выпадку 1125-гадовага юбілею на цэнтральнай плошчы горада гараджанам прэзентавалі «Рог дастатку». Ён складаўся з 1125 абаранкаў, булачак і рагалікаў агульнай вагой у 35 кг. Даўжыня гэтага кулінарнага шэдэўра склала 3 метры, у дыяметры ён быў 80 см, на яго выраб спатрэбілася 25 кг мукі, больш за 100 яек, 25 кг цукру і 5 кг сухога малака. Падчас урачыстай прэзентацыі да яго нечакана хаатычна кінуліся з розных бакоў безнагляднымі дзеці і пачалі расхопліваць пачастунак. Гэта сапсавала настрой разгубленых уладаў, якія хацелі прадэманстраваць дастатак у асобна ўзятым святочным горадзе.

◢ **Хуткасны цягнік TGV праехаў над 19-гадовым французам, які заснуў на чыгуначных пуцях. Малады чалавек не пацярпеў. Машыніст заўважыў чалавека, што ляжаў на жывоце паміж рэйкамі, і паспрабаваў спыніць цягнік, што рухаўся на вялікай хуткасці, аднак не паспеў. Пасля прыпынку ён пабег да чалавека, каб праверыць, ці жывы ён, і знайшоў яго ў стане сну. Выратавальнікі, што прыбылі на месца здарэння, паспрабавалі разбудзіць юнака, аднак іх спробы поспеху не мелі. Незадачлівага француза даставілі ў бальніцу. У яго кішэні знайшлі запрашальнік на музычны фестываль, што закончыўся раніцай. Відаць, малады чалавек проста не адчуў розніцы паміж музыкай і лязгатам цягніка.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

АФІЦЭР ІДЗЕ Ў БОЙ ЗА РАДЗІМУ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Міністр абароны таксама падкрэсліў, што зараз навучальныя ўстановы краіны даюць магчымасць рыхтаваць спецыялістаў для ўзброеных сілаў практычна на 100 %, прычым ёсць шмат заявак і з іншых дзяржаў:

— У мяне няма праблемы, як загрузіць факультэты, у мяне праблема — як каго не пакрыўдзіць і размясціць, — кажа Леанід Мальцаў. — Гэта ж не проста — узяць на вучобу кагосьці: ён павінен і быць размешчаны ў нармальных умовах, і якасць адукацыі павінна быць высокай, інакш мы дыскрэдытуем свае і сістэму адукацыі, і краіну.

Цікава, што спецыяльна вучыцца ў Беларусь нашы вайскоўцы нікога не запрашаюць:

— У мяне зараз быў міністр абароны Туркменіі, ён хацеў, каб ужо з 1 верасня яго грамадзяне вучыліся на нашых факультэтах. Я сказаў, што гэта немагчыма, бо трэба падпісаць спачатку дамову аб узаемнай абароне дзяржсакрэтаў, таму рэальна навучанне магчымае толькі з наступнага 1 верасня. У нас вучацца венесуэльцы, казахстанцы, нават лётчыкі з Нігерыі вучацца на авіяцыйным факультэце. Шмат просяцца яшчэ, таму мы не ініцыюем, мне дай Божа размясціць тых, хто просіцца, — кажа міністр абароны.

Звярнуў увагу Леанід Мальцаў яшчэ раз на якасць навучання:

— Павінна быць вельмі высокая якасць. Бо той жа Казахстан вучыць сваіх салдат і ў Турцыі, і ў ЗША, і ў еўрапейскіх краінах. Потым яны вернуцца служыць, і ніхто не скажа, што ён сам дрэнна вучыўся, скажа, што яго дрэнна навучылі. Акрамя непасрэдна навучання, мы робім экскурсіі па рэспубліцы — у Полацк, Брэст, Мірскі і Нясвіжскі замкі, у нашы тэатры. Ёсць цэлая праграма дзеля таго, каб яны паехалі адсюль не толькі спецыялістамі, а ўсё жыццё яшчэ казалі: самы светлы час — калі я вучыўся ў Беларусі. Ну каб хоць бы сталі нашымі сябрамі, я ўжо пра іншае не кажу.

У 90-я гады мінулага стагоддзя вяліся спрэчкі — ці патрэбная Беларусі свая сістэма вайсковай адукацыі. І, як лічыць Леанід Мальцаў, тады быў зроблены правільны выбар:

— У 1994 годзе, калі ўзнялі пытанне наконт таго, ці патрэбна Вайсковая акадэмія, такія дэбаты былі. І цалкам сур'ёзна шмат хто даводзіў, што яна непатрэбная. І асноўным аргументам было тое, што мы свае кадры можам падрыхтаваць і за мяжой, у Расіі, напрыклад. На шчасце, пер

«КАБ ПЛАДЗІЛА, КАБ РАДЗІЛА, КАБ СВЯТА ПА ЗЯМЛІ ХАДЗІЛА»

Міншчына пацвердзіла статус галоўнай жытніцы краіны

Мінская вобласць сёлета атрымала самы важкі хлебны каравай. Ва ўсіх катэгорыях гаспадарак у цэнтральным рэгіёне сабрана больш чым 2,2 мільёна тон збожжа — практычна чвэрць агульнага паказчыка Беларусі.

Ужо другі год запар Міншчына перасягае двухмільённую мяжу намалотаў. Напэўна, у хлебаробаў вобласці ёсць свае сакрэты вялікага ўраджаю? Даведацца пра асобныя з іх удалося падчас абласнога фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2009», які адбыўся ў Любані.

Любаншчына для правядзення свята была выбрана, безумоўна ж, зусім невыпадкова. Сёлета тут упершыню перасягнуты 100-тысячны намалот збожжа. Гэта сапраўдны рэкорд, заўважыў **старшыня Любанскага райвыканкама Васіль АКУЛІЧ**. Любаншчына правамерна ўвайшла ў лік «статысячнікаў» (разам з Валожынскім, Капыльскім, Мінскім, Нясвіжскім Слуцкім і Салігорскім раёнамі).

— Калі быць больш дакладнымі, то агульны валавы намалот у нас склаў 105 тысяч тон, а сярэдняя ўраджайнасць — 35,7 цэнтнера з гектара, — заўважыў Васіль Акуліч. — 32 камбайнеры намалацілі падчас жніва больш чым тысячу тон збожжа, восем экіпажаў — больш чым 1,5 тысячы Віктар Марцаў і Іван Лазоўскі з прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Таль-агра» атрымалі звыш 2 тысяч тон. Пра такія вынікі яшчэ нядаўна можна было хіба толькі марыць.

Значная колькасць сельскагаспадарчых палеткаў Любанскага раёна — меліяраваныя землі. Пра цяжкую працу падчас асушэння балот узгадвае Янка Купала ў сваёй вядомай паэме «Над ракой Арэсай». Але ж, напэўна, такія ўжо тут людзі — яны не прывыклі скарацца перад цяжкасцямі. Нездарма ж Любаншчына ўзгадавала 18 Герояў Сацыялістычнай Працы.

На цэнтральнай плошчы адбылася знамянальная падзея — у сцяну райвыканкама закладзена памятная капсула са збожжам рэкорднага ўраджаю і пасланнем да нашчадкаў. На гэтым месцы ўсталююць адпаведную шыльду. Такім чынам гаспадары сёлетніх абласных «Дажынак» рыгожа адзначылі сваю працоўную перамогу.

Што да самога свята, то пра яго нагадвалі ўжо па дарозе да Любані вялікія саламяныя фігуры ў нацыянальных строях. А на Случыне, каля вёскі Гацук, разгарнуўся самы сапраўдны падворак, дзе «ўладарыла» цэлая сям'я — бацька, маці, бабуля і двое дачок. Каля маляўнічага месца спынялася шмат машын, людзі імкнуліся сфатаграфаваць, пагутарыць з гаспадарамі незвычайнага «прыдарожнага аб'екта». У сталіцы абласных «Дажынак» таксама разгарнуліся самыя разнастайныя падворкі — рыбака, ганчара, лесніка, разьбяра, ткачыхі і шмат іншых. Была выстава жывёл, сельскагаспадарчай тэхнікі, духмяных каравяжаў з усіх раёнаў вобласці.

Удалося пабачыць самабытную мясцовую традыцыю — «аблівіны». Па цэнтральнай «стрыт» рухалася незвычайная працэсія: на возе, упрыгожаным кветкамі і снапамі, хлопцы цягнулі цэбар з вадою, якой без шкадавання пырскаюцца наўкола. Я таксама трапіў «пад раздачу». Што ж такое адбываецца? Работнікі раённага аддзела культуры з усмешкай патлумачылі: «Гэта жніўныя песні дзяўчаты спяваюць, а хлопцы вадой усіх аблліваюць. Каб пладзіла, каб радзіла, каб свята па зямлі хадзіла». Кажуць, што дождж — спрадвечны сімвал будучага добрага ўраджаю, своеасаблівы спрыяльны «прагноз» налета.

— Сёння галоўнае — працаваць над удасканальваннем тэхналогіі, каб менш залежаць ад капрызаў надвор'я, — заўважае **старшыня Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага аблвыканкама Іван ШМАТКО**.

Многія прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу могуць сабе гэта дазволіць.

— За апошнія чатыры гады ў сельскую гаспадарку Міншчыны інвеставана 16 трыльёнаў рублёў, — адзначыў **старшыня Мінскага аблвыканкама Леанід КРУПЕЦ**. — Абуладкавана 197 аграгарадкоў з усёй належнай інфраструктурай, узведзена больш чым 6,9 тысячы дамоў, адкрыта 56 новых і капітальна адрамантавана 506 комплексных прыёмных пунктаў, адноўлена работа 157 крамаў, якія дагэтуль былі зачыненыя.

На Міншчыне былі рэфармаваныя 140 гаспадарак, якія раней літаральна балансавалі на мяжы банкруцтва. Дзякуючы інвестарам, для іх адраджэння ўдалося прыцягнуць значныя сродкі — каля 2,4 трыльёна рублёў. У выніку былыя «аўтсайдары» не толькі выйшлі з заняпаду, але і сталі лідарамі ў сваіх раёнах. Летась гаспадаркі вобласці рэалізавалі мінскім перапрацоўчым прадпрыемствам 320 тысяч тон малака і 31 тысячу тон мяса. Штогод восенню для забеспячэння патрэб сталічных жыхароў закладваецца на захоўванне 21 тысячу тон бульбы і 23 тысячы тон садавіны і гародніны. Зразумела, што значную частку гэтай прадукцыі пастаўляюць зноў-такі сельгаспрадпрыемствы Мінскай вобласці. На «Дажынках» рэгіён атрымаў ад сталіцы прыстойны падарунак — 16 трактароў вытворчасці Мінскага трактарнага завода.

Вядома ж, заслужаныя ўзнагароды на свяце ўручылі раёнам-пераможцам (акрамя Любанскага лепшым прызнаны і Вілейскі). Любаншчыну ўзнагародзілі Ганаровым сцягам Мінскага аблвыканкама (зразумела, тут будуць імкнуцца да таго, каб і налета ўтрымаць гэты сцяг — усё ж такі ён пераходны). Сярод сельгасарганізацый лепшымі прызнаныя аграфірма «Фалічы» Стараварожскага, СВК «Атраднае-агра» Любанскага, СВК «Гарняк» Салігорскага і СВК «Лань-Нясвіж» Нясвіжскага раёнаў. Лепшыя камбайнеры — сямейны экіпаж бацькі і сына Сяргея і Максіма Мальцаў з прыватнага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Смалявічы-Сузон» Смалявіцкага раёна, Аляксандр Пяткевіч і Віктар Загалавец з СВК «Чырванадворцы» з Салігоршчыны. Таксама сярод пераможцаў — камбайнеры Дзмітрый і Сяргей Шчоткі з СВК «Запольскі» Чэрвеньскага раёна.

Дарэчы, гэты працавіты экіпаж атрымаў на галоўнай сцэне абласнога свята хлебаробаў і «звяздоўскія» падарункі. Таксама былі адзначаны СВК «Чырвоная змена імя Кузьмы Шаплыкі» з Любанскага раёна і Вячаслаў Смаляк з сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Сітнікі», што на Пухавіччыне. Дарэчы, Вячаслаў Сцяпанавіч сёлета перавёз 1,5 тысячы тон збожжа — амаль удвая больш, чым летась. Цяпер дастаўляе з палеткаў бульбу. Без працы сядзець не даводзіцца, бо трэба забяспечваць вялікую сям'ю — Смалякі выхоўваюць дзевяць дзяцей! Старэйшаму сыну 22 гады, а малодшай дачушцы споўніўся годзік. Вячаслаў Смаляк заўважае, што заробкаў у гаспадарцы разам з дзяржаўнай дапамогай на дзяцей хапае, каб нядрэнна жыць.

Сёлетні каравай не толькі багаты, але і смачны.

— Працавітыя людзі здольныя забяспечыць дабрабыт сваёй сям'і, — перакананы Леанід Крупец. — Для гэтага цяпер створаны ўсе ўмовы на вытворчасці. Але тут ёсць пэўныя рэзервы, адна з асноўных задач — аптымізацыя затрат, змяншэнне сабекошту прадукцыі. Неабходна арыентавацца на лепшых вытворцаў, сярод якіх флагманам па-ранейшаму застаецца агракамбінат «Сноў». Мяркуйце самі: тут у разліку на кожнага работніка аб'ём вытворчасці малака дастатковы, каб забяспечыць патрэбы 44 чалавек, мяса — 92, а збожжа — 4 тысяч чалавек. Гучыць ашаламляльна, праўда? Гэта той узровень, да якога ўсім неабходна імкнуцца.

Як заўважыў **намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль ПАЎЛОЎСКІ**, агульны намалот па рэспубліцы ўжо дасягнуў 9 мільёнаў тон. Таму да рэспубліканскіх «Дажынак», якія адбудуцца праз некалькі дзён, аграпрамысловы комплекс падышоў з добрымі здабыткамі. Якіх вынікаў удалося дасягнуць? З такім пытаннем я звярнуўся да **намесніка прэм'ер-міністра Івана БАМБІЗЫ**, які завітаў на свята ў Любань.

— Вынікі развіцця аграпрамысловага комплексу відавочныя, — заўважыў Іван Міхайлавіч. — Адбываецца пераўтварэнне глыбінкі — і раённых цэнтраў, і вёсак. Сельская гаспадарка ўжо зусім не тая, як яшчэ пяць гадоў таму. Створана належная вытворчая база, адбываецца мадэрнізацыя. І гэты працэс працягваецца — штогод закупляецца да 1,5 тысячы збожжаўборачных агрэгатаў, шэраг іншай тэхнікі.

— Ці не мяркуецца згортваць аб'ёмы дзяржаўнай дапамогі АПК?

— Мы не маем намеру змяншаць аб'ёмы дзяржпадтрымкі. Але дапамога павінна быць адраснай, каб павысіць эфектыўнасць гаспадарання. Цяпер найбольш актуальны кірунак — тэхнічнае пераўзбраенне прадпрыемстваў перапрацоўчай прамысловасці, якія неабходна вывесці на ўзровень найноўшых тэхналогій вытворчасці. Мы навучыліся вырабляць прадукцыю, але ж яе неабходна і эфектыўна рэалізаваць. Не толькі на ўнутраным, але і на знешніх рынках.

На цэнтральнай вуліцы гаспадарыла саламяная феерыя.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота аўтара.
Мінск—Любань—Мінск.

НА РЫНКУ «РАЗНАТРАЎЕ»

Настаў перыяд, калі на рынку можна ўбачыць усё, чым багатая восень.

Але калі памідораў многа, то гуркі ўжо сыходзяць — іх час прайшоў. На садавіну не будзем звяртаць увагі — яе хапае. Прадаюць і грыбы, але баравікоў няма, а найперш лісічкі, чорныя грузды ды скрыпіцы. Нават летнія апенькі зніклі, хоць, магчыма, дзесьці асартымент грыбоў больш шырокі.

Стаяць жанчыны і з ягадамі — брусніцамі ды журавінамі. Толькі вось сёлета на апошнія закупачная цана невысокая — усяго 1800 рублёў, а летась была ўтрая вышэйшай. Такі перапад псіхалагічна цяжка ўспрыняць. Ды і тыя ж прадпрымальнікі быццам бы згаварыліся са спажыўкааперацыяй — цану на журавіны не падымаюць. Летась можна было людзям выбіраць. Калі ў гэтага прадпрымальніка цана нізкая, то без праблем прадавалі другому ці везлі ў суседні раён. Цяпер у Ганцавіцкім, Пінскім і Івацэвіцкім раёнах кошт аднолькавы. Вось і вязуць некаторыя палешукі журавіны на рынак у Баранавічы. Але і там ахвотнікаў да балотнай ягады мала.

Жанчына за 15 кг ядро прасіла 30 тысяч рублёў, але мала хто цікавіўся ягадамі.

У рынка свае законы, ды і сезон на сезон не прыпадае. Знізіўся попыт на ягады за мяжой, і палешукі гэты спад адчулі на сямейным бюджэце. Сёння, каб зарабіць леташнія грошы, неабходна назбіраць журавінаў утрая больш. А такое каму пад сілу?!

А якая сітуацыя з бульбай? Даводзілася чуць, што сёлета яе кошт не будзе ніжэйшы за 1000 руб./ кг, бо для бульбы год быў няўдалым.

На кірмашы «Палескім» бульбу прадавалі толькі з адной аўтамашыны і каля яе выцягнулася чарга: цана была 800 руб./кг.

Калі пачнуцца восеньскія кірмашы, то кошт бульбы можа яшчэ знізіцца, хоць 800 рублёў — цана прымальная для пакупнікоў і прадаўцоў.

Магчыма, мне здалося, але рынак быў даволі вялым. Нядзеля, добрае надвор'е, а людзей малавата. Крызіс таму віной ці нарыхтоўка запасаў гародніны на зіму яшчэ наперадзе?

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Крымінал, здарэнні

ВЫКРАДУ РАЗАМ З ПАРКАНАМ

Металічны гараж жыхара Мазыра невядомы выкраў непасрэдна з тэрыторыі гаражнага масіва. А вось у вёсцы Парэчча Акцябрскага раёна «зрабілі ногі» бетонамяшалцы, якая стаяла ля будоўлі дома і належала МПМК-109. У Жлобінскім філіяле Гомельскага агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры, паведамляе прэс-служба УУС Гомельскага аблвыканкама, з ахоўнага будынка пакуль невядомым чынам зніклі два лазерныя прыборы дальнамера, якія ацэньваюцца ў суму больш чым 4 мільёны рублёў. Пенсіянерцы з Хойнікаў такія буйнамаштабныя крадзяжы не па сілах, таму 71-гадовая бабуля, раней не судзімая, проста «спёрла» веласіпед, які стаяў ля агароджы яго гаспадыні. На чым і папалася.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НЕ ВЫРАТАВАЛІ,

бо траўма галавы ў пацярпелай, якую прывезлі у Ляхавіцкую бальніцу, была цяжкай. 38-гадовая жыхарка в. Малое Гарадзішча праляжала ў бальніцы з 29 жніўня па 9 верасня і памерла ад кровазліцця ў мозг.

Жанчыну падчас скандалу моцна збіў п'яны муж. Яго затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СУД НАД ГВАЛТАЎНІКОМ

У Гомелі пачаўся суд над серыйным гвалтаўніком, які да таго быў судзімы сем разоў. Свае злачынствы 35-гадовы мужчына ўчыніў да 2005 года, пакуль яго не пасадзілі ў турму на 13 гадоў за тры даказаныя раней згвалтаванні. Цяпер яго абвінавачваюць яшчэ ў 8 аналагічных злачынствах. Самае цікавае, што сам ён гаворыць пра 15 сваіх ахвяраў. Аднак 7 з іх пакуль не знойдзены.

Грамадзянін, які падпрацоўваў прыватным возніцтвам на асабістых «Жыгулях», нападаў на маладых жанчын вечарам у школьных дварах, ля чыгуначных пуцей, сярод гаражоў, выбіраў пры гэтым самыя цёмныя завулкі Гомеля. Калі на ахвярах былі каштоўныя ўпрыгажэнні, ён іх забіраў. Пасля здзекаў над асобай хутка знікаў на сваёй машыне.

Калі на злачынцу вывелі экспертныя даследаванні, ён адразу прызнаўся. Па заключэнні псіхіятрычнай экспертызы, у мужчыны змешанае расстройства асобы, што не перашкаджае яму быць за кратамі. Калі ў судзе будуць даказаны ўсе выпадкі згвалтаванняў, грамадзяніну пагражае значна большы тэрмін, чым той, па якім ён сядзіць цяпер.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЛЕПШЫ ПАМОЧНІК КАЛГАСНІКА — КАМП'ЮТАРНЫ КАНТРОЛЬ!

Сучасны праблемны калгас у беларускай глыбінцы выходзіць з крызісу дзякуючы так званым «высокім тэхналогіям». Як гэта ўжо паспяхова робіцца, на свае вочы ўбачыў уласны карэспандэнт «Звязды». І вельмі падзівіўся і першым вынікам, і найбліжэйшым планам.

Трэба выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі, каб поўнасцю кантраляваць вытворчы працэс у сельскагаспадарчым прадпрыемстве — па такім прынцыпе працуе **дырэктар сельскагаспадарчага прадпрыемства «Дубраўка» Ушацкага раёна Багдан Тадэвушавіч ЮРГЕНС**. Менавіта ён самы першы ў раёне, а мо і ва ўсёй Віцебскай вобласці для ўліку паліва выкарыстоўвае сучасныя прыборы кантролю. Дарэчы, беларускай вытворчасці.

— Галоўнае ў вёсцы пры вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі — строгі ўлік і дысцыпліна, — расказвае Багдан ЮРГЕНС. — Я ўзначаліў праблемную гаспадарку крыху больш як год таму. Прыняў гаспадарку з мільярднымі даўгамі. Адразу зразумеў, што ў першую чаргу трэба павышаць дысцыпліну і пільна сачыць за тым, як выкарыстоўваюцца гаруча-змазачныя матэрыялы. За п'янства звольніў 15 чалавек, за прагулы 12. Цяпер у нас працуюць 165 чалавек.

Наконт спецыяльных прыбораў уліку расходу паліва. Іх у нас ужо сем установлена: на пяці трактарах і двух грузавых машынах. Разам з усталяваннем кожны з гэтых прыбораў мінскай вытворчасці абышоўся ў 1,4 мільёна рублёў. Ці многа гэта — пытаецце? За суткі адзін трактар можа «з'есці» 650—700 літраў паліва. Памнажаем на кошт кожнага літра (больш як дзве тысячы рублёў). Раней, і гэта не сакрэт, для тых, хто працуе на сельскагаспадарчай тэхніцы, можна было без праблем «зэканоміць», «пакінуць сабе» літраў 50 паліва на энергана-сычанай тэхніцы. І гэта ў дзень! Цяпер дзякуючы разумным прыборам, гэта немагчыма.

— І як успрынялі тыя ж трактарысты «кантрольнае «ноу-хау»?

— Шчыра кажучы, не вельмі ім спадабалася мая ідэя. Некаторыя адразу пагражалі звольніцца. Акрамя таго, што прыбор можа кантраляваць расход паліва, ён дае малюнак пра тое, як эфектыўна працуе тэхніка. Колькі праехала ўхаластую і гэтак далей. Дзякуючы, як вы кажаце «ноу-хау», мы здолелі перагледзець нормы выпрацоўкі механізатараў. І, адкрыю тайну — тыя ж перадавікі на сучаснай тэхніцы замежнай вытворчасці, як высветлілася, не заўсёды дапрацоўвалі па поўнай.

— А было ўжо так, што паказанні прыбораў былі сур'ёзнымі аргументамі ў спрэчных пытаннях? Доказам таго, што паліва скралі?

— Так. Вось, глядзіце. Адзін наш механізатар усё не пагаджаўся з абвінавачваннямі наконт таго, што ён скраў паліва. Выклікалі мы са сталіцы прадстаўнікоў прадпрыемства, якое выпрабляе і ўсталёўвае прыборы. Яны знялі ўсе адпаведныя замеры. Апошнія былі пададзеныя ў якасці доказаў у суд. Між іншым, усе фіксаваныя звесткі прыбор можа памятаць год. І, калі хочаш, можна зняць паказанні, занесці ў памяць камп'ютара.

Цяпер я прабіваю ідэю мабільнага кантролю.

— Гэта як жа?

— Мы ж жывём у век сучасных тэхналогій. Прыязджалі да мяне прадстаўнікі Віцебскага філіяла кампаніі МТС і асабіста **Уладзіслаў АНДРЭЙЧАНКА — кіраўнік філіяла**. Сказалі, былі б грошы, створым вам неабходную сістэму. Яна дазволіць не выходзячы са службовага кабінета сачыць за тым, колькі паліва патрачана. Можна і дакладна ведаць, колькі збожжа прынялі ў механізатара. Раздачу кармоў на ферме можна кантраляваць. Электронныя вагі можна аснасціць сім-карткай. Малакаправоды пераабсталяваць, магчыма паставіць лічыльнікі з сім-карткай і сачыць, калі пачынаецца дойка, колькі малака надаілі. Ахову аб'ектаў можна ажыццяўляць.

На жаль, пакуль мы лічымся стратным прадпрыемствам, не можам самі набыць усё неабходнае і тым больш самастойна аплаціць установку мабільнай сістэмы кантролю. Спадзяюся, што ў якасці ўзорнага эксперыменту кіраўнікі МТС маглі б пайсці насустрач і поўнасцю аснасціць асобна ўзятую гаспадарку сучаснай сістэмай мабільнага кантролю.

І без сучасных тэхналогій таксама кантралюем выдачу таго ж паліва. Вось вам на памяць «штэпсель» мой (дырэктар нечакана пакінуў «штамп» у журналісцкім нататніку). Такія ж ёсць у іншых адказных асобаў. Навошта? А раней маглі б сказаць — не мой подпіс, маўляў, на паперы па выдачы паліва. Цяпер так ужо не атрымаецца. Вядома ж, не падабаецца гэта вадзіцелям. Скардзяцца: не «пуцявы ліст», а нейкі «набор» штампаў.

І бухгалтэрыю камп'ютарызуем. Для гэтага спецыяльна запрасіў у госці свайго даўняга сябра — **Уладзіміра Уладзіміравіча ЖУКОЎСКАГА**. Ён — фізік-матэматык, эканаміст. Сам стварае камп'ютарныя праграмы. Раней жыў у адной з усходніх рэспублік былога СССР. З сям'ёй пераехаў у Беларусь, цяпер навапалачанін. Калі поўнасцю ўкараніцца тое, што ён прыдумаў, спатрэбіцца менш бухгалтараў. А цяпер у нас чатыры бухгалтары (было шэсць) і два эканамісты. Таксама — эканомія.

Той, хто хоча працаваць, адразу на сваёй заработнай плаце адчуў розніцу. Напрыклад, цяпер пастух зарабляе у нас... Колькі б вы думалі? Прыкладна адзін мільён рублёў. Кажаце, многа. А ўсё таму, што працуе за дваіх. За сябе і таго гультая, якога мы звольнілі.

— Цікавіцеся, як можна ўплываць на гультаёў? Адразу, калі ў першы раз сустрэўся з калектывам, я заявіў, што не буду цярпець выпівох і гультаёў, — працягвае адказваць на мае пытанні дырэктар. — Увёў такую практыку: спецыяліст гаспадаркі павінен быў стаць «паручыцелем» праблемнага работніка. Дасць слова, што яго «падапечны» будзе выпраўляцца, паглядзім, дадзім апошняму шанц...

Той, хто хоча працаваць, адразу на сваёй заработнай плаце адчуў розніцу. Напрыклад, цяпер у летні час пастух зарабляе у нас... Колькі б вы думалі? Прыкладна адзін мільён рублёў. Кажаце, многа. А ўсё таму, што працуе за дваіх. За сябе і таго гультая, якога мы звольнілі. А даяркі, для параўнання, зарабляюць 750 тысяч. Гэта пакуль, бо мы і надоі павысілі, і кароў дойных у нас цяпер на 110 больш.

Мае першыя памочнікі — фельчар і ўчастковы інспектар міліцыі. **Загадчыца фельчарскага акушэрскага пункта Таісія Аляксандраўна КРУПСКАЯ** працуе ў медыцыне ўжо больш за 30 гадоў. Абслугоўвае не адну вёску, плюс яшчэ ў сацыяльным доме працуе. І ўявіце сабе, яшчэ кожную раніцу старанна правярае, ці ў цвярозым стане пачынаюць нашы работнікі працу? І яшчэ скажу больш — пакуль што наш паважаны медык жыве ў іншай вёсцы. І штодня муж прывозіць яе на працу на ўласнай машыне.

А яшчэ вельмі дапамагае **ўчастковы Аляксандр Васільевіч ЯРШОЎ**. Ён абслугоўвае тэрыторыю двух сельсаветаў. Цяпер у нас будзе працаваць новы ўчастковы і толькі на нашай тэрыторыі — Вяркудскага сельсавета. Дом яму дадзім, як і фельчару. А Яршову мы вельмі ўдзячныя за яго дапамогу. Разам з ім нечакана можам прыехаць у поле, рэйды праводзім.

Вельмі ўдзячныя нашы людзі **Полацкаму камбінату хлебапрадуктаў, якім кіруе Васіль Кузьміч ХАМЯНОК**, — камбікармы даюць у крэдыт, аказваюць іншую дапамогу. І шэфы ў нас добрыя — **Полацкая гарадская друкарня імя Скарыны (дырэктар Уладзімір Казіміравіч ПЕТРАШКЕВІЧ)** — транспарт выдзяляе, людзей на дапамогу.

Яшчэ вельмі дапамагаюць святары. Прыходзяць да людзей, размаўляюць, агітуюць пазбаўляцца ад шкодных звычак. Нават спецыяльныя малебны праводзяць. Царкву ў Дубраўцы будуем. Купал паабяцаў зрабіць вельмі добры зваршчык-дачнік, які перыядычна жыве ў нашых мясцінах. А раней ён жа крыжы з металу зрабіў па маёй просьбе. Яны стаяць у Вяркудах, Дубраўцы, Загор'і і Стаях. Ужо сёлета вельмі пастараемся, каб царква адчынілася.

Вельмі здзівіў мяне ініцыятыўны дырэктар, калі расказаў, што іх гаспадарка мае адпаведную ліцэнзію на міжнародныя перавозкі, дрэваапрацоўку і выраб зрубаў.

Трэба зарабляць на ўсім тым, што дазваляецца. Чаму б, напрыклад, улічваючы, што шмат лазы ў нашых мясцінах, не рабіць вырабы з яе?

Для міжнародных перавозак ёсць у нас грузавая машына. Не новая, але не падвядзе ў дарозе. Мы і бізнэсам па арганізацыі адпачынку займацца спрабуем.

— Гэта як жа?

— Дачы цяпер ужо выходзяць з моды. Ну, пагадзіцеся, не кожны можа ўтрымліваць дом, даглядаць яго. А мы можам прапанаваць цікавы адпачынак. Прыязджае сям'я, напрыклад, на машыне. Аўто на стаянку. А вы, калі ласка, у грыбы, ягады. Шмат іх у нашых лясах. А пейзажы якія — прыгажосць! У доміку пераначаваць можна будзе. Ёсць на чым папячы, ёсць дзе захаваць тыя ж лясныя дары. Паехалі дамоў, каб зноў потым вярнуцца.

І краму з кавярняй ля дарогі адчынім абавязкова. Старшыня сельскага савета ўсё жартуе, што крама будзе мець назву «У Багдана».

— Вы ўжо прабачце за пытанне «рабром» — многія з прадстаўнікоў новага пакалення ўсё адно паедуць у горад па «лепшую» долю. Як вы іх «утрымліваеце»?

— А чаму толькі моладзь? Бывае, і ўжо спрактыкаваны механізатар, напрыклад, калі што не так, і скажа: перайду ў іншую гаспадарку, у горад падамся. Трэба і пахваліць лішні раз, знайсці да кожнага індывідуальны падыход.

Чаму вы лічыце, што моладзь паедзе? Цяпер і надбаўкі выплачваюць розныя, і пасады добрыя атрымаць пасля вучобы можна адразу. А жыллё прасторнае з усімі выгодамі! Колькі давядзецца папрацаваць у вялікім горадзе, каб атрымаць, зарабіць сваё ўласнае жыллё. Мы, вось, адкрылі новы сельскі Дом культуры. Пастараемся зрабіць у тых жа Вяркудах многае, каб тут было ўтульна.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота аўтара.
Ушацкі раён — Віцебск.

Магілёўская кругасветка

Аматары гісторыі і падарожжаў распрацоўваюць турыстычны маршрут вакол Магілёва.

Пакуль беларускі веласіпедыст Васіль Кірыенка штурмуе горныя вяршыні на іспанскай шматдзённай гонцы «Вуэльта», яго магілёўскія балельшчыкі вырашылі зрабіць веласіпедны турыстычны маршрут пад кодавай назвай «Магілёўская кругасветка».

12 верасня з дзясятак магілёўцаў сабраліся, каб апрабаваць веладарожку, якая вядзе ад Ратушы ў цэнтры горада да Буйніцкага поля, дзе месцяцца мемарыяльны комплекс, цікавы заасад і прыгожыя месцы для адпачынку.

— Дарожку зрабілі, калі ў паветры лунала ідэя зрабіць Магілёў веласіпедным горадам, спартыўным і экалагічным, але сёння ехаць па ёй складана, — прызнаўся **кіраўнік клуба «Чароўны ўспамін» Сяргей КУЛЯГІН**. — Яна паўсцёртая, і няма з'ездаў з новых бардзюраў. Але мы праехалі за 4 гадзіны болей за 30 кіламетраў, аб'ехалі палову раколіцаў Магілёва, і праз некалькі тыдняў мяркуем замкнуць кола. Мы хочам да вясны наступнага года стварыць маршрут, прысвечаны 65-годдзю Перамогі.

Поўны маршрут складзе каля 70 кіламетраў. З адпачынкамі і экскурсіямі такая нагрузка даступная і непрафесіяналу ў веласіпедным спорце. Напрыклад, абед і катанне на конях можна арганізаваць у аграсядзібе Ігара Ісаева ў вёсцы Гаі, пасядзець у цяньку і напіцца смачнай вады — каля капліцы на Палыкавіцкай крыніцы, а на Буйніцкім полі на свае вочы ўбачыць савецкую ваенную тэхніку і ўнікальны нямецкі танк, які пасля вайны выцягнулі з балота, а ў нашы дні спрабавалі скрасці і прадаць за вельмі вялікія грошы.

Ілона ІВАНОВА.

Рыштаванні Бацькаўшчыны



Да замка вядзе брукаваная дарога.

Згадзіцеся, не кожны з нас і не кожны дзень мае магчымасць бачыць перад сабою краявід пяцісотгадовай даўніны. Менавіта пяцьсот гадоў таму ўпершыню ўзгадваўся Мазырскі замак — тады на месцы драўлянага дзяцінца мазырчане пачалі ўзводзіць замак з палацам, вежамі, гаспадарчымі пабудовамі, умацаваннямі. Высіўся ён на стромкім беразе, і стагоддзі, як птушкі над ракой, ляцелі над яго магутнымі сценамі. Гэтыя сцены неаднойчы нішчыліся захопнікамі, але гараджане адбудоўвалі іх зноў і зноў...

Сёння Мазырскі замак адноўлены як унікальная экспазіцыя з ландшафтнай зонай і архітэктурна-планіровачнай забудовай. Ён прыцягвае турыстаў, тут адпачываюць гараджане, адсюль далёка бачны сучасны горад.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

Марына БУТКОЎСКАЯ працуе ў замку наглядчыцай, а ў час тэатралізаваных паказаў ператвараецца ў князёўну.

Крочым разам праз стагоддзі



Такія вежы гараджане ўзводзілі для абароны.

Старшы навуковы супрацоўнік Аляксандр АДАСЬКА выдатна ўжыўся ў вобраз сярэднявечнага гаспадара гэтых мясцінаў, але творчая кансультацыя з галоўным спецыялістам аддзела культуры Мазырскага райвыканкама Аляксандрам БАБРОМ ніколі не перашкодзіць.

«ТРЭБА ЎМЕЦЬ ПАДАЦЬ І ПАДЫМАЦЦА. А ПОТЫМ ТРЫМАЦЦА НА ЎЗРОЎНІ»,

— лічыць новы старшыня Саюза палякаў Беларусі Станіслаў СЯМАШКА

Чатыры гады, што мінулі пасля папярэдняга з'езда СПБ, былі, бадай, самымі складанымі ў жыцці гэтага грамадскага аб'яднання. Аднак зместкі пра быццам яго заняпад, непрацаздольнасці і бесперспектыўнасці, што распаўсюджваюцца апанентамі легітымнага саюза, не адпавядаюць рэчаіснасці і няхай застануцца на іх сумленні. У гэтым пераконвае VII з'езд СПБ, які адбыўся 12 верасня ў Гродне.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Трэба падкрэсліць, што падрыхтоўчая кампанія да з'езда праводзілася ў строгай адпаведнасці са статутам аб'яднання, каб потым не было ніякіх «зачэпак» з боку нядобразычліўцаў. У выніку мандатная камісія, якая даволі доўга правярала паўнамоцтвы 143 дэлегатаў, ніякіх парушэнняў не выявіла. Усе пратаколы справаздачна-выбарчых сходаў і канферэнцый, што адбыліся ў рамках падрыхтоўкі да з'езда ў розных рэгіёнах Беларусі, сапраўдныя, кворум ёсць. І, такім чынам, усе рашэнні з'езда цалкам легітымныя.

Старшыня СПБ Іосіф Лучнік у сваёй справаздачы адзначыў, што саюз адчувае дзейсную падтрымку ад беларускіх органаў улады ўсіх узроўняў. Пра гэта сведчыць і той факт, што пабываць на з'ездзе палічылі неабходным **дэпутаты парламента, кіраўнікі Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, міністэрстваў адукацыі, культуры, Гродзенскага абласнога і гарадскога выканаўчых камітэтаў. Прыехалі на з'езд і прадстаўнікі іншых нацыянальных аб'яднанняў Беларусі.**

— Людзі ў нашай краіне жывуць у згодзе, супрацоўніцтве. Так было ў Беларусі стагоддзямі, так застаецца і сёння дзякуючы той дзяржаўнай палітыцы, якая праводзіцца ў дачыненні да нацыянальных меншасцяў, — зазначае **міністр культуры Павел ЛАТУШКА.** — Адпаведная падтрымка з боку дзяржавы, у тым ліку Міністэрства культуры, заўсёды была і будзе на перспектыву.

Каля 500 чалавек цяпер навучаюцца ў польскамоўных школах у Гродне і ў Ваўкавыску. Сёлета адчынілася новая сярэдняя школа ў мікраёне Фолюш абласнога цэнтра і паступіла 215 заяў ад ахвотных вывучаць польскую мову. Прычым такая магчымасць ёсць не толькі ў школах — адпаведныя гурткі, напрыклад, на Гродзеншчыне створаны ў 21 дашкольнай установе, дзе сёння займаюцца 365 дзяцей. Калектывам мастацкай самадзейнасці дапамагаюць у забеспячэнні інструментамі, канцэртнымі касцюмамі, транспартам, каб даехаць на імпрэзу, кіраўнікі шэрагу польскіх ансамбляў уваходзяць у штат аддзелаў культуры і атрымліваюць зарплату.

Да ведама тых, хто абвінавачвае СПБ у бяздзейнасці. У традыцыйным фестывалі культуры і танца «Паланэз» у Слоніме (ініцыятар і арганізатар — старшыня раённага аддзела саюза Леанарда Раўкоўская) сёлета ўдзельнічала каля 600 артыстаў! Дні польскай культуры адбыліся ў апошнія гады ў Браславе, Баранавічах, Стоўбцах, Валожыне, Васілішках, Нясвіжы, Маладзечне... А яшчэ — свята польскай паэзіі ў Воранаве, конкурс «Знаўца польскай арфаграфіі», сустрэчы, прысвечаныя памяці Адама Міцкевіча, Элізы Ажэшкі, кірмаш «Казюкі», у якім сёлета ўдзельнічалі 82 майстры народнай творчасці з розных рэгіёнаў краіны (пры СПБ зарэгістраваны аддзел народных умельцаў) і, несумненна, Усебеларускі фестываль нацыянальных культур. А колькі талентаў з Беларусі, Літвы і Польшчы збірае кожны год свята «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў»!

Усё гэта — рэальныя справы, якія нельга не ўбачыць. Павінна толькі быць жаданне бачыць. І хіба ж не крыўдна, што штучны, на думку Іосіфа Лучніка, канфлікт, які быў справакаваны групай былых членаў саюза, трывае, а з боку ўладных структур суседняй краіны працягваецца памылковая палітыка наконт быццам прыціску палякаў у Беларусі. Больш за тое, беларускіх грамадзян польскай нацыянальнасці некаторыя дзеячы, па сутнасці, падзялілі на палякаў «правільных» і «няправільных». Апошнім не выдаюць візы на ўезд у Польшчу, быццам нейкім зламыснікам, якія парушылі польскія законы. І гэта — як папярджанне іншым: маўляў, не бярыце з іх прыклад, бо таксама не атрымаеце візу і карту паляка. Элементам палітыкі пэўным чынам становяцца нават дзеці, якія вучацца пад патранатам легітымнага СПБ — іх ужо не запрашаюць на адпачынак у Польшчу.

І тым не менш галоўным на з'ездзе было не апеляванне да тых ці іншых структур і асобных дзеячаў, а развагі пра тое, як палепшыць працу арганізацыі, канкрэтныя просьбы і прапановы ў гэтым кірунку ў адрас дзяржаўных органаў Беларусі, у прыватнасці, што датычыцца выпуску польскамоўных падручнікаў і тэлевізійных праграм на польскай мове.

Вось меркаванні некаторых дэлегатаў з'езда:

Віктар БОГДАН, дырэктар Дома палякаў у г. Шчучыне, старшыня раённага аддзела СПБ:

— Веру ў тое, што гэты канфлікт, які распалены не намі, а, як я кажу, групкай людзей, будзе вырашаны ў найбліжэйшы час. Так больш працягвацца не можа, сорамна не толькі для палякаў, якія жывуць на беларускай зямлі, — перад усім светам. У мяне ёсць лісты ад палякаў з іншых краін і яны пытаюцца: «Што ж такое? Як дапусцілі да таго, каб з'явіліся такія нягоды?»

Хачу прывесці прыклад. У нас у Шчучыне адна дарога вядзе, з аднаго боку, у царкву, а з іншага — у касцёл. І ніколі не ўзнікала пытання, чаму ты пайшоў у царкву, а я ў касцёл. Заўсёды мы жылі і будзем жыць надалей ў міры і згодзе.

Што датычыцца падзелу на палякаў добрых і дрэнных... Калі мы ў нечым вінаватыя, то хацелася б пачуць ад польскіх уладаў: у чым? Што мы парушылі, якія законы? Каго абразілі? Мы — законапаслухмяныя грамадзяне Рэспублікі Беларусь, жывём і працуем згодна з законамі нашай краіны.

— Ці можа, на ваш погляд, змяніцца стаўленне да саюза з боку польскіх уладаў?

— Можа. Гэта будзе залежаць ад дзейнасці новага кіраўніцтва арганізацыі і ўсіх нас.

— А ці магчыма паразумення з людзьмі, якія, так бы мовіць, на другім баку барыкадаў?

— Мы запрашалі іх на пасяджэнні Галоўнага савета, але ніхто не з'яўляўся. Толькі дасылалі некалькі аўтобусаў з людзьмі, якія, мяркуючы па іх паводзінах, наогул не маюць ніякага дачынення да Саюза палякаў — крычалі, свісталі, стукалі ў акно, кідалі недакуркі, агрызкі. Хоць бы раз за чатыры гады нехта з гэтай групы прыйшоў, адчыніў дзверы і сказаў: «Віктар Іванавіч, у нас ёсць настаўнік, які будзе весці польскую мову». Я толькі вітаў бы. Але гэта ім не патрэбна. І з гэтай групай знайсці паразуменне, лічу, ужо немагчыма, паколькі яны столькі вылілі бруду не толькі на нас, палякаў, але і на нашу краіну, што павінны каяцца, каяцца і яшчэ раз каяцца.

Дзмітрый КАРОЛЬ, старшыня спартыўнага клуба «Баторый» пры СПБ:

— Самае галоўнае, з-за чаго супрацьлеглы бок ніколі не сядзе за «круглы стол», гэта грошы. Ніхто не будзе дзяліцца «кармушкай». Вось асноўнае, што хаваецца за прыгожымі фразамі. Пасля папярэдняга з'езда, калі ў іх не засталося аргументаў, нас залічылі да «лукашэнкаўцаў». Цяпер кажуць адваротнае, быццам яны ніколі не змешвалі палітыку з дзейнасцю СПБ.

У іх была ідэя пакінуць клуб «Баторый» пад сваім крылом, але мы на гэта не пайшлі. Мабыць, па гэтай прычыне з 2005 года я «з'яўляюся небяспечным для польскай дзяржавы» і мне забаронены ўезд у Польшчу. Чыняцца перашкоды і ўсяму клубу. Напрыклад, сёлета Сусветныя гульні сярод палякаў з замежжа былі ў Торуні. Я спецыяльна патэлефанаваў кардынатару Адаму Бекішу, якога даўно ведаю. Ён сказаў, што не займаецца арганізацыяй спаборніцтваў, а толькі збірае заяўкі, і даў адрас інтэрнэт-сайта арганізатараў. Знаёмлюся і што атрымліваецца? Менавіта пан Бекіш сярод трох чалавек, якія падпісалі пагадненне з мэрыяй Торуні аб правядзенні гэтых гульняў. Пра што ж тады можна казаць? Патэлефанавалі ў Торунь. Спачатку арганізатары былі за нас, як кажуць, абедзвюма рукамі, нават абяцалі адмяніць для клуба стартавы ўзнос. І раптам, калі з імі, мабыць, нехта папрацаваў, пазіцыя рэзка мяняецца: маўляў, прабачце, але ўсе месцы для пражывання ўжо занятыя, рассяліць вас нідзе не зможам. Не паехалі... Хоць нашы людзі хацелі ехаць нават за свае грошы.

Некалькі гадоў таму, калі польская арганізацыя, якая займаецца палякамі ў замежжы, даведалася пра намер нашага клуба ўжо па даўняй традыцыі прыехаць на лыжны марафон, яго дырэктару Юліяну Гваздоўскаму тут жа абрэзалі фінансаванне. Ён быў у шоку. Усё адно, кажа, прыязджайце, я вас прафінансую з асабістага фонду. Але мы не паехалі, каб яму не пашкодзіць.

Леанарда РАЎКОЎСКАЯ, старшыня Слонімскага раённага аддзела СПБ:

— З'езд прайшоў вельмі арганізавана, усё было канкрэтна, без балагану. І галасаванне прайшло дэмакратычна: былі і «за», і «супраць», і «ўстрымаўся». Усе свае задачы з'езд выканаў: выбраны новы старшыня, кіруючыя органы саюза. Цяпер галоўная задача ў тым, каб як мага больш аб'яднаць вакол нас людзей. Бо калі не здолеем згуртавацца вакол нашай ідэі, то будзе дрэнна. А будзем аб'яднаныя ў адну сілу — тады многае зможам зрабіць. Спадзяюся, што так і будзе.

...Новы **старшыня СПБ Станіслаў СЯМАШКА** нарадзіўся ў 1952 годзе на Гродзеншчыне, у Шчучынскім раёне. Цяпер жыве і працуе ў Гродне, займаецца гасцінічным і будаўнічым бізнэсам. Яго пазіцыя — не «ляжы на печы» ў чаканні, што нехта табе ўсё на сподачку паднясе, а працуй і зарабляй. І не шкодзь сваёй дзяржаве, падтрымлівай кіраўніцтва сваёй краіны, не ўлазячы ў палітыку. Нідзе і ніколі, кажа, не сустракаўся з тым, каб хтосьці мяняў да мяне стаўленне, калі даведваўся, што я паляк. І перажыў сапраўдны шок, калі яму стала вядома, што групе членаў СПБ забаронены ўезд у Польшчу: «Быццам адны палякі заказалі ў кайданы іншых палякаў».

На прэс-канферэнцыі пасля з'езда Станіслаў Сямашка паведаміў, што гэтыя і іншыя пытанні ён паспрабуе абмеркаваць на перамовах з польскім бокам. Пры гэтым фінансавая падтрымка з боку Польшчы грамадскаму аб'яднанню не патрэбна.

— Мая пазіцыя: ніколі грошай не прасіць. Бо менавіта гэтае «Дайце нам грошай» губіць і зневажае саюз, — лічыць Станіслаў Сямашка. — Трэба прасіць: «Дайце магчымасць зарабіць грошы». Сёння ідзе насустрач улада і магчымасці неабмежаваныя. Таму саюз павінен весці і гаспадарчую дзейнасць, якая будзе пакрываць затратную частку на развіццё культурнага і іншых кірункаў працы нашай арганізацыі. Я хачу даказаць, што гэты саюз можа быць прыкладам і ў нашай дзяржаве, і ў свеце. Але для таго, каб набрась сілу і аўтарытэт, трэба ўмець падаць і падымацца. А потым трымацца на ўзроўні.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

КРЫЖОВЫ ШЛЯХ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ЎЗ'ЯДНАННЯ

...Чалавека чамусьці заўсёды прываблівае мінулае. Прычым кожнае пакаленне спрабуе знайсці там нешта новае і, як вынік, перапісаць гісторыю на свой лад. Прыкладна так атрымліваецца і са складанымі і супярэчлівымі падзеямі 1939 года. Мінула ўжо 70 гадоў, а тагачаснае жыццё добра б калі проста выклікала цікавасць, дык яно яшчэ і ўплывае на нашу з вамі рэчаіснасць. Адны нешта просяць прызнаць, другія кажуць, што вы нічога не разумееце, гэта вы павінны прызнаць, а трэція маюць прэтэнзіі як да першых, так і да другіх... Вось так чытаеш выказванні палітыкаў пра далёкі 1939 год і думаеш — а мо гэтыя звароты да мінулых падзей і розныя палітычныя заявы і не такія бяскрыўдныя? Пра 1939 год, пра ўз'яднанне Заходняй і Усходняй Беларусі, пра лёс Беларусі і беларускага народа мы папрасілі паразважаць Аляксандра КАВАЛЕНЮ, дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі:

— Аляксандр Аляксандравіч, адкуль жа такая цікавасць да падпісання пакта Молатава-Рыбентропа і пачатку Другой сусветнай вайны?

— Сапраўды, апошнія месяцы гэтыя падзеі даволі актыўна эксплуатуюцца прадстаўнікамі розных палітычных плыняў. Некаторыя з іх імкнуцца паставіць у адзін рад фашызм і сталінізм. Прыходзіцца з жалем канстатаваць, што і сёння гісторыя выкарыстоўваецца як палітычная зброя, дзеля вырашэння пэўных палітычных мэтаў. Вялікая шкоднасць такога падыходу ў тым, што мінулае ацэньваецца з пазіцыі сучасных уяўленняў, якія пераносяцца на канкрэтную палітыку ў дачыненні да той ці іншай краіны. Нават і пасля 70 гадоў пасля пачатку Другой сусветнай вайны зноў і зноў уздымаецца пытанне аб роўнай адказнасці нацысцкай Германіі і СССР за распальванне вайны. Здавалася, што прынятыя рашэнні ў Ялце, у Нюрнбергу, у Хельсінкі дазваляюць сусветнай грамадскасці і палітычным элітам дзейнічаць у межах выпрацаваных міжнародных актаў. Аднак хваля супярэчлівых, самавыключных ацэнак перадваеннага і ваеннага перыяду працягваецца. Прычым грамадскі інтарэс не толькі не заціхае, а наадварот, распальваецца яшчэ з большай сілай. Парадокс у тым, што новае абвастрэнне ніяк не звязана з выяўленнем і публікацыяй новых, раней не вядомых дакументаў і матэрыялаў. Пытанне не ў новых сенсацыйных фактах, а ў іх новай інтэрпрэтацыі, якая звязана з сучаснай маральнай і палітычнай ацэнкай.

— Можа, давайце паспрабуем асэнсаваць падзеі з нашага, беларускага, пункту гледжання? Я так разумею, што пачыналіся ўсё задоўга да 1939 года...

— Сапраўды, праблема фарміравання міждзяржаўных адносінаў у Еўропе ў пачатку XX стагоддзя патрабуе зрабіць позірк крыху ў глыб гісторыі, каб асэнсаваць, што адбывалася яшчэ да Мюнхена і да пакта Рыбентропа-Молатава. Пытанне становіцца відавочным, калі разглядаць праблему з улікам пераемнасці беларускай гісторыі, з пункту гледжання на Беларусь не толькі як на суб'ект міжнародных палітычнай сістэмы, але і нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў беларускага народа.

У пачатку XX стагоддзя ў Беларусі толькі пачынала фарміравацца нацыянальная незалежная дзяржаўнасць, краіна не мела дастаткова значнай знешнепалітычнай вагі. Многія міждзяржаўныя працэсы адбываліся без уплывовага ўдзелу беларускай нацыянальнай эліты. Яскравым прыкладам таму з'яўляецца заключэнне Брэсцкага і Рыжскага дагавораў. Фактам застаецца тое, што вырашэнне пытанняў дзяржаўнай цэласнасці Беларусі і ў першым, і ў другім выпадку адбывалася без запрашэння і ўдзелу беларускіх прадстаўнікоў. Ні міжнародная супольнасць, ні нават СССР не правялі неабходнай настойлівасці ў захаванні цэласнасці Беларусі, тым больш кіраўніцтва Польшчы, якое ўсяляк ігнаравала праблему беларускай дзяржаўнасці.

Пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора лідары Беларускай народнай рэспублікі крайне негатыўна ўспрынялі яго вынікі. Ужо 25 сакавіка 1921 года быў прыняты спецыяльны зварот да міжнароднай супольнасці, у якім, прынамсі, было напісана: «...Рыжскі польска-бальшавіцкі мір — гэта кашмарная насмешка над дэмакратыяй і яе ідэаламі. Імя яму насілле і грабеж...».

Неабходна зазначыць, што не толькі радыкальна настроеная частка беларускай палітычнай эліты, але і свядомая частка беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі адчувала і выказвала пратэст супраць раздзела адзінага беларускага дзяржаўнага арганізма. Абагульняльная пратэстная думка большасці нацыянальна свядомай часткі беларусаў была выразна выкладзена ў вершы Якуба Коласа «Беларускаму люду»:

Хіба забудзем мы тыя межы,
Што правадзілі бяз нас?
Раны глыбокі, ох,
яшчэ сьвежы!
Помсты агонь не пагас.
Нас падзялілі... Хто? Чужаніцы,
Чорных дарог махляры.
К чорту іх межы!
К д'яблу граніцы!
Нашы тут гоні, бары!

Аднак эмацыянальна-абвастраныя пачуцці прадстаўнікоў БНР і нацыянальнай інтэлігенцыі аб ганебнасці Рыжскага дагавора, спроба данесці гэтыя ідэі да палітычнай эліты еўрапейскай супольнасці засталіся незаўважанымі. У склад Польшчы было перададзена 113 тыс. км кв. беларускай тэрыторыі з насельніцтвам 4,6 млн чалавек. Неабходна прызнаць, што гэта была гістарычная рэчаіснасць, з якой можна гаграджацца ці не гаграджацца, але фактам застаецца тое, што ў першай палове XX стагоддзя супраць волі беларускага народа адбыліся два падзелы Беларусі...

— Калі паглядзець на падзеі трохі пазнейшыя, то вось у нас, яшчэ школьнікаў, было два полюсы ў свядомасці: германскі нацызм — гэта дрэнна, а савецкі лад — гэта добра, бо мы перамаглі і выратавалі Еўропу ад «карычневай чумы». А як цяпер?

— Так, прыхільнікі заходніх каштоўнасцяў гатовыя прыпісаць СССР усе магчымыя і немагчымыя грахі, паказаць Савецкі Саюз «імперыяй зла». Такая актыўная кампанія негатывізму, накіраваная на дыскрэдытацыю савецкага мінулага, прыносіць свае разбуральныя вынікі, уносіць сумяціцу ў душах не толькі маладога пакалення, але і ўсяго грамадства. Як бачна, цэлячыся ў мінулае, трапляюць у будучыню і разбураюць яе.

Па прыклад далёка хадзіць не трэба. Ужо ў пачатку ліпеня 2009 года Парламенцкая асамблея Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе прыняла рэзалюцыю «Аб'яднанне падзеленай Еўропы: абарона правоў чалавека і грамадзянскіх свабод у XXI стагоддзі ў рэгіёне АБСЕ», якая фактычна прыраўняла нацызм і сталінізм. Не заглыбляючыся ў дэталёвы аналіз дакумента, відавочна, што еўрапейскаму грамадству прапанавана своеасаблівая форма дыктату сучаснасці над мінулым, калі гісторыю спрабуюць асуджаць з улікам сучасных маральных крытэрыяў, прычым, па неабгрунтаваных і надуманых праблемах. Еўрапейцы забылі, хто іх выратаваў ад карычневай чумы...

На жаль, некаторыя замежныя даследчыкі не толькі адстойваюць ранейшыя пазіцыі, але і ствараюць новыя міфы. Вось свежы прыклад. Дырэктар Польскага інстытута міжнародных спраў Славамір Дэмбскі апублікаваў артыкул «Польшча, Савецкі Саюз, крызіс версальскай сістэмы і прычыны пачатку Другой сусветнай вайны». Аўтар заznачае, што ў «...прыходзе да ўлады нацыстаў у Германіі, чаму ў значнай ступені спрыяла Масква, аддаючы загады германскім камуністам змагацца не з нацыстамі, а з сацыял-дэмакратамі, Сталін бачыў сімптом крызісу капіталістычнага свету».

Як кажуць — прыехалі. Вядома, што пасля развалу СССР усю адказнасць за пралікі і памылкі, якія безумоўна мелі месца ў міждзяржаўных адносінах у 30-я гады XX стагоддзя, можна ўскласці на лідараў савецкай дзяржавы. Але гэта антынавуковы падыход, імкненне палітызаваць гістарычныя падзеі. Важна аб'ектыўна высветліць развіццё міждзяржаўных адносінаў, а не шукаць вінаватых. Магчыма паставіць іншыя пытанні, напрыклад, што здзейснілі лідары заходніх дэмакратый, каб не дапусціць станаўлення германскага нацызму? Хто садзейнічаў разбурэнню Версальскіх дамоўленасцяў? Хто фінансаваў нацысцкія праекты? Як супрацьстаяла станаўленню германскага нацызму Варшава? Пошук аб'ектыўных адказаў на гэтыя і многія іншыя пытанні дазволіць праліць святло і, магчыма, убачыць чорнага ката ў чорным пакоі.

Імкнуцца ідэалізаваць дзейнасць палітычнага кіраўніцтва СССР, у тым ліку і І. В. Сталіна, таксама справа антынавуковая. Вядома, што было дапушчана шмат памылак, пралікаў і нават злачынстваў. Але і здзейснена было нямала. У кароткі тэрмін у краіне ўзведзены тысячы новых прамысловых прадпрыемстваў, шахтаў, руднікоў, пабудаваны новыя гарады, значнае развіццё атрымала адукацыя, навука, культура. І калі ўсё станоўчае і адмоўнае прыпісваць толькі асобе І. В. Сталіна, тым самым прызнаваць яго бязмерную геніяльнасць і палітычную ўнікальнасць. Агульная крытыка і ахайванне савецкага мінулага і яго палітычных лідараў у адрыве ад гістарычнага часу, без уліку станоўчых і адмоўных падзей, без аналізу развіцця і ўзаемаўплыву сусветных палітычных і сацыяльна-эканамічных працэсаў — справа контрпрадуктыўная, антынавуковая і прыстасаваная да патрэбаў дасягнення пэўных палітычных мэтаў.

— А як вы ацэньваеце, Аляксандр Аляксандравіч, вядомы Дагавор аб ненападзе паміж Германіяй і СССР ад 23 жніўня 1939 года? Яго цяпер кожны трактуе як яму выгадна...

— Спачатку неабходна зрабіць адну прынцыповую рэмарку. Сутнасць у тым, што не толькі публіцысты і журналісты, але і гісторыкі робяць сур'ёзную памылку, калі гэты дагавор называюць «савецка-германскі дагавор», альбо «пакт Молатава-Рыбентропа», што з'яўляецца гістарычна памылковым і мае вядомы палітычна-метадалагічны падтэкст. Сутнасць у тым, што дакументальныя крыніцы адназначна сведчаць пра тое, што ініцыятыва заключэння дамовы зыходзіла не ад кіраўніцтва Савецкага Саюза, а ад палітычных лідараў Трэцяга Рэйха. У дакументальнай спадчыне яскрава відавочна, што менавіта Гітлер праяўляў не проста намаганні, а ў пэўным сэнсе вядомае вераломства дзеля найхутчэйшага заключэння дамоўленасці паміж Германіяй і СССР. Ведамства Рыбентропа падштурхоўвалася да актыўных дзеянняў, для найхутчэйшага заключэння германска-савецкай дамовы. А таму будзе больш правільна казаць «пакт Рыбентропа-Молатава», «германска-савецкі дагавор», што адпавядае рачаіснасці.

Разглядаючы праблему міждзяржаўных адносінаў у перадваенныя гады, важна звярнуць увагу на той факт, што пакт Рыбентропа-Молатава — гэта даволі складаная палітычна-дыпламатычная падзея. Яе нельга спрошчана разглядаць і ацэньваць, тым больш, без уліку ўсяго комплексу міждзяржаўных адносінаў, якія адбываліся ў свеце ў 30-х гадах XX стагоддзя і яшчэ раней.

— І што ж за падзеі разгортваліся ў гэты час? Чаму савецкае кіраўніцтва прыняло рашэнне заключыць дагавор аб ненападзе?

— Пасля прыходу нацыстаў галоўным напрамкам дзейнасці палітычнага кіраўніцтва Германіі на міжнароднай арэне было патрабаванне вяртання тэрыторый і адмены абмежаванняў на ўзбраенне Трэцяга Рэйха, якія былі прадугледжаны ўмовамі Версальскага дагавора. Вялікабрытанія і Францыя выявілі гатоўнасць да ўступак у абмен на ўзаемныя гарантыі бяспекі. Яны лічылі, што такім чынам можна супакоіць гітлераўскі рэжым і вырашыць супярэчнасці, якія ўзніклі паміж Англіяй і Францыяй, з аднаго боку, і Германіяй, Італіяй — з другога.

Стрыжнем унутрыпалітычнага жыцця Трэцяга Рэйха і найважнейшым ідэалагічным інструментарыем, які эфектыўна выкарыстоўваўся дзеля паспяховага забеспячэння палітыкі нацыянал-сацыялізму, з'яўлялася прапаганда шавінізму, стымуляцыя ідэі расавай выключнасці германскай нацыі, распальванне варожасці і нянавісці да іншых народаў. Нацыяналізм паразітаваў на біялагічных пачуццях людзей, захаванні і прадаўжэнні роду арыйскай расы, яе фізіялагічнай і фізічнай выключнасці. Нацысцкаму кіраўніцтву і яго ідэалагічнаму апарату ўдалося ў кароткі тэрмін разбэсціць значную частку грамадства, стварыць у краіне шавіністычны запал, насадзіць ідэі расізму, жорсткасці, рэваншу за «версальскую ганьбу».

Маючы шырокую грамадскую падтрымку, правячыя колы Германіі сталі дзейнічаць празмерна актыўна ў напрамку ігнаравання версальскіх рашэнняў. У 1935 годзе было абвешчана пра аднаўленне ў краіне ўсеагульнай вайсковай павіннасці. Германія прыступіла да стварэння моцнай арміі і авіяцыі. 21 мая 1935 года Гітлер пераймяноўвае рэйхсвер у вермахт і назначае сябе вярхоўным галоўнакамандуючым узброеных сіламі. Прычым захад не праяўляў неабходнай настойлівасці выканання германскім урадам Версальскіх дамоўленасцяў. Наадварот, летам 1935 года было заключана англа-германскае марское пагадненне, якое адкрыла шлях для значнага павелічэння танажу германскага ваенна-марскога флота і будаўніцтва падводных лодак. Пры фінансавай падтрымцы заходняга капіталу, у кароткі тэрмін было пабудавана 300 новых ваенных заводаў, рэканструявана і мадэрнізавана авіяцыйная прамысловасць. Да 1938 года ўжо было 30 самалётабудаўнічых, 15 авіяматорных і 110 дапаможных авіяцыйных заводаў. Калі да 1932 года ў Германіі не было ніводнага ваеннага самалёта, то ўжо ў 1934 годзе іх было пабудавана 840, у 1936-м — 2530, у 1938-м — 3350, а ў 1939 годзе ўжо мелася 4733 самалёты найноўшых мадыфікацый. Ваенная вытворчасць Германіі з 1934 па 1940 год вырасла ў 22 разы, што з'явілася важкай падставай для ўзмацнення ваенна-палітычнай агрэсіўнасці палітычнага кіраўніцтва Трэцяга Рэйха, асабліва пры прыняцці важных міжнародных рашэнняў.

Развагі занатоўваў Павел БЕРАСНЕЎ.
(Працяг будзе.)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Айчынных фільмаў на паліцах нестае

Беларусьфільм

Пільна аглядаю паліцы з ліцэнзійнымі DVD-дыскамі ў адной з крамаў Мінска, спадзяваўся зачапіцца вокам за якую-небудзь знаёмую назву беларускага фільма. Нават на паліцы з савецкай класікай не знаходжу ніводнага. Да мяне падыходзіць кансультант, тлумачу яму сваю цікавасць. «Дзіўнае пытанне, — рэагуе ён. — Некалькі фільмаў траплялася, але зараз няма».

Ці ж сапраўды маё пытанне такое дзіўнае, бо яшчэ ў некалькіх пунктах продажу на яго адрэагавалі прыкладна гэтак сама? Аднойчы, праўда, прапанавалі замовіць патрэбны фільм, але не назвалі ні тэрміну, у які дыск прывязуць, ні прыблізнага кошту. І ўвогуле не гарантавалі выканання замовы. Але калі якасную копію фільма праблематычна набыць, гэта яшчэ не вымалёўвае поўнай недаступнасці прагляду. Цяжка прыдбаць — можна пашукаць, дзе паглядзець. Жыхарам Мінска пашанцавала. Музей гісторыі беларускага кіно (вул. Свярдлова, 4) можа выратаваць, калі ёсць жаданне ці неабходнасць паглядзець пэўны фільм. Шукаеце ў каталогу патрэбную карціну і замаўляеце паказ у зручны для вас час. Можна патэлефанаваць на нумар (017) 227-10-75, а можна спачатку паглядзець каталог на сайце музея: http://www.sverdlova-4.joy.by.

І зусім неабавязкова прыходзіць вялікай кампаніяй. У музеі дзве залы: вялікая, калі прыходзіць больш за дзесяць чалавек, і маленькая, калі вы адзін ці з вамі не больш за дзевяць спадарожнікаў. Паказ кінафільмаў ажыццяўляецца з DVD-дыскаў высокай якасці.

— Цікавасць да нашых паслугаў узрастае, — апавядае кіраўнік Музея гісторыі беларускага кіно Ігар Аўдзееў. — У мінулым сезоне, з верасня 2008 года па ліпень 2009-га, глядзець беларускае кіно да нас прыходзілі дзвесце чатыры разы. І матывацыя ў гледачоў зусім розная. Часам прыходзяць паглядзець той ці іншы фільм, калі нехта са сваякоў спрычыніўся да яго стварэння. Часта бываюць арганізаваныя групы школьнікаў, глядзяць экранізацыі праграмных твораў. Людзей прыцягвае просты, нефармальны кантакт, і, безумоўна, нерэпертуарны прынцып паказаў. Але ў музеі павялічваецца і колькасць сістэматычных, рэтраспекцыйных паказаў, звязаных найперш з юбілеямі кінематографістаў. Адна з апошніх акцый была прысвечана сямідзесяцігоддзю рэжысёра Алега Нячаева. Сам аўтар удзельнічаў у мерапрыемствах. Адзінае, што засмучае, дык гэта тое, што зараз толькі каля ста пяцідзесяці айчынных фільмаў пераведзена ў лічбавы фармат, не ўсе знаходзяцца ў каталогу музея.

Добра, але куды звярнуцца, калі адзінаразовага прагляду недастаткова і неабходна атрымаць асабістую копію фільма? Музей гісторыі беларускага кіно не мае магчымасці тыражавання, паколькі не валодае аўтарскімі правамі. Выратаваць можа Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў, што размешчаны ў Дзяржынску. Для гэтага трэба даслаць на адрас Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» ліст з просьбай дазволіць зрабіць копію. Калі адказ станоўчы — можна замаўляць яе ў архіве. Але працэс гэты тэхнічна няпросты і адпаведна зусім не танны. Копія двухгадзіннага фільма будзе каштаваць больш за васемсот тысяч рублёў. Касмічны кошт для аднаго дыска... Але па словах намесніцы дырэктара архіва Алены Грыневіч, замаўляюць копіі даволі часта. Неаднаразова гэта робяць калекцыянеры, часам копія таго ці іншага фільма становіцца падарункам. Адным словам, копію адшукаць можна, калі вельмі гэтага хацець.

І ўсё ж у адной краме мяне трошкі абрадавалі: «Быў «Чорны замак Альшанскі», але ўчора яго купілі. Калі б вы прыйшлі раней...» Мо трэба часцей пытацца ў крамах пра беларускія фільмы, тады і пытанне гэтае перастане быць дзіўным, і прапанова ўзрасце?

Аляксей АЛЯКСАНДРАЎ.

В'ЕТНАМ НЕ ЗАБЫВАЕ СЯБРОЎ ПА ЗБРОІ

Чарговая сустрэча сяброў па зброі, якія ў свой час удзельнічалі ў барацьбе супраць амерыканскіх агрэсараў, адбылася ў Мінску.

Пасол В'етнама ў Мінску Ван Хыу Чан шчыра вітаў прадстаўнікоў Беларусі, якія дапамаглі в'етнамскім патрыётам выйграць надзвычай цяжкую і кровапралітную вайну з амерыканскім імперыялізмам. Ён адзначыў, што яго народ ніколі не забудзе прадстаўнікоў нашай рэспублікі: афіцэраў, медыкаў, спецыялістаў, якія з рызыкай для жыцця ўдзельнічалі ў барацьбе разам з яго суайчыннікамі супраць амерыканскіх агрэсараў і перамаглі.

В'етнамцы — сапраўды ўдзячны і высакародны народ. Яны памятаюць і шануюць беларускіх сяброў па зброі не на словах. З гэтай нагоды в'етнамскае пасольства штогод збірае ў сталіцы пад дахам Дома дружбы тых нашых суайчыннікаў, якія калісьці ў вельмі цяжкіх, часам невыносных для славянскага чалавека ўмовах, разам з в'етнамскімі патрыётамі адстойвалі свабоду і незалежнасць В'етнама. Прычым улады гэтай краіны не абмяжоўваюцца правядзеннем такіх сустрэч. Ужо не першы год В'етнам па запрашэнні яго ўрадавых структур наведваюць дэлегацыі беларускіх ветэранаў баявых дзеянняў на яго тэрыторыі. Нядаўна чарговая група вярнулася дамоў. Яны — і гэта думка гучала лейтматывам на сустрэчы — былі моцна ўражаныя дасягненнямі в'етнамскіх сяброў у эканоміцы і вырашэнні сацыяльных праблем. Нашы ветэраны не хавалі гонару за тое, што яны як пасланцы савецкай дзяржавы зрабілі свой значны ўклад у справядлівую справу.

Ініцыятарамі сустрэчы выступілі в'етнамскае пасольства, таварыства дружбы «Беларусь-В'етнам» і Мінская гарадская арганізацыя ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў.

Леанід ТУГАРЫН.

КІРАЎНІКІ «VISA» СПАДЗЯЮЦЦА, ШТО ІХ ЮБІЛЕЙ У БЕЛАРУСІ НЕ АПОШНІ

Міжнародная плацежная сістэма «VISA» не баіцца наступу нацыянальнай сістэмы «БелКарт»:

— Наш вопыт паказвае, што пры існаванні нацыянальнай плацежнай сістэмы паралельна з сістэмамі «Visa», «MasterCard» і іншымі можа быць станоўчым момантам, а не адмоўным, бо гэта дазваляе ў цэлым развіваць цікавасць да выкарыстання картак, і нашым галоўным канкурэнтам застаюцца наяўныя грошы, а не іншыя аператары картквых сістэм, — адзначыў на прэс-канферэнцыі з нагоды 15-гадовай прысутнасці кампаніі «Visa» на беларускім рынку **Джэральд ХОКІНС, віцэ-прэзідэнт Visa CEMEA па пытаннях фінансаў і тэхналогій.** — Мы вітаем канкурэнцыю паміж карткавымі сістэмамі. Мы верым, што «Visa» садзейнічала і будзе садзейнічаць развіццю плацежнай сістэмы ў Беларусі, у нас вельмі добрыя стасункі з банкамі, мы з ахвотай дзелімся нашымі ведамі і досведам у тэхналогіі, інфраструктуры, бяспеці плацяж

Простая мова

СМАК ПАМІДОРА

Малюнак з натуры. Спальня, ранічка, жонка ўстала першай і ўжо апранаецца. Мужык, лежачы ў ложку, яе павучае:
— Ну хто ж так робіць, га?!. Ну нязручна ж табе — ззаду ліфчык зашпільваць! Лепей спераду... А потым пакруціла б і шлейкі на плечы...
— Ты адкуль гэта ведаеш?! — утаропіла вочы кабета.
— Ды так — мужыкі на працы расказвалі...
Гэта, як вы здагадаліся, анекдот. Зараз — жыццё і як яно ёсць: на мінулым тыдні не пашчасціла — дзесь плячо застудзіла, рука балела — проста нясцерпна. І сілы ў ёй зусім не было: тэлефонную трубку зняць не магла. Гэта — перад сабою, а ўжо ззаду, за спінай нешта зрабіць...
Карацей, без навукі, як бязрукі: каб не тыя мужыкі з іх парадамі, — сама, даліпантачкі, не апранулася б!
А хтось казаў, анекдот...

Два радкі

Бяседа — паводле слоўніка — збор гасцей з пачастункам.

То мы ўжо сабраліся, начаставаліся — трэба заспяваць. Але што — ну якую ж з песень?

— ...Такую, каб усе мы ведалі! — замаўляе гаспадыня.

— Тады во гэту, — адзываецца адзін з мужыкоў і зацягвае... нешта незнаёмае, няўцямнае, немілагучнае... Аднак госці (мы ўпершыню ў гэтай кампаніі) уважліва (?) слухаюць, добразычліва (!) маўчаць, чакаюць...

Чакаюць пакуль выканаўца не зацягвае:

— Я хочу, что бы только ты
Со мной рядом сидела
И любовью своею
Согревала меня.

Прыпеў гэты спяваюць усе — з задавальненнем, двойчы...

А асобныя, дзеля яго, дзеля сапраўды прыгожых, але толькі двух радкоў не паленаваліся, развучылі цэлую песню — пра цёплы вечар.

Здаецца, у Тбілісі?

«Пераклічка»

Дом. Стары. І, лічы, такія ж жыльцы — таму за 60, таму за 70, старэйшай жыхарцы — 84. Але, дзякаваць Богу, на сваіх нагах яшчэ і пры памяці. Нават з гумарам... Днямі, расказвала, да яе ў дзверы суседка пазваніла. Сказала:

— Ой, мая Львоўначка... А вы не ведаеце, каго ў нас пахавалі?

— Не.

— То, значыцца, не вас?.. Ну і дзякуй Богу. А то я з дачы вечарам прыехала, бачу — нейкія галінкі на прыступках ляжаць, дык падумала, можа ўжо вы... А не чулі, хто? То пайду ў другіх папытаю.

Без адказу

З ліста ў газету: «Модна цяпер — медыкі ды псіхолагі ва ўсю павучаюць, што есці, што піць, як спаць-працаваць...

Я гатоў быў паверыць, каб не прыклад бацькі. Ён працаваў шмат, еў, што выпадала, выхоўваў нас пяцёх, гора гараваў, у вочы смерці глядзеў...

У 43-м партызанам самагонку гнаў. Кацёл узарваўся — кіпень шыбануў у столь і абрынуўся на яго, абварыўшы з ног да галавы. Боль — дзікі. Доктара трэба. А дзе яго ўзяць?

Родны брат (а мой, значыць, дзядзька) запрог каня, паехаў у нямецкі шпіталь. Праз знаёмых дамовіўся з немцам-хірургам — за паўпарсюка. Завезлі — і палову той тушы, і бацьку, схавалі сярод цяжкараненых... Праз сем дзён ён самастойна прыйшоў дахаты. І потым дажыў амаль да 90, без ніякіх «вумных» парад. Што гэта?»

...Пытанне, як кажуць: мо і насамрэч недзе «графік» ёсць, каму калі прыйсці на гэты свет, каму калі пайсці?

Памяці заслужаных...

«Камуніст па перакананнях і не член КПСС... па той самай прычыне», — гэта пра яго. Бо сумленнік, працаголік, бо «на службе», як кажуць, дняваў і начаваў. «Згарыш... Без пары», — часцяком пілавала жонка... Ён, як быццам, прыслухоўваўся — да яе, да сябе, але «збавіць абароты» неяк не мог, усё адкладваў на той час, калі скончыць рэканструкцыю, калі запусціць новы цэх...

Пабудаваць яго ён з большага паспеў, а вось адкрыць...

Чула: таму, хто працаваў — многа і самаахвярна — белы свет пакідаць лягчэй.

Адно — не помню, хто гэта сказаў?

Не самі яны? Сабе ў суцяшэнне?..

Ад прыблуднага сабакі...

Некалі гэта нявестка да свекрыві прыязджала часта. Бо падабалася. Ведама — у гасцях: смачна паесці, у чысцюткай пасцелі паспаць... Нешта дапамагчы, не без таго, але па драбязе... І з сабою набраць — мяска, салка, грыбкоў, варэнняў...

А потым яшчэ лепей стала — пакінуць: у вёсцы, на свежым паветры, пад каро́ўкаю, да садка, да школы і на ўсе канікулы ўласных дзяцей...

Яны хутка выраслі — на бабуліных руках, не сёння-заўтра маглі ёй праўнукаў падкінуць, але...

Яна, бабуля, у той дзень талаку збірала — бульбу капаць. Стала з вечара па кухні таптацца, казаць, каго запрасіла, на колькі чалавек трэба абед гатаваць...

— На мяне не разлічвайце, — трымаючыся за галаву, ледзь чутна прамовіла нявестка. — Я нешта нездаровая. Мусіць, ціск...

Свякроў нічога ёй не сказала. Сказала сыну — у запале, што дужа ж хітрая гэта хвароба — ціск: заўжды падымаецца, як нешта рабіць...

Нявестка пачула. І пакрыўдзілася: з усёй сілы ляпнула дзвярыма, сказала: «Нагі маёй болей не будзе!»

І... няма. Гадоў з пяць ужо. А свякроў злягла... Сын (ад прыблуднага сабакі не чакай падзякі) сам яе даглядае: як можа гатуе, як можа прыбірае. Жонка — вольная. Яна ўсім дэманструе цяпер, як гэта... выгадна пакрыўдзіцца на старога нямоглага чалавека.

І яго ж пры гэтым зрабіць віна́ватым.

Ад слова

Прыкметы часу — да́мы, як толькі могуць, вабяць кавалераў, крамы — пакупнікоў. І рэклама тут, і выбар тавараў; і сістэмы зніжак, і бясплатная падгонка...

Што, дарэчы, зручна... А калі і без чаргі...

Дзядок адзін напарадзе — старэнькі, сівенькі, у новым, з іголачкі, піжаку. Рукавы ўрэзаць трэба. Швачка ўжо прымерала, на колькі, закалола спецыяльнымі іголкамі.

— Во... Якая цяпер фастрыга, — здзівіўся дзядок і... заплакаў: ад слова. Яго маці — потым сказаў — майстрыхай была: шыла.

Не мыццём...

Дом. Пад'езд. Ля ўвахода — дошка для абвестак. У цэнтры — самая кідкая: «Уважаемые жильцы! В связи с постоянными засорами в трубах канализации, убедительная просьба не выбрасывать в унитаз мусор, а также предметы личной гигиены...».

Абвесткі такога кшталту на дзвярах з'яўляліся раней, з'яўляюцца цяпер... А воз, як кажуць...

Знаёмы начальнік ЖЭСа нядаўна расказаў, як яго (ну воз той) можна скрануць. Прычым з дапамогаю тых жа абвестак! Адно — трэба тэкст змяніць: вось ён, прынамсі, стаміўся рамантаваць каналізацыю ў адным з дамоў і даручыў напісаць, што грошай на гэтыя работы болей няма, таму цяпер у вядомую пасудзіну выкідваць можна ўсё што заўгодна: каналізацыя больш рамантавацца не будзе.

Хочаце верце, хочаце не, а праўда: лёгкі ўдар пугай спрацоўвае лепш, чым тры кілаграмы пернікаў.

«Няма таго, што раньш было...»

Раніца, але ўжо не ранняя — тралейбусы ходзяць рэдка. У чаканні разглядаю тавар у бліжэйшым шапіку, потым — спецыяльную тумбу для абвестак: цікава ж, што ў тэатрах цяпер, што ў канцэртных залах...

Цікава не толькі мне: побач дзве пенсіянеркі «тусуюцца».

— О-о, глядзі — твая Кручкова прыязджае, — выгуквае адна, — з творчым вечарам. І кошт білетаў напісаны: ад 25 да 50 тысяч рублёў. Добра было б схадзіць?

— Ну, — уздыхае другая. — Каб грошы былі... Але ж я, дзякаваць Богу, хоць раней нахадзілася: недзе білеты не раскупіліся, нам у школу званок — прыходзьце, маўляў, прыводзьце дзяцей, бясплатна. Дык мы і на футболах, і на хакеях, і на канцэртах розных былі. Цяпер не сходзіш ужо.

Няма таго што раньш было.

Новая тэхніка...

Вечар. Праспект. Два хлапчукі (гадоў мо па 10) насустрач ідуць — памаленьку, гуляюць... Мы амаль што раўняемся:

— О-о... Мне SMSка прыйшла! — выхваляецца адзін. І ўтаропіўшы вочы ў «экранчык» мабільніка, услых чытае: — По-шёл ты в ж... козёл...

Што ж, новая тэхніка — новыя магчымасці. Яшчэ і для гэтага.

Мы — не такія

Мінск, будынак вакзала. Адносна новы... І, скажам так, наварочаны. Што проста не можа не ўражваць... (Асабліва тых, хто іншых не бачыў)... Яшчэ і колькасцю людзей — проста плынь насустрач. Мусіць, нейкі цягнік прыйшоў, «высадзіў» пасажыраў — спрэс з вялікімі сумкамі (на колцах), з валізкамі...

Двух вось такіх нагружаных — досыць сталых і цемнаскурых, сутыкнуўшыся ў праходзе, хацела прапусціць. Але ж не паспела: яны апярэдзілі — галантна саступілі ўбок: толькі пасля вас, маўляў...

— Дзякуй! — схіліла галаву, праходзячы.

— «Ка-лі лас-ка», — старанна прамовілі дзядзькі, шырока ўсміхнуўшыся.

Яны, відаць, едучы да нас, рыхтаваліся — шукалі слоўнікі, вывучалі найбольш неабходныя словы, кшталту «дзякуй», «калі ласка», «колькі каштуе?», «як прайсці ў гасцініцу?»... Яны хацелі, хоць збольшага, размаўляць з намі на нашай мове і тым самым засведчыць павагу — да яе, да продкаў нашых і тым самым да нас...

А нам, як дазнаюцца потым, гэта не трэба.

Іграй, музыкант!

Захапленняў у Парфір'еўны шмат. Найпершае (агародніцтва) для вяскоўкі ўласцівае, другое — фатаграфія — яшчэ куды ні ішло, трэцяе ўжо і наогул — сталярства...

Але ж галоўнае сярод іх — музыка... І дыяпазон тут вельмі шырокі — ад Моцарта да Муркі, ад хора Пятніцкага да нашай «Бяседы». Праўда, інструмент любімы адзін — скрыпка.

...Не так даўно яна ў падземным пераходзе гучала. Нейкі хлопец граў — і досыць нядрэнна! Шкада, што паслухаць часу не было — пранеслася міма... І з думкай, што хто-хто, а Парфір'еўна ну ніколі б так не зрабіла! Яна б запынілася — недзе ў куточку, каб не замінаць... І каб ёй... Ніхто... А мо нават села б вось тут — на прыступках...

Уявіла гэта настолькі жыва, што, пачуўшы скрыпку яшчэ раз, стала азірацца навокал — шукаць вачыма слухачку.

Смак...

Гуманітарку прыслалі. З вёскі. У выглядзе памідораў. З... інструкцыяй па ўжыванні: а) (кожны пункцік — пад літаркай) уважліва разгледзець, б) узяць па адной самай спелай памідорынцы кожнага гатунку, в) палюбавацца, г) звярнуць увагу на падскурны малюнак і адценні колераў, д) разрэзаць — ацаніць структуру мякаці, е) з'есці па кавалачку кожнага гатунку без солі, потым — з соллю, ж) адчуць і адрозніць смак, з) вызначыць, які найбольш спадабаўся.

Лісток з «каштоўнымі ўказаннямі» быў і пры яблыках: а) з'есці, б) а-бал-дзець... І толькі потым пазваніць і сказаць пра ўражанні.

...«А-бал-дзела» — ад смакаты. Пазваніла. А цяпер во — і пішу. Каб нехта яшчэ скарыстаўся ўзгаданай інструкцыяй і адчуў смак... Восені.

Валянціна ДОЎНАР.

Здароўе нацыі

ЁСЦЬ ІШЭМІЯ — НЯМА ЭРЭКЦЫІ

Сёння ў еўрапейскіх краінах, у тым ліку і нашай, пачынаецца Тыдзень уралогіі. На думку арганізатараў мерапрыемства, якое праводзіцца ўжо шосты год, гэта — не для медыкаў. Для насельніцтва.

Уролагі кажуць, што ўралагічныя праблемы здольныя моцна паўплываць на якасць жыцця чалавека. Відавочна, не кожнаму спатрэбіцца, скажам, перасадка сэрца, а вось з праблемай мочавыдзялення сутыкаецца на працягу жыцця кожная жанчына, не кажучы ўжо пра распаўсюджанасць і разнастайнасць уралагічных праблем, здольных пагоршыць жыццё любога мужчыны.

Паводле слоў дацэнта кафедры нефралогіі і ўралогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, старшыні Беларускай асацыяцыі ўролагаў Мікалая ДОСТЫ, ёсць тры «блокі» ўралагічных праблем. У адным разглядаюцца такія захворванні, як рак прастаты, дабраякасная гіперплазія прастаты і прастатыт. Другі «блок» — эрэктыльныя расстройствы, парушэнні палавой функцыі. Трэці — праблемы мочавыдзялення.

Паводле айчыннай статыстыкі, дзесьці ў 50 са 100 тысяч мужчын нашай краіны выяўляецца **рак прастаты**. У Еўропе размова ідзе пра 120 чалавек, у ЗША — 150. Па меркаванні айчынных уролагаў, верагодна, захваральнасць у нас сапраўды ніжэйшая, чым у развітых краінах, аднак наўрад ці настолькі. Каб атрымаць рэальную карціну, неабходна забяспечыць скрынінг раку прастаты, што паспрыяе росту выпадкаў ранняга выяўлення захворвання. Што да **дабраякаснай гіперплазіі прастаты**, то пэўныя сімптомы з боку мочавыдзяляльных шляхоў, выкліканыя менавіта дабраякаснай гіперплазіяй, маюць у Беларусі каля 200 тысяч мужчын. Лічыцца, што ў кожнага трэцяга мужчыны пасля 50 гадоў ёсць названыя сімптомы. Нарэшце, ад **прастатыту** пасля 30 гадоў пакутуюць ад 14 да 40 працэнтаў мужчын у розных краінах.

Істотнай праблемай сярод мужчын працаздольнага ўзросту з'яўляецца **эрэктыльная дысфункцыя**, ад якой у свеце пакутуе каля 150 мільёнаў. У нашай краіне адпаведнай статыстыкі няма. Паводле слоў Мікалая Досты, да 2025 года колькасць мужчын, якія будуць пакутаваць ад падобных расстройстваў, падвоіцца. Нярэдка мужчыны, якія саромеюцца звярнацца да спецыяліста з такой праблемай, сутыкаюцца не толькі з абмежаваннем рэпрадуктыўных здольнасцяў, але і найгоршым чынам уплываюць на працягласць свайго жыцця. Дастаткова сказаць, што 100 працэнтаў мужчын з ішэмічнай хваробай сэрца маюць парушэнні эрэктыльнай функцыі (паколькі эрэкцыя, як вядома, — гэта добрыя сасуды). Заўважана і адваротная сувязь: палова мужчын з расстройствамі эрэкцыі маюць і сасудзістыя парушэнні. У такіх выпадках прызначаецца спецыяльная, штодзённая лекавая тэрапія. Нятанная, аднак настойлівасць у лячэнні прыносіць плён: у паловы пацыентаў не толькі аднаўляецца эрэкцыя, але і паляпшаецца кровазварот.

Асобная тэма — **расстройствы мочавыдзялення** ў жанчын. Мужчыны ад такіх парушэнняў пакутуюць рэдка. Ад таго ж нетрымання мачы — каля 12 працэнтаў мужчын ва ўзросце пасля 60. 5—10 працэнтаў прааперыраваных па прычыне таго ж раку прастаты сутыкаюцца з тым, што мача пачынае ісці, як кажуць уролагі, «транзітам». Праўда, нашы спецыялісты ўжо выконваюць у такіх выпадках унікальныя аперацыі, здольныя зрабіць мужчыну «сухім».

Жанчыны павінны мець на ўвазе, што пад дыягназам цыстыту тэрапеўты нярэдка прапускаюць шэраг нюансаў, якія даюць падобныя сімптомы. «Банальны» цыстыт — запаленне слізістай мачавога пузыра — мае месца, калі антыбіётыкі, якія прызначыў тэрапеўт або ўролаг, дапамаглі на працягу тыдня. Калі гэтага не адбылося, урач павінен пашукаць іншую прычыну. Так, напрыклад, 30—35 працэнтаў жанчын ва ўзросце ад 20 да 50 гадоў пакутуюць ад гіперактыўнага мачавога пузыра. Гэтай праблеме можна дапамагчы — лекавым, хірургічным, іншымі метадамі.

Сёння ў рэспубліцы працуе 375 уролагаў. Суадносіны колькасці спецыялістаў на 100 тысяч насельніцтва ў нас прыкладна такія ж, як у Балгарыі, Венгрыі, Галандыі. Мікалай Доста кажа, што сёння пры жаданні можна трапіць да ўролага — у паліклініках, абласных бальніцах, Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры «Уралогія і андралогія» на базе 4-й мінскай гарадской бальніцы, камерцыйных цэнтрах. Каб атрымаць высокакваліфікаваную дапамогу, не трэба ехаць у замежжа. Нашы ўролагі пастаянна вучацца, часта бываюць за мяжой і здольныя належным чынам дапамагчы. Гэта першае, пра што павінна нагадаць себе насельніцтва на Тыдні ўралогіі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

36,6°

ШКОДНІК ЖАНОЧАГА ЦЕЛА

Кожная жанчына рана або позна сутыкаецца з праблемай з'яўлення цэлюліту, нават самая худзенькая і прыгожая. І гэта не толькі з-за лішняй вагі, але і няправільнага ладу жыцця.

Вельмі часта можна пачуць ад жанчын, што чарговы антыцэлюлітны крэм не даў чаканых вынікаў. І кожны раз гучыць крытыка ў адрас гэтага крэму, а не таго, як яны ставяцца да свайго цела і арганізма ў цэлым. Чаму мілыя дамы часта думаюць, што можна намазацца крэмам ад цэлюліту і ляжаць, чакаць, пакуль скура стане гладзенькай і роўнай? Нават сухое палена не загарыцца само па сабе без прыкладзеных да гэтага намаганняў.

Крэм закліканы дапамагчы ў змаганні з непажаданай «апельсінавай» скурай. Менавіта дапамагчы, а не цалкам пазбавіць. Калі яго выкарыстаць разам з танізуючым масажам, эфектыўнасць узрастае ў некалькі разоў. Толькі не трэба ставіцца да масажу як да павіннасці, рабіць яго трэба з задавальненнем. Дарэчы, масаж можа зрабіць і каханы чалавек — як гаворыцца, сумясціць прыемнае з карысным.

Дапоўніўшы свае намаганні паўнавартасным харчаваннем (толькі не пераяраннем!) робім барацьбу з «ворагам» больш эфектыўнай. Для паскарэння абмену рэчываў арганізму патрэбныя разнастайныя вітаміны. І абавязкова піць чыстую ваду (каб выводзіліся шлакі і таксіны, якія якраз і назапашваюцца ў непажаданых месцах).

Можна заняцца змаганнем са злосным шкоднікам жаночага цела нават прымаючы ванну. Пасля таго, як скарысталіся скрабам для цела, нанясіце самастойна прыгатаваны крэм злёгку папляскваючы сябе рукамі.

Для крэма неабходна змяшаць 2 чайныя лыжачкі мёду з грэйпфрутавым і лімонным эфірным алеем (па 2 кроплі кожнага).

У такім разе можна за 3 тыдні пазбавіцца ад праяў цэлюліту і атрымаць далікатную аксаміцістую скуру.

Для ўзмацнення эфекту рэкамендуецца закончыць працэдуру прыняццем кантраснага душу: чаргуючы гарачую ваду (1 хвіліна) і халодную (1 хвіліна). Такая працэдура дапамагае ўзбадзёрыцца і з цягам часу перарастае ў прыемную звычку. Такім чынам можна ў наступным перашкаджаць з'яўленню непажаданай «апельсінавай» скуры.

КОЖНАЯ ЖАНЧЫНА — НЕПАЎТОРНАЯ...

Усе кажуць, што прыгажосць патрабуе вялікіх укладанняў.. А цяпер вось даводзіца жыць у рэжыме эканоміі. Але ні ў якім разе не варта эканоміць на сабе і на сваім здароўі.

Для прыгажосці твару трэба зусім няшмат — тое, што заўсёды пад рукой.

Цукар або мёд — у якасці скрабу, які, акрамя выдалення змярцвелых клетак з паверхні скуры, яшчэ і выдатна вітамінізуе і амалоджвае яе. Раз на тыдзень наносьце пажыўныя і супрацьзапаленчыя маскі, напрыклад, садавінавыя (банан, кефір, лімон з жаўтком), або разнастайныя і недарагія гліняныя маскі, у адпаведнасці з вашым тыпам скуры — з зялёнай, блакітнай, сіняй, чорнай — якія рэгенеруюць скуру, памяншаюць салааддзяленне, падсушваюць вугравыя высыпанні.

Асобная гутарка пра **валасы**. Лайма Вайкуле казала, што ў сапраўднай прыгажуні прыгожымі павінны быць тры рэчы — зубы, скура і валасы... і яна мае рацыю. Валасы трэба берагчы ад пастаяннай сушкі фенам, тэрмабігудзей, сонечных прамянёў. Масаж скуры галавы — не апошняя рэч у доглядзе, а таксама ні ў якім разе не варта карыстацца шчоткай з металічнымі зубамі, лепш з натуральнага дрэва (а як пахне ядловец або сасна!) Спалоскваць валасы добра адварам крапівы, рамонку, калі вельмі тлустыя — дубовай карой або разведзеным лімонным сокам.

Для ўмацавання валасоў можна рабіць **маску**: 1 лыжка аліўкавага алею, 5 лыжак кефіру, 1 жаўток. Нанесці на валасы і ўхутаць галаву на 1 гадзіну, пасля — добра прамыць.

Для догляду **рук** ёсць мноства ванначак: са звычайнай соллю — для ўмацавання пазногцяў, якія на ноч можна змазваць ёдам. Рукі пасля такіх ванначак можна змазваць не дарагім крэмам, а тым жа аліўкавым алеем (як і локці).

Для догляду **цела** (супраць цэлюліту і для карэкцыі фігуры, а таксама ў мэтах дасягнення гладкасці і шаўкавістасці) можна скарыстацца двума варыянтамі скрабаў (чаргуючы): мёд + соль, або нерастваральная малатая кава + вадкі мёд. Расцерці распаранае цела дачырвана ва ўсіх кірунках і прыняць кантрасны душ — адчуванне невымоўнае!

Калі ж пасля працоўнага дня вы захочаце **расслабіцца** — прыміце ванну з хвойным экстрактам, некалькімі кроплямі лавандавага алею (у сезон прастудаў дадавайце алей чайнага дрэва або ядлоўцавы) — і спакойны сон вам гарантаваны.

Пасля водных працэдур не забудзьцеся пра вейкі — змажце іх старым, ад ужо выкарыстанай тушы пэндзлікам, змочаным у касторавым алеі і заадно правядзіце ім па бровах — яны таксама патрабуюць догляду.

Апошняя рыска вашай непаўторнасці — усмешка! Добра чысціць зубы зубным парашком, а ўжо затым — зубной пастай (толькі не адбельвальнай!), затым спаласнуць рот адварам зверабою або шалфею, якія вельмі добрае ўмацоўваюць дзёсны.

Ну вось: «ВАШ ВЫХАД, МАДАМ!»

Урачыстая цырымонія

ПАСВЯЧЭННЕ Ў ЧЭКІСТЫ

У мемарыяльным комплексе «Дзяржынава» Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці адбыўся ўрачысты рытуал пасвячэння выпускнікоў Інстытута нацыянальнай бяспекі і шэрагу іншых вышэйшых навучальных устаноў у супрацоўнікі органаў дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Фота Арцура СТРЭХА.

Па традыцыі мерапрыемства прайшло на радзіме і ў дзень нараджэння — 11 верасня — заснавальніка надзвычайнага камітэта Фелікса Дзяржынскага. Дарэчы, у мемарыяльным комплексе штодня працуе дом-музей — месца, дзе прайшлі дзіцячыя гады чэкіста. Паводле слоў навуковага супрацоўніка «Дзяржынава» Уладзіміра Шалькевіча, сюды рэгулярна прыязджаюць беларускія і замежныя дэлегацыі. «Дзяржынскі — чалавек свайго часу, — кажа Уладзімір. — Разглядаць яго жыццё і дзейнасць з сучасных пазіцый складана — толькі ў кантэксце развіцця краіны. Размова ідзе пра фігуру, у дачыненні да якой не можа быць адназначнага меркавання. А пачаць гэту размову можна з таго, што Фелікс нарадзіўся ў надзвычай адукаванай сям'і. У ёй выраслі васьмёра дзяцей, пяцёра з якіх — сыны — усе атрымалі вышэйшую адукацыю...».

На пачатку далучэння «маладняку» да афіцэрскай сям'і чэкістаў старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь генерал-лейтэнант Вадзім Зайцаў заўважыў: «Сёння многія спрабуюць пераглядаць гісторыю... Але я абавязаны падкрэсліць высокі прафесіяналізм стваральніка, арганізатара органаў дзяржбяспекі, яго адданасць служэнню Айчыне ва ўмовах, якія былі на той момант. Лепшыя традыцыі тых часоў мы з вамі будзем рэалізоўваць на практыцы...». Паводле слоў старшыні камітэта, веды, якія атрымалі наваяўленыя чэкісты, звязаны з новымі відамі бяспекі не толькі нашай дзяржавы, але і сусветнай бяспекі ў цэлым. Гэта ў першую чаргу веды ў галіне барацьбы з інфармацыйнымі злачынствамі, кібер-злачыннасцю і кібер-тэрарызмам, у галіне разумення працэсаў, якія адбываюцца ў інфармацыйнай прасторы, у сетцы інтэрнэт. «Вашы тэарэтычныя веды на практыцы паслужаць умацаванню бяспекі Беларусі, — сказаў Зайцаў. — Упэўнены, што ў сваёй дзейнасці вы рэалізуеце лепшыя традыцыі чэкістаў».

Маладыя афіцэры, мінчане Аляксей Сафонаў і Яўген Сідараў, да ўрачыстага моманту прыняцця Кодэксу гонару і атрымання пасведчанняў ужо месяц адслужылі ў 8-м галоўным упраўленні ўрадавай сувязі. «Мы адвучыліся ў расійскай Акадэміі Федэральнай службы бяспекі, дзе якраз вывучалі камп'ютарную бяспеку, — расказваюць удзельнікі пасвячэння. — На сёння пазнаёміліся з працоўным калектывам упраўлення, у якім будзем працаваць, выконваць пастаўленыя перад намі задачы».

Аб адказнасці за народ, краіну і яе будучыню нагадаў у сваім вітальным слове старшыня Мінаблвыканкама Леанід Крупец. Добрыя наказы далі прадстаўнікі Савета афіцэрскіх сходаў і Беларускай грамадскай арганізацыі ветэранаў КДБ «Гонар». Кіраўніцтва Мемарыяльнага комплексу «Дзяржынава» і Цясноўскай СШ імя Ф.Э. Дзяржынскага, што ў Стаўбцоўскім раёне, атрымала напрыканцы цырымоніі каштоўныя падарункі ад імя камітэта.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Стаўбцоўскі раён.

ВЫНІК ПАПЯРОВЫХ ГУЛЬНЯЎ ГОМЕЛЬСКІХ ЧЫГУНАЧНІКАЎ

Ад пяці да дзесяці гадоў правядуць за кратамі члены арганізаванай групы, што выкрадала грашовыя сродкі Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельскае аддзяленне Беларускай чыгункі». Салідарна ім таксама давядзецца выплаціць больш за 1,7 мільярда беларускіх рублёў для пагашэння нанесеных страт. Абласны суд пакінуў без змяненняў прыгавор, вынесены некалькі раней судом Савецкага раёна горада Гомеля, — паведамляе прэс-група Гомельскага абласнога ўпраўлення КДБ. Гэта структура ажыццяўляла расследаванне крымінальнай справы.

Даказана, што для крадзяжу грашовых сродкаў абвінавачваныя аб'ядналіся ў кіраваную ўстойлівую групу. Натхняльнікамі і галоўнымі арганізатарамі справы сталі дырэктар ААТ «Глорыя С» Жанна Ранько і агент па забеспячэнні і збыце гэтай структуры, індывідуальны прадпрымальнік па сумяшчальніцтве Сяргей Анішчанка. Акрамя непасрэднага ўдзелу ў здзелках, яны каардынавалі і кантралявалі дзеянні астатніх.

Былы начальнік лакаматыўнага дэпо Канстанцін Камкічоў падпісваў плацежныя даручэнні і заведама фіктыўныя акты прыёму-перадачы камплектавых частак, забяспечваў пералічэнні грашовых сродкаў для ААТ «Глорыя С», даваў падначаленым загады на падрыхтоўку фіктыўных лістоў аб неабходнасці рамонту, які ў сапраўднасці ажыццяўляўся толькі на паперы.

Усе зламыснікі прызнаныя вінаватымі ў крадзяжы шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, здзейсненым групай асобаў па папярэдняй змове ў асабліва буйным памеры. Жанна Ранько і Сяргей Анішчанка прыгавораныя да 10 гадоў пазбаўлення волі кожны з канфіскацыяй маёмасці. Канстанціну Камкічову, Аляксандру Цянюце, Андрэю Булаўкіну прызначана па сем гадоў адбывання за кратамі. Яшчэ адзін удзельнік групоўкі Уладзімір Казлоў пакараны на пяць гадоў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Незабытая флатылія

Сёлета ў жніўні Кіеўскай грамадскай арганізацыяй «Таварыства ветэранаў разведкі ваенна-марскога флоту» пры падтрымцы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Петрыкаўскага райвыканкама была праведзена Міжнародная навукова-практычная экспедыцыя «Шляхамі Вялікай Перамогі», прысвечаная 65-годдзю вызвалення Беларусі і Украіны ад фашысцкай акупацыі. Узначаліў экспедыцыю старшыня таварыства Аляксандр Мармашоў.

Адной з мэтаў групы кіеўскіх вышукальнікаў было даследаванне возера Пугукала паблізу вёскі Конкавічы — экспедыцыя імкнулася выявіць месцазнаходжанне двух бранякатэраў Пінскай ваеннай флатыліі, якая па-геройску змагалася ў 1941 годзе на тэрыторыі Беларусі.

Два бранякатэры былі затопленыя экіпажамі пры адыходзе нашых часцей менавіта ў гэтых мясцінах, як сведчаць мясцовыя жыхары, удзельнікі тых ваенных падзей.

Да кіеўскай экспедыцыі далучыліся члены рэстаўрацыйнай групы дзяржаўнага музея «Лінія Сталіна» пад кіраўніцтвам Ігара Мацюка. Планавалася падняцце, а ў перспектыве аднаўленне бранякатэраў у якасці помнікаў ваеннай гісторыі.

Шмат звестак, як паведаміў нам старшыня раённай арганізацыі «Беларускага саюза афіцэраў» Фёдар Жукавец, было здабыта намаганнямі Пятра Гаготы, мясцовага аматара гісторыі. Дапамагаў у пошуках і ўнук ветэрана-марака Аляксандра Каратыцына Васіль Каратыцын, жыхар Конкавічаў.

Пры дапамозе спецыяльнага абсталявання была дасканала даследаваная тэрыторыя возера. І хоць бранякатэры пакуль не знайшлі, плануецца пошукі не спыняць, а больш дэталёва папрацаваць з архіўнымі матэрыяламі. Магчыма, з цягам часу (а прайшло больш за 60 гадоў) краі берагоў змясціліся.

Яшчэ адной з мэтаў экспедыцыі было абследаванне тэхнічнага стану ўнікальнага карабля, які прымаў удзел у вайне ў складзе Пінскай і Дняпроўскай ваенных флатылій — рэйдавага цеплахода (буксіра) «Ясельда», каб аднавіць і ўстанавіць помнік ваеннай гісторыі ў г. Петрыкаве.

У наступным годзе Пінская флатылія будзе святкаваць 70-годдзе. І як паведамілі прадстаўнікі райвыканкама, нягледзячы на адсутнасць грашовых сродкаў, робіцца ўсё магчымае, каб захаваць гэты ўнікальны помнік гісторыі вайны.

Алена ДАЎЖАНОК.

2008 год. Петрыкаўскі СБРЗ, цеплаход «Ясельда» чакае рамонту.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2009 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 6 кастрычніка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць электрачайнікі, блэндары, пыласос, тэлевізары «Віцязь» і халадзільнік «Атлант». Розыгрыш прызоў адбудзецца **8 кастрычніка 2009 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 18 кастрычніка 2009 г.**

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **па 25 снежня 2009 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2009 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 25 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Тэрмін правядзення гульні — з 01.09.09 па 12.10.09.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1518 ад 26.08.09, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

4 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2009 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)
_____ **на IV кв. або 2-е паўг. 2009 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету
ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) _____
Колькасць камплектаў _____
на 2009 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)
_____ (адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месяца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету
(індэкс выдання) _____
ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт | падпіскі _____ руб. | пераадрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2009 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)
_____ (адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

РАСЦІ ВЯЛІКІМ РАЗАМ З БЕЛАГРАПРАМБАНКАМ

Пра што мараць дзеці? Пра казкі і прыгоды. Пра што мараць іх бацькі? Пра тое, каб падарыць самае лепшае для дзетак і забяспечыць ім лепшую будучыню. Менавіта таму Белаграпрамбанк стварыў «Дзіцячую ашчадную праграму «Расці вялікі!» — акцыю, якую банк праводзіць спецыяльна для дзяцей. Удзел у ёй — не толькі магчымасць захаваць і памножыць грошы, але і парадаваць дзіця кожны год падарункам на дзень нараджэння.

12 верасня банк вырашыў парадаваць дзяцей, на чыё імя быў адкрыты ўклад і ў каго дзень нараджэння ў гэтым месяцы і арганізаваў для іх ўрачысты Дзень нараджэння. Больш за сорак хлопчыкаў і дзяўчатак разам з бацькамі былі запрошаныя ў парк забаваў «Dream land», дзе атрымалі не толькі падарунак, але і станоўчыя эмоцыі. Дзеці разгадвалі загадкі, рашалі крыжаванкі, малявалі на асфальце, танцавалі і пакаштавалі святочны торт.

Сёння больш за 7500 дзяцей па ўсёй Беларусі (а самым маленькім з якіх не споўнілася і года) сталі ўдзельнікамі «Дзіцячай ашчаднай праграмы», і гэта лічба пастаянна расце.

Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.

У ЛІХТЭНШТЭЙНЕ НАС НЕ БУДЗЕ

Зборная Беларусі па футболе, дзе ўзрост футбалістаў не перавышае сямнаццаці гадоў, не здолела прабіцца далей па сетцы адбору на чэмпіянат Еўропы.

52 каманды Старога Свету былі падзеленыя на трынаццаць групаў па чатыры ў кожнай. Нашы хлопцы апынуліся ў групе з парадкавым нумарам 13. Менавіта гэтая група першай сярод усіх вызначыла шчасліўчыкаў. Турніры ў астатніх распачнуцца дзе напрыканцы верасня, дзе — у кастрычніку. Адбор жа ў нашым квартэце мусіў адбыцца на чатырох стадыёнах нашай рэспублікі. За гэты час зборныя Швейцарыі, Чэхіі, Сан-Марына і Беларусі павінны былі правесці матчы адно з адным. Трыма гарадамі сталі Мінск, Барысаў і Маладзечна.

Сёлета ў зборнай 1993 года нараджэння змяніўся трэнер. Замест Пятра Васілеўскага, які раней кіраваў гэтай камандай, трэнерам стаў Юры Малееў. Гонар правесці матч адкрыцця выпаў Гарадскому стадыёну ў Маладзечне. Тут гулялі нашыя супернікі Швейцарыя і Сан-Марына. Зрэшты, называць санмарынцаў супернікам нават недарэчы. Хутчэй, як называюць у футбольным свеце лёгкія ці яшчэ прахадныя матчы, спарынг-партнёр. Не дзіўна, што гульні з удзелам зборнай Сан-Марына ўсіх узростаў вельмі аддалена нагадваюць сур'ёзнае суперніцтва, а інтрыга хіба толькі ў тым, колькі мячоў фаварыт заб'е і ці здолеюць санмарынцы правесці хоць бы адну сур'ёзную атаку. Гол для гэтай каманды — свята. Аднак дакараць не трэба. Чаго яшчэ можна чакаць ад зборнай краіны, якую насяляюць 28 тысяч чалавек і ў якой няма прафесійнага футбола? Таму Сан-Марына знакаміта маркамі, манетамі, але не футболам. Яны гуляюць проста так, дзеля інтарэсу, хобі. Прычым інтарэс іхні досыць дзіўны: каманда ва ўсіх трох матчах у Беларусі паказвала нежаданне ісці ў атаку. Напарадзе быў толькі адзін форвард, якога традыцыйна гуляў чалавек з нетыпова рудымі для санмарынца валасамі Марка Бернардзі. Швейцарцы выйгралі ў іх з непрыстойным лікам 10:0, хоць канчаткова пасыпаліся аўтсайдары толькі ў канцы гульні.

У гэты ж дзень на стадыёне «Дынама-Юні» гаспадары турніру гулялі з чэхамі. Было бачна, што прайгравалі беларусы ў асноўным у магутнасці. Чэхі развітыя фізічна лепей за беларусаў, залішне часта абыходзілі візаві на хуткасці па флангах, адкуль навесы ў іхнім выкананні былі істотнай пагрозай. Браты-славяне рэгулярна даравалі нам неахайнасць з частымі стратамі мяча. Падалося, што гэта проста не чэшскі дзень, і нам удасца згуляць унічыю, аднак цэнтральны абаронца апанентаў Філіп Твардзік удала згуляў пасля розыгрышу вуглавога, калі ўдарам галавы дабіў мяч у сетку пасля сваёй жа першай спробы. У другім туры чэхі асабліва не напружваючыся і замяніўшы ледзьве не палову стартавага складу, улічваючы капітана Томаша Чэслака і брамніка Уласціміла Весэлага, перайгралі Сан-Марына 4:0. Беларусь жа гуляла ўвечары са Швейцарыяй. Пасля турніру Юрый Малееў назаве гэты матч лепшым для беларусаў на турніры. Але тое адносна, бо і тут нас чакаў пройгрыш. Мы саступілі ў многім з-за горшага валодання мячом. Маціа Дэсоль забіў з гульні і з пенальці. Як вынік — 0:2, і наша зборная пазбавілася шанцаў нават стаць адной з дзвюх лепшых камандаў, што занялі трэція месцы. Нарэшце, 10 верасня фаварыты квартэта вызначылі першае-другое месца, што не мела вялікага значэння. Швейцарцы, якія выглядалі, напэўна, крыху лепей за чэхаў у мінулых двух турах, расслабіліся і саступілі нечакана буйна 0:4. Беларуская зборная перамагла санмарынцаў з тым жа лікам. Хет-трыкам адзначыўся Кавалёў, яшчэ адзін гол правёў Шпак. Пасля гульні галоўны трэнер беларусаў падвёў кароценькі падрахунак усяму турніру і распавёў пра планы:

— Вынік заканамерны. Мы маглі б больш удала згуляць з чэхамі, швейцарцам супрацьстаялі няблага, лічу, гэта быў наш лепшы матч. Аднак саступаем па працы з мячом, сур'ёзна саступаем. Апрацоўка, перадача, спыненне, вядзенне мяча — нашы недахопы. Плюс стандарты. На іх мы дзейнічаем не так, як хацелася. Бадай, усё справядліва, што скончылася так.

Элітны раўнд адбору пройдзе ў сакавіку 2010 года. Фінальны турнір адбудзецца ў маі ў маленечкім княстве Ліхтэнштэйн, але мы будзем на ім толькі гледачамі. Тым не менш рабіць з гэтага трагедыю не трэба. Усё будзе, асабліва ў гэтых хлапцоў, бо цяпер ім толькі шаснаццаць...

Арцём СІЗІНЦАЎ.

ЯК МЫ ГАЛІВУДЗІЛІ ПАД ЭЙФЕЛЕВАЙ ВЕЖАЙ

Карэспандэнты «Звязды» Глеб ЛАБАДЗЕНКА і Яўген ВАЛОШЫН прыбылі ў Парыж, дзе спачатку ім ледзьве не выпусцілі дух у арабскім квартале. Але, пабачыўшы Елісейскія палі, яны вырашылі застацца тут яшчэ на дзень.

— Вы не супраць засяліцца ў нумар з дзвюма бразільскімі валейбалісткамі? — паглядзеў на нас з-за стойкі адміністратар парыжскага студэнцкага гатэля непадалёк ад Монпарнаса.

— Мы вельмі любім Бразілію, гэта цудоўная краіна! — хорам адказалі яму карэспандэнты «Звязды», і адміністратар працягнуў ключ з лічбай «11».

...Карацей, учора зранку мы прачнуліся ў Парыжы. Не паспел абмеркаваць, ці не схадзіць апошні раз у халяўную прыбіральню ў аўтобусе, як аўтобус спыніўся, і мілая сцюардэса заваркатала, што была б радая бачыць нас зноўку.

Напіўшыся ў аўтобусе кавы, мы прагнулі пачаць экскурсію па Парыжы з мясцовага ватэрклазэта.

— Напэўна, зараз не менш за 5 еўра каштаваць будзе... — пабразгваў манеткамі ў кішэні карэспандэнт Лабадзенка. Сум быў не беспадстаўны — зранку на французскай запраўцы самы танны пакет печыва каштаваў 2,20 еўра (8800 руб.), а бутэлечка халоднай какавы — 1,5 еўра (6000 руб.).

Раптам пасярод вуліцы мы пабачылі яе — як касмічны карабель. З яе, зашпільваючы прарэх, вывалівалі бомж. Запалілася лямпачка «ачыстка», і прыбіральня зараўла як камбайн «Гомсельмаш» падчас жніва.

Першы абед у Парыжы. Раён Манмартра, аўтобусны прыпынак.

Бясплатныя прыбіральні — надзвычай карысная рэч на парыжскіх вуліцах.

«Свабодна» — дзынкнуў званочак.

— Няўжо задарма? — недаверліва агледзеў цуда-прыбіральню карэспандэнт Валошын, шукаючы дзюрачку для грошай. Аднак дзверы адчыніліся — і мы пабачылі чысцюткую бясплатную прыбіральню сярод ажыўленай парыжскай вуліцы.

Спачатку вырашылі завезці рэчы ў гатэль. Знайсці яго было нялёгка. Ведаеце, колькі станцый у парыжскім метро? 284! У Мінску, дзе 25 станцый метро, заблукаць значна цяжэй. А тут, каб праехаць якія 4 станцыі (па розных лініях) і выйсці на двор, мы змарнавалі больш за гадзіну. Урэшце, каб знайсці выхад на бульвар дэ ля Шапэль, мы звярнуліся па дапамогу да паліцыянтаў.

Выбраўшыся з егіпецкай няволі, урэшце знайшлі патрэбны гатэль. Дарогаю карэспандэнт Лабадзенка здзейсніў даволі выгадны набытак — новую сумку на колах. Каштавала яна спачатку 60 еўра. Давялося расказаць прадаўцам, што мы з далёкай Беларусі, і каб набыць у іх гэтую сумку, праехалі 2000 кіламетраў. Праз 10 хвілін актыўнага гандлю кошт знізіўся да 27 еўра. Тады ў ход пайшоў казырны аргумент.

— Зыс із беларусіан чоколэт «Альёнка», іт іс прэзэнт фо ю! — дастаў карэспандэнт Лабадзенка мінскія запасы з валізы. Прадаўцы-арабы не вытрымалі псіхалагічнай атакі, і за 25 еўра сумка пайшла з малатка.

Той самы бульвар дэ ля Шапэль, дзе мы спыніліся ў гатэлі, — гэта той яшчэ раёнчык. Далібог, калі прагульваліся па ім першы раз, нас ледзь не затапталі арабы. Усё праз тое, што карэспандэнт Лабадзенка «красамоўна» сфатаграфаваў жабрачку.

— Хэй, хэй, хэй! Навошта яе фатаграфуеш?! — адразу ж закрычала зграя арабаў і кінулася да нас з кулакамі. Высветлілася, што жабракоў у Парыжы апякае «страха».

Карэспандэнт Лабадзенка зарыентаваўся імгненна, сцёр «жабрачку» (каб узнавіць фотаздымак дома) і ўжо было палез у кішэню па «Алёнкі», але абышлося.

— Каб вы спруцянелі!.. — хапаўся за галаву карэспандэнт Валошын. — Палыч, куды ты мяне прывёз? Ледзь кішкі не выпусцілі! Дзе мы? У *Шанхаі, у Каракасе?!* Ці ў Парыжы?..

Вуліцы раёна і сапраўды забітыя ўсімі калібрамі арабаў, азіятаў,цемнаскурых. На пятнаццаць цёмных — адзін еўрапеец. А ў віраванні тысяч людзей заторы здараюцца нават на ходніках.

— Валошын, рыхтуйся, гэта можа чакаць і нас! — вылупіў вочы карэспандэнт Лабадзенка, паглядаючы на чорную як смоль маці з пяццю дзецьмі. — Такіх мамачак тут як дрэваў у Белавежскай пушчы!..

Кошты ў мясцовых арабскіх кавярнях самыя танныя — ад аднаго еўра за смажаны ў аднагадовым алеі пончык. Каб пад'есці ў больш-менш прыстойнай рэстарацыі — рыхтуй не менш за трыццаць еўра. Карэспандэнты «Звязды» пра гэта ведалі і загадзя набылі ў Празе кілбасу, кансервы і хлеб.

Знайсці лавачку, каб з'есці гэта, — справа нялёгкая. Лавачкі, як і дрэвы, у гэтым раёне варта заносіць у Чырвоную кнігу. Абедаць давялося на аўтобусным прыпынку, поруч з цемнаскурай двухцэнтнернай негрыцянкай. Тая голасна абмяркоўвала з дачкой, дзе б тут набыць таннейшы гамбургер. Пад'елі, уладкаваліся ў гатэлі, дапілі пражскае піва — і ў горад!..

Я гатовы ляжаць тут вечна!

— Скажыце, а як праехаць...

— Другая лінія метро, затым на станцыі Шарль дэ Голь пераходзіце на шостую, колькі прыпынкаў — і вы ля Эйфелевай вежы, — завучана выпаліў адміністратар гатэля.

Ведаеце, Эйфелева вежа чароўная!.. Мы сотні разоў бачылі яе на фота, па тэлевізарах — і вобраз яе здаваўся ўжо замыленым. Аднак якая яна велічная, вытанчаная і шляхетная ў сапраўднасці! Сёлета якраз адзначаецца 120-годдзе вежы, і мы, разявіўшыся, шчыра не разумелі, як можна было стварыць такое харство ажно ў пазамінулым стагоддзі, без сучасных тэхналогіяў і прыладаў. А яшчэ дзівіліся, як можна было ненавідзець вежу (а напачатку ў парыжанаў так і было) і нават хацець зруйнаваць яе! Густаву Эйфелю давялося адстойваць свой твор, зрабішы там рэстарацыю — каб даказаць практычную неабходнасць вежы.

Карэспандэнты «Звязды» ВАЛОШЫН і ЛАБАДЗЕНКА Парыж пабачылі, але памяраць пакуль не збіраюцца.

У арабскім квартале.

Гэты здымак жабрачкі ледзьве не каштаваў карэспандэнтам жыцця.

Славуты Гі дэ Мапасан называў вежу «скручанымі разам жалезнымі балванкамі». Але аднойчы яго заспелі ў рэстарацыі «Жуль Верн» на трэцяй платформе вежы. На пытанне, што ён робіць у ненавісным будынку, Мапасан адказаў: «Гэта адзінае месца, адкуль не відаць гэтае брыдоты».

Нам вежа брыдотаю не падалася. Пасноўдаліся ля ейных падмуркаў, прайшліся далей, сфатаграфаваліся. На газоне Марсавага поля сядзела і ляжала моладзь.

— Я гатовы ляжаць тут вечна! — заваліўся на траву карэспандэнт Валошын.

— А я — фоткаць яе! — мяняў па чарзе аб'ектывы карэспандэнт Лабадзенка.

Мы пачалі абмяркоўваць, што добра было б зладзіць тут пікнік — бо ўсе наўкол нешта жуюць і п'юць. Ажно як пачулі над вухам: «Піва, віно!.. Піва, віно!..»

— Хаў мач? — падняў галаву Валошын.

— Спэшылі фо ю! — падскочыў ад радасці араб з торбачкай. — 5 еўра пляшка піва, 10 еўра пляшка віна!

Мы пераглянуліся і адказалі арабу: «Дорага».

— Спецыяльная зніжка! — усміхнуўся, як усурыйскі тыгр, той. — Дзве пляшкі піва за 6 еўра!

Мы выцягнулі з кішэні 5 еўра і запыталіся, ці згодны ён на такі бартэр. Ён быў нават вельмі згодны. Піва «Хайнікен» было смачнае і, галоўнае, халоднае.

Мы ляжалі ля Эйфелевай вежы, пацягвалі добрае піва, палілі гаванскую цыгару — і абмяркоўвалі тое, што дзень скончыўся ў цэлым няблага.

Дарэчы, кожную гадзіну на вежы, якая і так свеціцца ў цёмны час, запальваюцца 20 тысяч лямпачак роўна на 10 хвілін. Сфатаграфаваць гэта цяжка, але глядзець — адна асалода! Налюбаваўшыся, вырашылі скончыць дзень ля Трыумфальнай аркі і адным вокам пабачыць славутыя Елісейскія палі.

...У гатэлі высветлілася, што нашыя суседкі — зусім не бразільскія валейбалісткі, а мілыя польскія студэнткі Агата і Марта. Наш пражскі хлеб і паштэт склалі сціплую вячэру, а старадарожская самагонка стварыла патрэбны настрой.

Дабранач, шаноўныя чытачы!..

Глеб ЛАБАДЗЕНКА, Яўген ВАЛОШЫН.

Прага-Парыж.

(Працяг будзе.)

«ЛАЦІНКА» Ў ЗВЫКЛЫМ АНТУРАЖЫ

Чуць і бачыць — рэчы зусім розныя, а перакананцца ў гэтым давялося яшчэ раз. Дзякуючы і агульнаму мінуламу, аднолькава папулярным спевакам, садавіне і раскладу апошніх гадоў беларускіх футбольных камандаў рознага ўзроўню аб гэтай краіне мы ведаем нібыта нямала. І ўсё ж далёка не ўсё. Бо сёння нават пры вялікім жаданні ў Малдове не заўважыш прыкметы нібыта шырока разрэкламаванага «Euronews» і расійскімі тэлеканаламі заняпаду. Прычым насуперак надпісамі лацінскімі літарамі, тут чамусьці не адчуваеш сябе за мяжой.

Транзіт. І не толькі дарога

Адлегласць ад Мінска да Кішынёва складае пад тысячу кіламетраў. Калі ўзяць пад увагу 17—20 гадзін у дарозе з улікам усіх памежных фармальнасцяў, то гэта — безумоўная нязручнасць. Аднак яна з лішкам кампенсуецца магчымасцю няхай сабе і недзе павярхоўнага, але знаёмства з «транзітнай» Украінай.

Першае, што кідаецца ў вочы ў Кіеве — безліч бігбордаў, светлавой і той жа «папяровай» рэкламы на сценах. Калі ж дадаць да гэтага вялікую колькасць па-сапраўднаму дарагіх аўтамабіляў, выснова напрошваецца сама па сабе: нават пры крызісе ўкраінскі бізнэс не здаецца. Аднак назіранне нумар два ўжо супрацьлеглае. Магчыма, у тым ліку з-за спрыяльных умоў для прыватнай ініцыятывы, мясцовы бюджэт адчувае пэўныя праблемы. Пацверджанне — засмечаныя вуліцы, непафарбаваныя (як кажуць, адчуйце розніцу) шматпавярховікі, вельмі стары і зусім не прэзентабельны грамадскі транспарт.

Яшчэ адна відавочная кіеўская «іскрынка» — вірлівае палітычнае жыццё. Чарговыя выбары тут адбудуцца неўзабаве, а нагадвае пра іх зноў-такі рэклама. Выявы лідараў партый, рухаў і асобных палітыкаў сустракаюцца ці не на кожным кроку. Зрэшты, самі ўкраінцы ставяцца да ўсяго гэтага не без іроніі, прынамсі, адно з самых папулярных графіці на сценах сталіцы выглядае больш чым красамоўна: выява мятлы з добра зразумелым без перакладу надпісам «Гэть усіх!».

Увогуле ж здаровае пачуццё гумару — рыса ў паўднёвых суседзяў характэрная. Чаго вартае хоць бы назва прыдарожнай кавярні «Сало» ці выпадак на зваротным шляху. Нібыта строгі мытнік знайшоў у нашым салоне «лішнюю» пластыкавую бутэльку з маладым жоўтабелым па колеры малдаўскім віном (адмовіцца ад спакусы было немагчыма), аднак, нягледзячы на забарону ўвозу на тэрыторыю Украіны больш чым двух літраў алкаголю, толькі ўсміхнуўся: «Прыхапілі з сабой боршч? Ну то шчаслівай дарогі!».

Праўда, смяяцца на гэтай жа мяжы хацелася не заўсёды. Фармальна па той бок знаходзіцца Рэспубліка Малдова, фактычна ж — Прыднястроўская Малдаўская рэспубліка. Яна афіцыйна не прызнана ў свеце, затое мае свае сцяг і герб (копіі атрыбутаў Малдаўскай ССР), уласную міліцыю (у настальгічнай форме савецкіх часоў), валюту (заўвага: у тутэйшых крамах зусім не супраць долараў, еўра ці расійскіх рублёў), а таксама мытню.

Прастаяць на ёй пры поўнай адсутнасці іншых транспартных сродкаў давялося амаль дзве гадзіны. Але гэта — толькі палова бяды. Нашмат больш уразілі даволі арыгінальныя правілы выплаты дарожнага збору пры выездзе, калі ў «абкладаемы» кіламетраж чамусьці залічылі праезд як па Прыднястроўі, так і па Малдове на другім беразе. А «апафеозам» непрацяглага знаходжання ў ПМР стаў непрыемны інцыдэнт — штраф за перавышэнне хуткасці. Крыўдна нават не тое, што 71 кіламетр у гадзіну па дарозе за горадам без дадатковых абмежавальных знакаў як быццам ніякім чынам не супярэчыць міжнародным стандартам. Збянтэжыла, што прадстаўнікі праваахоўных органаў прапанавалі вырашыць «праблему» хутка і на месцы. За 20 долараў. Натуральна, без афармлення якіх-небудзь квіткоў.

Зрэшты, даваць ацэнку ўсім жыхарам Прыднястроўя зыходзячы толькі з прыкрых здарэнняў, безумоўна, нельга. Як немагчыма і вырашаць, хто меў рацыю падчас вядомага малдаўска-прыднястроўскага канфлікту. Насамрэч гэта — выключна ўнутраныя справы. Можна хіба што заўважыць, што большасць малдаван, рускіх, украінцаў сёння не разумее, чаму ўсё ж была «патрэбнай» тая вайна. І шкадуе. Бо ці не ў кожнага «на тым беразе» — сваякі.

Аднак рэальна падзел застаецца. Мост праз Днестр сустракае ўзброенымі вайскоўцамі і БТРам. Адразу за пастом пачынаецца Рэспубліка Малдова. У яе мы патрапілі без праблем.

Не дома. Аднак не ў гасцях

Урадавыя будынкі, начная падсветка, вялізныя супермаркеты, сучасныя гатэлі і стадыёны. Сёння Кішынёў падаецца тыповай сталіцай. Аднак са сваім каларытам — будынкі ў цэнтры горада пераважна невялікія, рух аўтатранспарту не інтэнсіўны, гуляць на вуліцах без аніякай рызыкі можна нават ноччу.

Увогуле, на суб'ектыўны погляд, рытм жыцця і антураж тут можна параўнаць з адным з усходнебеларускіх абласных цэнтраў. Напрыклад, з Гомелем — асабліва калі працягнуць паралелі з архітэктурай, паркамі, шматпавярховікамі на ўскраінах і значным «прыватным сектарам». Адрозненне са знакам плюс — у найбуйнейшым горадзе Малдовы не пабачыш людзей, якія п'юць піва на лаўках. А са знакам мінус — стан тратуараў. Калегі, якія выбраліся паблукаць па вячэрнім Кішынёве на высокіх абцасах, шкадавалі аб сваёй неабачлівасці ці не ўвесь наступны дзень.

Не менш цікавае назіранне датычыцца мовы. Як правіла, тут чуеш малдаўскую, прычым большасць грамадзян краіны адназначна называюць яе румынскай. Аднак ніякіх бар'ераў гэта не стварае. У краіне шмат рускіх школ, а ў школах малдаўскіх руская мова — прадмет абавязковы. А адсюль і адсутнасць цяжкасцяў. Няхай сабе і з акцэнтам, але прадстаўнікі ўсіх пакаленняў адкажуць на любое пытанне. Ды яшчэ і са шчырай усмешкай — яе можна назваць такой жа «прыкметай» гэтай краіны, як і вінаград.

Работа над памылкамі

Розніца паміж горадам і вёскай ёсць паўсюль, але ў Малдове існуе ўмоўны падзел і паміж самімі вёскамі — ужо па лініі «поўдзень-поўнач». Асаблівасцямі поўначы можна назваць узлескі, статкі кароў і лепшыя дарогі. Поўдзень — гэта больш крутыя ўзгоркі, атары авечак і грунтоўкі. А плюс да ўсяго міжволі звяртаеш увагу на палі. На поўдні яны збольшага шырокія, на поўначы ж часта нагадваюць плямістую коўдру з невялікіх зялёных, жоўтых ці чорных лапікаў ужо пераараната ворыва. Прычым што адметна: паўночныя краявіды сталі непасрэднымі вынікамі мясцовай аграрнай рэформы.

Пераўтварэнні ў сельгассектары прыпалі на першую палову мінулага дзесяцігоддзя. Усе, хто жыў у вёсцы, атрымалі сваю зямельную квоту. Надзелы залежалі ад памераў гаспадарак, таму ў адных месцах кожнаму дасталася па 2-3, а ў іншых — па 7 і больш гектараў. Але ворыва, сады і вінаграднікі «ўнутры» былых калгасаў дзялілі пароўну. Па справядлівасці.

Сэнс рэформы амаль цалкам стасаваўся з вядомым лозунгам «зямлю — сялянам». За сціслы прамежак часу ў Малдове сапраўды з'явіліся прыватныя гаспадары, мэта была нібыта дасягнутая, але... заўвага наконт добрых намераў існуе нездарма. Неўзабаве высветлілася, што дробныя ўласнікі проста не ў стане забяспечваць севазварот, купляць новую тэхніку, укладваць грошы ў сучасныя тэхналогіі. Эфектыўнасць вытворчасці рэзка знізілася, дзе-нідзе надзелы не апрацоўваліся ўвогуле. Традыцыйна моцная сельская гаспадарка рэспублікі зрабіла вялікі крок назад, а саму праграму рэформы «Памынт» (па-малдаўску — «зямля») у народзе пачалі называць не інакш чым «мармынт» — «магіла».

Як вынік, з 2002 года пачаўся па сутнасці адваротны працэс кансалідацыі. Прыватнікі, асабліва на поўдні, сталі ствараць кааператывы і здаваць ім свае зямельныя квоты на ўмовах доўгатэрміновай арэнды. І справы пайшлі ўгару: павысіліся ўраджаі, павялічыліся заробкі. Прычым сёння аб'яднанне фактычна стымулюецца дзяржавай. У прыватнасці, існуе практыка датацый пры пасадцы таго ж вінограду — у памеры прыкладна тысячы долараў на гектар. Але датаванне адбываецца пры ўмове, што агульная плошча плантацыі складае не менш чым 5 гектараў. Як правіла, такіх вялікіх надзелаў у «аднаасобнікаў» проста няма.

Нестандартная крыніца інвестыцый

Калі значная частка індустрыяльных гігантаў засталася «на тым беразе» Днястра і зніклі многія «савецкія» сувязі, эканоміка Малдовы пакацілася ўніз, прычым падзенне працягвалася прыкладна да пачатку новага стагоддзя. Але нішто не працягваецца вечна. Апошнія гады ВУП краіны павялічваўся прыкладна на 6-8 %, непрыемнае выключэнне з гэтай тэндэнцыі чакаецца толькі сёлета — крызіс аднолькавы для ўсіх.

Дзеля справядлівасці, казаць, што сусветныя эканамічныя ўзрушэнні аказаліся фатальнымі, таксама нельга. Нягледзячы ні на што, не спынілася вытворчасць віна, працуюць прадпрыемствы харчавай, лёгкай, мэблевай, будаўнічай прамысловасці. Някепскі даход дае мытня. Урэшце, маюць малдаване і яшчэ адну крыніцу паступленняў — гастарбайтараў. Лічыцца, што за мяжой, пераважна ў Італіі, Партугаліі і Грэцыі занята каля мільёна (!) грамадзян невялікай краіны.

Паводле некаторых ацэнак, толькі летась гастарбайтары прывезлі на радзіму ад 1,5 да 3 мільярдаў долараў. Менавіта дзякуючы гэтым грашам тут вядзецца актыўнае будаўніцтва жылля, інвестуюцца прыватныя эканамічныя праекты — узровень падаткаабкладання для бізнэсу высокім не назавеш.

І ўсё ж весці размовы выключна аб перавагах масавага «экспарту» працоўнай сілы не выпадае. Адмоўныя бакі не менш відавочныя. Так, не сакрэт: перш-наперш гастарбайтары прыносяць карысць іншым дзяржавам. Да таго ж распаўсюджаная практыка ўладкавання ў замежжы рэзка абвастрыла такую праблему, як распад сем'яў. Тым больш, што з Малдовы з'язджае шмат не толькі мужчын, але і жанчын — каб уладкавацца нянечкамі, гувернанткамі, работніцамі сацыяльных службаў.

Ніжэйшая цана. І «цяжкая» квартплата

Кошт жыцця паняцце зноў-такі адноснае. Сярэдні заробак у Малдове атрымліваецца недзе на трэць меншым, чым у Беларусі. Затое і цэны тут ніжэйшыя. Пры курсе долара ў 11,2 і еўра ў 15,8 лея цана на добрую свініну вагаецца ў межах 70—80, на каўбасу вараную — у 50—90, каўбасу сухую — 60—120, сыр — 80—100, брынзу — 40—45, хлеб — 3, малако — 7—8 адзінак нацыянальнай валюты. А вось што па-сапраўднаму дарагое, дык гэта «камуналка». Улетку плаціць за трохпакаёўку даводзіцца каля 70 долараў, а ўзімку, у сувязі з высокай цаной імпартнага газу, гэта лічба ўзрастае ці не ўтрая.

Сонца над манастырамі

Малдова — краіна сонца. І месца пад ім ва ўсіх сэнсах хапае ўсім. Малдаване, рускія, украінцы, балгары, немцы, чэхі, цыгане, гагаузы мірна жывуць побач стагоддзямі, прычым гісторыя тых жа гагаузаў шмат у чым паказальная. Па сутнасці яны з'яўляюцца прамымі нашчадкамі туркаў, якія адмовіліся пакідаць гэты край разам з войскамі Атаманскай імперыі і нават прынялі тутэйшае хрысціянства. У перакладзе з турэцкай само слова «гагауз» — гэта «здраднік». Аднак ва ўяўленні малдаван — добры сусед.

Нягледзячы на шматнацыянальнасць, амаль усіх грамадзян Малдовы аб'ядноўвае не толькі агульная радзіма. Не менш важная акалічнасць — агульнае хрысціянскае веравызнанне. Прычым яго ўсходняй, праваслаўнай плыні.

Для нас крыху дзіўна, але факт: не самая вялікая па памерах Малдова мае з чатыры дзясяткі дзейных праваслаўных манастыроў, і апошнім часам у іх аднаўленне ўкладваюцца значныя грошы. Прычына не толькі ў даніне традыцыям, апроч усяго, велічныя і не вельмі храмы не без падстаў лічацца лепшай «прынадай» для турыстаў. Як і эксклюзіўная прапанова «вінных» тураў з наведваннем вінаграднікаў, заводаў-вытворцаў і, зразумела, з дэгустацыямі. Бо малдаўскае віно — брэнд па-сапраўднаму варты і папулярны. Але гэта асобная і не менш цікавая тэма.

Сяргей ГРЫБ.

Мінск — Кішынёў.

P.S. *Аўтар выказвае падзяку кіраўніцтву Мінскага завода вінаградных вінаў за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу.*

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II ПАЎГОДДЗЕ АБО IV КВАРТАЛ 2009 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ
НАШЧАДКІ ЧАРНОБЫЛЮ
МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
СВАЯ СПРАВА
ЖЫЗНДОЛЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ! ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ
Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	10 600 рублёў на месяц 63 600 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	9 990 рублёў на месяц 59 940 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	17 050 рублёў на месяц 102 300 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	15 550 рублёў на месяц 93 300 рублёў на паўгоддзе
ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёск Мінгарсаюздруку)		
ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8 410 рублёў на месяц 50 460 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	7 830 рублёў на месяц 46 980 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	11 086 рублёў на месяц 66 516 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	10 525 рублёў на месяц 63 150 рублёў на паўгоддзе

МАТАЦЫКЛ СУПРАЦЬ ФУРЫ: ДЗВЕ АХВЯРЫ

13 верасня а палове 5-ай раніцы ў Асіповіцкім раёне паблізу вёскі Смык у аўтааварыі загінулі два маладыя мужчыны.

Матацыклам «Урал» кіраваў 26-гадовы жыхар ваеннага гарадка Цэль: ён не справіўся з кіраваннем, выехаў на сустрэчную паласу і сутыкнуўся з грузавым аўтамабілем «Вольва». У супрацьстаянні з цяжкай фурай у матацыклістаў не было шанцаў выжыць: ад атрыманых траўмаў на месцы загінулі вадзіцель «Урала» і яго 28-гадовы пасажыр.

У Магілёўскай ДАІ паведамілі, што вадзіцель матацыкла не меў правоў на кіраванне транспартным сродкам, матацыкл своечасова не прайшоў тэхагляд і не меў рэгістрацыйных нумароў.

Алена КАЗЛОВА.

ЕХАЎ ТРАКТАР ПА ВЁСЦЫ

Жыхар з в. Петкавічы Баранавіцкага раёна ехаў вечарам на трактары з навясной сеялкай па вуліцы роднай вёскі і сутыкнуўся з аўтамашынай «ВАЗ-2108», якая ехала насустрач.

Аўтамабіль з'ехаў у кювет і ўехаў у дрэва. Вадзіцель і трое пасажыраў апынуліся ў бальніцы. Праз некалькі гадзін адна з пацярпелых памерла.

«АБСТРЭЛ» З ЗАСАДЫ

Вечарам на аўтамагістралі Слонім—Высокае каля в. Пелішча невядомы наладзіў засаду і вёў «абстрэл» каменнем аўтамабіляў, якія праязджалі там.

У выніку было пашкоджана шкло ў дзвюх машынах.

Міліцыя шукае 21-гадовага хулігана з в. Рэчыца.

ТУТ — БУЛЬБА, А ТАМ — САЛА

Жыхарка Івацэвічаў, якая пражывае па вул. 40 гадоў БССР, зазірнула ў адрыну і ўбачыла, што няма бульбы.

Нехта вырваў прабой і ўкраў зімовы запас.

Аператыўнікі выйшлі на злодзеяў. Жыхара Івацэвічаў удалося затрымаць, а другі злодзей, з в. Любішчыцы, збег.

А вось у жыхара в. Велікарыта маладзіца з в. Печкі сцягнула 10 кг сала. З яе ўзялі падпіску, што нікуды не з'едзе.

МНОГА КАРПАЎ — ВЯЛІКІ ШТРАФ!

У в. Здзітава жабінкаўскія міліцыянеры праверылі аўтамашыну мясцовага жыхара і знайшлі там 104 кг карпаў.

Высветлілася, што разам з жыхаром г. Жабінка яны самавольна налавілі рыбы ў вадаёме прадпрыемства «Сакалова». Заведзена крымінальная справа. Браканьераў чакае вялікі штраф.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ІМІТАЦЫЯ КАМЕРЦЫІ

Нядаўна ў Мінску прайшоў чарговы рэспубліканскі кірмаш «Купляй беларускае!» Яго наведаў наш карэспандэнт. Уражанні засталіся далёка не самыя пазітыўныя. Бо купляць на фоне таварнага багацця сталіцы, па вялікім рахунку, амаль не было чаго.

Погляд

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Правінцыйны базарчык у цэнтры сталіцы

Велізарная зала выставачнага павільёна на праспекце Пераможцаў, 14 з дахам, які нагадвае абрысы лятальнай касмічнай талеркі, была занятая толькі на палову. Сярэдзіна дня, а народу ля прылаўкаў да крыўднага мала. Сям-там бадзяліся асобныя наведвальнікі пераважна сталага ўзросту. І гэта пры тым, што цэны на кірмашы, прама скажам, былі вельмі прымальныя і па сённяшнім часе прывабныя. Гандлёвая надбаўка складала 10—15 %, а некаторыя ўдзельнікі ўвогуле, згодна з іх словамі, прадавалі свой тавар без нацэнкі — сабекошт плюс падатак на дабаўленую вартасць. Нагадаем, у мінскіх крамах гандлёвая нацэнка нярэдка дасягае 30 %.

— Ну як ідзе гандаль? — спытаў у работніцы прылаўка Мінскай птушкафабрыкі. Тая ў адказ сумна развяла рукамі. — Амаль няма пакупнікоў, хоць наш тавар якасны, свежы і больш танны, чым у мінскіх крамах. Ну дзе вы такія сардэлькі набудзеце за восем тысяч? А мяса птушкі па такой цане? — Пакупнікоў не было, а таму жанчына ахвотна падтрымала размову. — Не тут трэба было ладзіць кірмаш. Паглядзіце, вакол няма жылых дамоў, адкуль людзі возьмуцца? Вось бы разгарнуць кірмаш у шматлюдным спальным мікрараёне, іншая справа, — гаворыць прадавец і пачынае мяне горача ўгаворваць набыць што-небудзь.

Дзіўны гэта быў кірмаш у цэнтры сталіцы. Не шамацелі грашовымі купюрамі шматлікія пакупнікі, не сноўдалі туды-сюды грузчыкі з партыямі тавараў, як на той жа Камароўцы. Нейкі цікі і вельмі правінцыйны базарчык рознай драбязы, якія штодзень разгортваюцца ў невялікіх гарадах і пасёлках. Сціпласць, вядома, упрыгожвае, але часам гэта даволі сумнеўнае ўпрыгажэнне для камерцыйнай падзеі «Купляй беларускае!». Ды і сумная атмасфера кірмашу не натхняла рабіць пакупкі.

Заблытвала наведвальнікаў, падкрэслім, рэспубліканскага кірмашу і сама арганізацыя размяшчэння гандлёвых пунктаў. Ніякай сістэмы тут не назіралася. Відаць, хто заняў першым зручнае месца, той і малайчына. Таму малюнак быў стракаты, як некалі на стыхійных рынках часоў скону гарбачоўскай перабудовы. Побач з гандлярамі мяснымі і малочнымі прадуктамі прапаноўвалі шкарпэткі, зімовыя шапкі, школьнае адзенне, жаночую бялізну.

Для мяне сюрпрызам стала секцыя гіганта айчыннай індустрыі «Гомсельмаша». Там, аказваецца, акрамя сельгастэхнікі выпускаюць яшчэ і мэблю. Аднак ажыятажу вакол яе ўзараў не назіралася. Сумныя прадаўцы з «Гомсельмаша» моўчкі сядзелі ў чаканні пакупнікоў. Іх няхітры тавар — драўляныя сталы і ложкі, відаць, давядзецца везці назад. Узнікае пытанне: а ці трэба было ўвогуле прывозіць такую прадукцыю з Гомеля, калі ў Мінску спецыялізаваныя мэблевыя салоны і крамы забітыя аналагічнымі вырабамі і, на мой погляд, лепшай якасці і па больш таннай цане. Скажам, гомельская лава за 262 тысячы рублёў здалася мне дарагім задавальненнем. Ды і ўвогуле сёння мэблю, каб яна карысталася попытам, трэба выпускаць на спецыялізаваных мэблевых прадпрыемствах.

Ведаеце, пасля агляду экспазіцыі зусім не ўзнікае жадання хутчэй набываць тое беларускае, што было ў экспазіцыі. Неяк шкада стала большую частку ўдзельнікаў кірмашу і соромна за яе арганізатараў. Такое ўражанне, што трапіў на нейкае фармальнае мерапрыемства ў рамках рэспубліканскай кампаніі па актывізацыі продажу прадукцыі айчынных вытворцаў. І адбылося яно ў многім дзякуючы адміністрацыйнаму рэсурсу. Як гаворыцца, у мэтах паляпшэння справаздачнасці. Бо чым яшчэ растлумачыць надзвычай стракаты і, на мой погляд, выпадковы склад удзельнікаў кірмашу. Тым не менш факт правядзення рэспубліканскага кірмашу з пералікам яго ўдзельнікаў і сапраўды можна ахарактарызаваць як значную камерцыйную падзею: удалося ахапіць многія раёны краіны.

> **«Купляй беларускае!» А што купляць, уласна кажучы? У любым звычайным мінскім супермаркеце выбар айчынных прадуктаў харчавання і прамысловых тавараў больш шырокі, чым на рэспубліканскім кірмашы.**

«Прадай беларускае!»

«Купляй беларускае!» — сёння модны, патрыятычны і надзённы лозунг. Дзе яго толькі ні чуеш і ні бачыш. Вось і так званы рэспубліканскі кірмаш велізарнымі літарамі заклікаў купляць беларускае. А што было, уласна кажучы, там купляць? У любым мінскім супермаркеце выбар айчынных прадуктаў харчавання ды і часам прамысловых тавараў больш шырокі, чым на гэтым рэспубліканскім кірмашы. Вядома, лозунгамі справу не зварухнуць. Бо як ніколі з-за фінансавага і эканамічнага крызісу стала цяжка прадаваць беларускім вытворцам свае вырабы і за мяжу і на ўнутраным рынку, асабліва прадпрыемствам з раёнаў. І, здавалася, сталіца, як самы заможны рэгіён краіны, дае магчымасць трохі разгрузіць склады. Асабліва для тых, хто выпускае прадукты харчавання, тэрмін захоўвання якіх абмежаваны, а попыт у сваім і суседніх раёнах задаволены. А тут яшчэ Расія — асноўны замежны спажывец беларускіх харчовых тавараў, час ад часу прад'яўляе прэтэнзіі да іх, круціць носам, маўляў, не тыя стандарты якасці. Але чамусьці вытворцы з раёнаў у сваёй большасці праігнаравалі вераснёўскі кірмаш у Мінску. Відаць, няма тых жаданых аб'ёмаў продажаў, якія б рабілі рэнтабельнымі гандлёвыя дэсанты ў Мінск.

Каб людзі кінуліся набываць беларускае, трэба вучыцца гандляваць айчынным таварам. «Прадай беларускае!» — вось сёння, на мой погляд, галоўны лозунг дня. Нездарма на самым высокім узроўні прагучала парада ператварыць Саўмін, вобразна кажучы, у адно вялікае Міністэрства гандлю. Для паспяховай камерцыі, вядома, варта ў першую чаргу мець свой канкурэнтаздольны па цане і якасці з імпартным прадукт. За апошнія гады нашы вытворцы і гандлёвыя прадпрыемствы многаму навучыліся. Шмат зроблена, напрыклад, па мадэрнізацыі крамаў, афармленні іх вітрын, укараненні сучаснай і прыгожай (не горшай за імпартную) упакоўкі тавараў. Таксама навучыліся і рамяству выкладаць тавары на паліцах. Аднак усяго гэтага абсалютна не было бачна на кірмашы. Там арганізацыя гандлю нават на першы і недасведчаны ў гэтай мудрагелістай сферы погляд, не тое што кульгала на абедзве нагі, увогуле была ніжэйшай за любую крытыку. У асноўным тавары, як у сельмагах савецкіх часоў, былі надзейна абаронены прылаўкам ад пакупнікоў. Яно і зразумела, бо на хуткую руку якія можна стварыць умовы для паўнацэннага гандлю. Але ж наведвальнікаў гэта мала хвалюе.

Пакупнік усё бачыць

Паслухаем наведвальнікаў. На іх погляд, рэспубліканскі статус, калі хочаце, абавязвае да пэўнага ўзроўню правядзення кірмашу, работы з яго ўдзельнікамі і з пакупнікамі. А ён, па іх водгуках, з кожным разам усё зніжаецца. Раней хоць стараліся нейкім чынам прывабіць людзей, перад павільёнам ладзілі кароткія тэатралізаваныя паказы, у СМІ размяшчаліся рэкламныя абвесткі, то цяпер гэтага амаль няма.

— Ды і час працы кірмашу выбраны не вельмі ўдала: з 10 да 18 гадзін. І гэта калі асноўная маса мінчан працуе да пяці-шасці вечара. Дзе ім паспець на кірмаш. Гэта я працую і жыву непадалёк, а таму і паспела сюды. Больш зручным быў бы рэжым працы з 11 да 20 вечара. А то сюды наведваюцца ў асноўным пенсіянеры, а яны, як вядома, не самая плацежаздольная катэгорыя насельніцтва сталіцы, — уступае ў размову жанчына сярэдніх гадоў.

На думку іншай наведвальніцы, кірмашы трэба рабіць тэматычнымі. Бо катэгорыя тавараў шырокага ўжытку ахоплівае такую велізарную колькасць вырабаў, што імі можна было б запоўніць не адзін такі павільён на праспекце Пераможцаў. Дык чаму б не праводзіць мэблевы кірмаш, тавараў лёгкай прамысловасці, асенне-зімовага адзення і г. д. Каб чалавек загадзя ведаў, які тавар ён знойдзе.

Адносна малады чалавек лічыць, што арганізатарам не варта моцна эканоміць на рэкламе. Бо аднаго плаката з велізарнымі літарамі «Купляй беларускае!» на фасадзе будынка выставачнага павільёна аб кірмашы ўсё ж недастаткова. Больш інфармацыі — больш наведвальнікаў.

— Між іншым, непадалёк ад выставачнага павільёна па праспекце Пераможцаў знаходзіцца адзін з універсамаў сеткі крамаў «Суседзі». Ён рэгулярна праводзіць акцыі продажу асобных тавараў па так званых асабліва цэнах. І робіцца гэта па-сучаснаму. Тавары па зніжаных на пэўны перыяд цэнах выстаўлены асобна, на ўваходзе ў краму ляжаць стосы рэкламных лістовак з выявай гэтых тавараў, дзе пад кожным пазначана папярэдняя і новая цана. Чаму б гэтую практыку не пераняць арганізатарам кірмашу? — пытаецца сівы мужчына.

Шанц для перыферыі

Дык можа зусім адмовіцца ад падобных кірмашоў як эканамічна малаперспектыўных? Навошта іх ладзіць, угаворваць, а магчыма і прымушаць вытворцаў самых розных рэчаў камандзіраваць у Мінск людзей, марнаваць немалыя грошы і час? Чым сёння можа здзівіць правінцыя спешчаных багаццем разнастайных тавараў мінчан? Звычайнымі каўбасой і вырабамі шырокага ўжытку? Можа і як яшчэ можа. Мае сураз-моўцы з ліку пакупнікоў узгадалі смачную мяса-малочную прадукцыю агракамбіната «Сноў» з Нясвіжскага раёна, якая карыстаецца ў сталіцы ўстойлівым попытам. Галоўнае, прапанаваць мінчанам тое, што ім трэба. І пры ўсёй незадаволенасці працай кірмашу большасць наведвальнікаў, з якімі давялося пагутарыць, выказаліся за далейшае правядзенне кірмашоў. Толькі вось рабіць гэта трэба па-сучаснаму.

Дзеля справядлівасці адзначым, што даволі значная ў параўнанні з іншымі ўдзельнікамі прысутнасць Пастаўскага раёна. Каля прылаўкаў яго спажывецкай кааперацыі нават час да часу ўтвараліся невялікія чэргі: цэны на мясныя і малочныя прадукты вабілі сваёй, як сёння модна казаць, дэмакратычнасцю.

Не абышлося і без нечаканых, ва ўсякім разе для мяне, высноў. Адзін наведвальнік такім чынам пракаментаваў вельмі сціплы выбар тавараў з перыферыі на кірмашы: «Не пускаюць мінскія ўлады! Вы што, думаеце, кожны вытворца з глыбінкі можа прасунуць свой тавар на сталічны рынак? Дзе там. Толькі свае і тыя, хто зможа зацікавіць гандлёвыя прадпрыемствы ўзяць тавар. Адным словам, камерцыя».

Думаю, гэта перабольшванне. Хутчэй, прычына ў іншым. Правінцыя яшчэ не навучылася прадаваць свае тавары ў Мінску ва ўмовах насычэння рынку таварамі. Многія раённыя прадпрыемствы не хочуць ці баяцца канкурыраваць з сучаснымі камбінатамі і заводамі. Далёка не кожнае раённае прадпрыемства з глыбінкі можа паспяхова спаборнічаць па цане, якасці і афармленні прадукцыі з прасунутымі мінскімі канкурэнтамі. Таму ўдзел у падобных кірмашах дазволіў бы вытворцам з глыбінкі асабіста адчуць кан'юнктуру сталічнага рынку і прыстасавацца да яе. Безумоўна, «правінцыялы», якія могуць прапанаваць нешта сваё адметнае, новае (і зноў жа па прымальнай цане), маюць неблагі шанц замацавацца на сталічным рынку.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Даверлівыя пенсіянеры церпяць ад махляроў

11 верасня 88-гадовая бабруйчанка звярнулася з заявай у міліцыю: да яе ў кватэру ўдзень зайшлі дзве невядомыя жанчыны (мяркуецца, што гэта былі цыганкі) пад выглядам сацыяльных работнікаў. Пасля таго, як яны сышлі, бабуля выявіла знікненне 11 мільёнаў рублёў.

У той жа дзень 65-гадовы бабруйчанін таксама папрасіў дапамогі ў праваахоўны органаў. Пенсіянер лічыць, што яго падманулі ў Маскве: паводле заявы, незнаёмы чалавек улетку пад выглядам аплаты за лекі ў адным з медыцынскіх цэнтраў расійскай сталіцы выманіў 1300 долараў і 8 тысяч расійскіх рублёў.

Алена КАЗЛОВА.

Ведай нашых!

КАЛІ ПРАЦА Ў РАДАСЦЬ

Пад эгідай Міжнароднага бюро Усветнага паштовага саюза штогод праводзіцца моладзевы міжнародны эпісталярны конкурс, удзел у якім бярэ і Беларусь. Гэта значыць, што нашы хлопцы і дзяўчаты ва ўзросце да 15 гадоў, як і іх аднагодкі з усіх канцоў свету, пішуць лісты на зададзеную тэму. Сёлета, напрыклад, у іх (у гэтых лістах-сачыненнях) трэба было паразважаць: як годныя ўмовы працы могуць прывесці да паляпшэння жыцця.

Слова «элементарна» ў творы, які (падкрэслім — на міжнародным узроўні!) прадстаўляў нашу краіну, не было, але... Задавальненне ад сваёй працы, пісала вучаніца 7-га А класа СШ № 31 г. Магілёва Аліна Байнер, можна атрымліваць толькі тады, калі для яе ёсць, па-першае, усё неабходнае (у тым ліку тэхніка), па-другое — годная заработная плата, патрэбяе, належны адпачынак штодня і водпуск штогод «куды захочаш»...

Як стала вядома, журы конкурсу адзначыла, што юнай Аліне «ўдалося вобразна і вельмі натхнёна распавесці пра даходы і тэхналогіі», што ў яе атрымалася «вельмі мілае, душэўнае сачыненне» на далікатную і важную тэму. Вынік — трэцяя прэмія. Гэта, на жаль, не першая, як у Вікторыі Даніловіч з Дрыбіншчыны ў 2003-м, але...

Ул. Інф.

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА

проводит 16 октября 2009 г. аукцион по продаже объектов недвижимости государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

ЛОТ № 1

Капитальное строение (здание гаражей), инв. № 320/С-19407 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

Сведения о предмете аукциона: здание кирпичное одноэтажное, общей площадью 174 кв.м, фундамент бетонный, год постройки 1985.

Местонахождение: Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Северная, д. 7.

Условия использования – под производственные и складские помещения.

Земельный участок – 0,1757 га. Срок аренды земельного участка 15 лет.

Начальная цена единого предмета аукциона – 44 180 509 рублей, в т.ч. имущества – **33 142 019** рублей, права заключения договора аренды земельного участка – **11 038 490** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и государственной регистрацией в отношении этого участка, составляют **599 547** руб.

Задаток, вносимый участником, – 4 000 000 рублей.

Продавец: имущества – транспортное республиканское унитарное предприятие «Гомельское отделение Белорусской железной дороги», тел. (0232) 95 26 43; права заключения договора аренды земельного участка – Жлобинский райисполком, тел. (02334) 5 04 89.

ЛОТ № 2

Капитальное строение (здание конторы с гаражом и сараем), инв. № 343/С-25086 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

Сведения о предмете аукциона: - капитальное строение: 1-эт. бревенчатое здание конторы, пл. 57,2 кв.м, год постройки – 1962; кирпичный сарай, пл. 12,3 кв.м; кирпичный гараж, пл. 31,9 кв.м, год постройки 1990.

Местонахождение: Гомельская обл., г.п. Брагин, ул. Советская, 46.

Условия использования – под административное здание, одноквартирный жилой дом.

Земельный участок – 0,1779 га. Срок аренды земельного участка 50 лет.

Начальная цена единого предмета аукциона – 8 888 163 рубля, в т.ч. имущества – **7 459 233** рубля (цена снижена на 20 %), права заключения договора аренды земельного участка – **1 428 930** руб. Расходы, связанные с формированием земельного участка и государственной регистрацией в отношении этого участка, составляют **238 340** руб.

Задаток, вносимый участником, – 800 000 рублей.

Продавец: имущества – РУП «Гомельэнерго», тел. (0232) 79 61 16, 79 63 75, права заключения договора аренды земельного участка – Брагинский райисполком, тел. (02344) 2 17 62.

ЛОТ № 3

Капитальное строение (здание склада), инв. № 322/С-18063 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

Сведения о предмете аукциона: здание кирпичное одноэтажное, общей площадью 803,9 кв.м, фундамент бетонный, год постройки 1954.

Местонахождение: Гомельская обл., г. Рогачев, ул. Белинского, д. 5.

Условия использования – по целевому назначению или под объект для производства, ремонта мебели, для производства текстильных, швейных и кожаных изделий, для специализированных складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения.

Земельный участок – 0,1313 га. Срок аренды земельного участка 20 лет.

Начальная цена единого предмета аукциона – 95 674 038 рублей, в т.ч. имущества – **94 094 672** рубля, права заключения договора аренды земельного участка – **1 579 366** рублей.

Задаток, вносимый участником, – 9 000 000 рублей.

Продавец: имущества – транспортно-экспедиционное республиканское дочернее унитарное предприятие «Гомельжелдортранс», тел. (0232) 95 45 25; права заключения договора аренды земельного участка – Рогачевский райисполком, тел. (02339) 4 15 60.

ЛОТ № 4

Капитальные строения столбо-пропиточного пункта: административного здания инв. № 340/С-1723 и цеха окорки столбов с навесом над пропиточной ямой и забором) инв. № 340/С-1724 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

Сведения о предмете аукциона: здания кирпичные одноэтажные, общей площадью 474,8 кв.м, фундамент бетонный, год постройки: административного здания – 1972 и цеха окорки столбов – 1981.

Местонахождение: Гомельская обл., Речицкий район, г. Василевичи, ул. Маяковского, д. 1а.

Условия использования – под объект производственного или складского назначения.

Земельный участок – 1,0114 га. Срок аренды земельного участка 55 лет. Земельный участок имеет ограничения в использовании на площади 0,0893 га – охранная зона линии электропередачи ВЛ-10 кВ.

Условия аукциона: торги по данному лоту проводятся в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 27 февраля 2007 г. № 108. К участию в торгах допускаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели на условиях:

• осуществления покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте не менее 3-х лет;

• создания не менее 2-х дополнительных рабочих мест.

Начальная цена единого предмета аукциона – 8 841 496 рублей, в т.ч. имущества – 70 000 рублей, права заключения договора аренды земельного участка – **8 771 496** рублей.

Задаток, вносимый участником, – 800 000 рублей.

Продавец: имущества – республиканское унитарное предприятие электросвязи «Белтелеком», тел. (0232) 70 13 14; права заключения договора аренды земельного участка – Речицкий райисполком, тел. (02340) 2 25 79.

Организатор аукциона – фонд «Гомельоблимущество», **г. Гомель, проспект Ленина, 3,** контактные телефоны **(0232) 70 14 72, 74 90 27.**

Аукцион проводится **16 октября 2009 г. в 11.30 по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3.**

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Желающим участвовать в аукционе необходимо в срок до 17.00 14 октября 2009 г. заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон и представить организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе по установленной форме; заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение задатка на счет организатора аукциона, указанный в извещении; копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе участники или их представители предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Организатор аукциона вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.

Задаток перечисляется на расчетный счет фонда «Гомельоблимущество» **№ 3642927330048** в филиале **№ 300** АСБ «Беларусбанк» г. Гомель, код **МФО 151501661, УНН 400243904.** Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3, фонд «Гомельоблимущество», **ком. 406, с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** по рабочим дням **по 14 октября 2009 г.** включительно.

Заключительная регистрация участников **16 октября 2009 г. с 10.00 до 11.15.**

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполкомом решения о предоставлении ему земельного участка обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

После совершения победителем аукциона названных платежей, но не позднее 2 рабочих дней, с ним продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка. Оплата за приобретенный объект осуществляется в течение 30 календарных дней после подписания договора купли-продажи.

Информация о продаваемых объектах расположена на сайте Гомельского облисполкома: www.gomel-region.by, и сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: www.gki.gov.by.

Фонд «Гомельоблимущество» информирует, что объявленные ранее на 18 сентября 2009 года торги по лотам № 1 и № 2 не состоятся в связи с переносом их на 16 октября 2009 года.

Навіны сталіцы

СМАЛЯВІЧЫ СТАНУЦЬ ПЕРШЫМ ГАРАДАМ-СПАДАРОЖНІКАМ МІНСКА

Пра гэта паведаміў выканаўца абавязкаў старшыні Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька ў Дзень горада ў час сустрэчы ў гарадской ратушы з ганаровымі грамадзянамі Мінска і былымі кіраўнікамі гарадскога выканаўчага камітэта.

У Смалявічах вызначана дадатковая тэрыторыя, дзе размесціцца пасёлак на 20 тысяч жыхароў. Тут пабудуюць жылыя дамы, школу, дзіцячы садок, паліклініку.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».

ПАЧНЁМ БЕРАГЧЫ СЦЕНЫ?

У большасці пад'ездаў жылых дамоў Мінска выкананы касметычныя рамонты, якія часткова прафінансавалі жыхары.

Згодна з прынятым Мінгарвыканкамам у 2001 годзе рашэннем № 920, жыллёва-эксплуатацыйным арганізацыям рэкамендавана прыцягваць жыхароў да долевага ўдзелу ў фінансаванні рамонту свайго пад'езда. Гэта работа працягваецца. Як паведаміў начальнік вытворчага аддзела ГВА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Генадзь Місуна, за восем месяцаў работнікі жыллёвых службаў правялі з мінчанамі 1761 сход, у выніку заключаны 917 дамоваў на рамонт пад'ездаў. Сёння ў жылых дамах, што знаходзяцца на абслугоўванні ЖРЭА раёнаў, налічваецца 22 230 пад'ездаў.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, «Мінск—Навіны».

НАБОР ХАРЧАВАННЯ — ПА ЖАДАННІ

З 1 кастрычніка гэтага года пасажырам фірменнага цягніка № 3/4 па маршруце Мінск — Масква не трэба будзе плаціць у абавязковым парадку за наборы (рацыёны) харчавання.

Як паведамілі ў аддзеле арганізацыі пасажырскіх перавозак Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі, іх кошт выключаецца з платы за праезд. У пералік паслуг, уключаных у кошт праезду ў цягніку № 3/4 Мінск — Масква, уваходзіць толькі камплект пасцельнай бялізны.

Віктар КУШНАРОЎ, «Мінск—Навіны».

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-6

Працягваем гэты класіфікацыйны конкурс заданнем № 4 — камбінацыйнай праблемай:



Белыя: a7, b6, c7, g3, g7, h4 (6). **Чорныя:** a5, d4, d8, e5, f4, f8, h2 (7). Выйгрыш.

Па-за конкурсам пазнаёмцеся з міні-праблемай, якая прысвячаецца майстру ФМЖД Віктару Шульгу (Мінск):

Белыя: a7, b6, c7, d6, g3, g7 (6). **Чорныя:** a5, d8, e5, f4, f8, h2 (6). Перамога белых.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты "Звязда", рубрыка "Шашкі".**

АМАТАРАМ 100-КЛЕТАК

Ім прапануем у якасці бліц-50/3 праблему задачнага тыпу нашага земляка з Мазыра Аляксандра Маісеева, які жыве і працуе ў ЗША, складзеную ім у сааўтарстве з вядучым рубрыкі:



Белыя: 19, 21, 27, 30, 34, 40, 46, 47, 48, 50 (10). **Чорныя:** 9, 24, 32, 36, 37, 38, 39, 41, 43, 45 (10). Белыя пачынаюць і пазбаўляюць хадоў чатырох простых чорных.

А цяпер здыміце з дошкі простыя 36, 41, 45, 46, 47 і 50 і атрымаеце міні-праблему з той жа развязкай, але з запіраннем толькі адной фігуры чорных.

НЕ ТОЛЬКІ РАШАЕМ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў:

"Пагода ў доме"-6/1 (М. Грушэўскі): 1. de7 2. ab2 3. ef8 4. f:h6 5. hg7 6. g:g3!x.

Бліц-49/6 (У. Рычка): 1-7 (50 А) 35, 47, 47-24, 21#. А (31) 41, 17, 28, 11, 50#.

Заданні аўтарскага конкурсу-8/6-15, бліцаў-47/3-6, 48/6 і 49/1-5 выканалі: І. Астроўскі і В. Шульга (Мінск), В. Голас (Любань), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), Д. Камчыцкі (Магілёў), У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), А. Кіслы (Узда), А. Шурпін (Клімавічы), Аляксандра Камінская (Вілейка), С. Нячаеў (Баранавічы), А. Белы і П. Шклудаў (Наваполацк), Б. Завадскі (Брэст), А. Перавознікаў і У. Сапяжынскі (Рагачоў), Г. Будзіловіч (Івацэвічы), А. Пярхальскі (Глыбокае), настаўніца Марыя Яўгенаўна Лічко і яе вучні Дар'я Малашка, А. Жур, Я. Казлоў і М. Фокін (в. Возера Уздзенскага раёна) і інш.

Сярод іх разглядаюць: П. Шклудаў — 1. b8/d6x, 1. d6 (e5!)=, 1. d6 (a:c5) 2. b8x, 1. cd6 a:c5 2. d:b4 3. h:c5 4. ab8 5. b:e1 hg5 6. eh4x у пазіцыі № 2 Д. Камчыцкага (4 жніўня) і 6. b6 замест 6. h6, а 6. h8= у бліцы 40/6 М. Стэфановіча; В. Талкачоў — 1. ba3/bc3/ad8 у бліцы- 47/6 П. Шклудава; Д. Камчыцкі і У. Сапяжынскі — 1. 38 2. 1/2 у бліцы 49/3 Г. Андрэева; Аляксандр Палявы (Ізраіль) — 1. 2-35/39-34/ 1-6/ 1-7 у бліцы-49/6 У. Рычкі.

А дацэнт Белдзяржуніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, прафесар Ваенная акадэміі Рэспублікі Беларусь Іван Іванавіч Астроўскі выказвае падзяку за атрыманы сюрпрыз ад А. Пярхальскага і прыйшоў да высновы: "Вялікую справу вы робіце!".

У сваю чаргу ветэран глыбоцкага ААТ "АТП-16" Анатоль Антонавіч Пярхальскі, які адсвяткаваў сваё 70-годдзе, з чым шчыра віншуем юбіляра, даслаў у рэдакцыю пазіцыю з партыі рэспубліканскага завочнага турніру кандыдатаў у майстры (БКМ-43):



Белыя (А. Шамына): a1, b6, c1, c5, d2, g1, g3, h2, h4 (9). Чорныя (А. Пярхальскі): a7, d8, e5, e7, f4, f6, f8, h6 (8). Тут белыя пайшлі 1. gf2 і трапілі ў пастку, у чым пераканайцеся самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

СВЕДЕНИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, ПОДЛЕЖАЩЕМ РАЗГОСУДАРСТВЛЕНИЮ И ПРИВАТИЗАЦИИ

Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность			Республиканское научное унитарное предприятие «Белсудпроект» (РНУП «Белсудпроект») Министерство транспорта и коммуникаций Республики Беларусь
Адрес			246050, г. Гомель, ул. Пушкина, 11
Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции			Деятельность по исследованию и разработке в области естественных и технических наук; деятельность в области архитектуры, инженерные услуги
Положение на рынке			Не занимает доминирующего положения
Планируемые сроки разгосударствления и приватизации			3 квартал 2009 г.
Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации			Создание открытого акционерного общества
Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение			Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 3
Численность работающих, чел.			13
Срок предъявлений претензий			Месяц со дня опубликования
Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО, руб.			93 544 000
Стоимость основных фондов – всего, руб.			46 244 247
Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га			0,0668
Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, руб.			нет
Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, руб.			нет
Финансовое состояние объекта, руб.	Балансовая прибыль		3 203 984
	Задолженность	кредиторская	нет
		дебиторская	нет

УНП 100745627.

БЕГ НА ШПІЛЬКАХ і іншыя прыгоды гамяльчан у Дзень горада

Абцас не менш за сем сантыметраў — такі асноўны крытэрый адбору для ўдзельніц спаборніцтваў, якія прайшлі ў другі раз у Гомелі. 80 гомельскіх прыгажунь не пабаяліся прадэманстраваць самыя лепшыя свае якасці (хуткасць у іх ліку) і сталі ўдзельніцамі забегу на шпільках. Каб не страціць крышталёвыя чаравічкі ў пыле барацьбы, вопытныя сучасныя Папялушкі замацавалі іх на нагах... скотчам.

60 метраў, здавалася б, не вельмі доўгая дыстанцыя, але ж не ўсе змаглі з годнасцю яе прайсці. Сярод удзельніц былі і тыя, хто заўчасна сышоў з дыстанцыі. На шчасце, усё абышлося падрапанымі каленкамі. Зразумела ж, увага мужчын, як і іх жарты, смелым дзяўчатам, апранутым пераважна ў спадніцы і сукенкі, былі забяспечаны. Арганізатар забегу Яніна Ганчарова сцвярджае, што падобныя шоу праводзяцца ва ўсім свеце і заўсёды збіраюць вялікую колькасць гледачоў.

— Бег на абцасах падкрэслівае тое, што нашы жанчыны могуць сёння ззяць на сцэне, на подыуме і адначасова бегчы за грамадскім транспартам або ў краму.

Жарты жартамі, аднак пераможца — Кацярына Ганчар — сваімі доўгімі нагамі заваявала галоўны інтэлектуальны прыз — «гламурны» ноутбук руожавага колеру.

Між тым аўтобусы, за якімі будуць бегаць жвавыя гомельскія жанчыны — 14 новенькіх МАЗаў — стаялі на плошчы побач. Яны купленыя за кошт сродкаў абласнога бюджэту як выкананне даручэння кіраўніка дзяржавы па штогадовым абнаўленні парка грамадскага транспарту на 10 %.

— Сёлета праведзена вялікая работа па прывядзенні ў парадак дарог у Гомелі, а добрым дарогам патрэбны транспарт, — адзначае **старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр ЯКАБСОН.** — За апошнія 5 гадоў за кошт бюджэту набыта больш за 500 аўтобусаў, для Гомеля — каля 220.

Гэтым падарункі для Гомеля не абмежаваліся. Прынамсі, рэканструяваны будынак аддзялення хуткай медыцынскай дапамогі ў Савецкім раёне абласнога цэнтра можна лічыць падарункам не толькі для гараджан. Галоўны ўрач Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Мікалай Кішко кажа, што радыус абслугоўвання новай падстанцыі — 70 кіламетраў, а значыць, жыхары бліжэйшых раёнаў вобласці, Гомельскага і Лоеўскага, хутчэй дачакаюцца «хуткай».

— Былая падстанцыя была размешчана ў жылым доме, у прыстасаваных памяшканнях, што стварала праблемы і для персаналу, і

для жыхароў дома, дзе знаходзілася аддзяленне. Сёння створаны ўсе ўмовы для нармальнай работы медперсаналу. Тут ёсць усё неабходнае абсталяванне і сучасны санітарны транспарт. Усе аўтамабілі аснашчаныя электракардыёграфамі, дэфібрылятарамі, іншай неабходнай апаратурай. І самае галоўнае — высокапрафесійныя кадры. Сёння тут працаваць прэстыжна.

Калі будынак новага аддзялення хуткай медыцынскай дапамогі ў Гомелі вызначаецца зручнасцю, то адкрытае ў Дзень горада памяшканне цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Герцэна — сапраўднай раскошай, уласцівай канцу XIX стагоддзя. Рэч у тым, што будынак, у які пераехала ўстанова, дзе захоўваецца сёння 120 тысяч кніжак на розных носьбітах, гістарычны. Намеснік дырэктара цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы горада Гомеля Жанна Еўдачэнка расказвае, што ў пабудове спачатку размяшчаўся гарадскі клуб з публічнай руска-яўрэйскай бібліятэкай. Потым, пасля рэвалюцыі, клуб стаў савецкім. У Вялікую Айчынную будынак быў разбураны і аднаўляўся наноў. Доўгі час менавіта ў гэтым памяшканні знаходзіўся гаркам партыі, а пасля — Інстытут радыялогіі. Сённяшні інтэр'ер бібліятэкі максімальна набліжаны да гістарычнага аблічча. Праўда, у наяўнасці яшчэ і ўсё неабходнае камп'ютарнае абсталяванне, без якога не абысціся ў век сучасных тэхналогій.

А яшчэ ў Гомелі ў дзень яго 867-годдзя стала больш на аднаго вулічнага музыканта. Бронзавы «Катраншчык» таксама завітаў з XIX стагоддзя ў адзін са скверaў горада над Сожам. Скульптура Вячаслава Далгова, як і немудрагелістая песенька катраншчыка, даступная ўсім літаральна. Кожны можа падысці, пакруціць ручку катрынкі і — чакаць выканання загаданага жадання. Білет удачы гарантаваны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара і БЕЛТА.

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



6				9	3	2		
		9	1	7		6		8
					6			
3	2					4		5
				2				
4		1					2	7
			3					
8		5		1	9	3		
		3	2	4				9

СУДОКУ

У квадраце з 9 на 9 клетак трэба размясціць лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным гарызантальным радку, кожным вертыкальным слупку, а таксама ў кожным малым квадраціку 3 на 3 клеткі, абмежаваным тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (12 верасня). Па гарызанталі: Будапешт. Лондан. Каштан. Маршак. Есаул. Акт. Матор. Лава. Галаўня. Эму. Канец. Марш. Трап. Тэраса. Нарада. Рым. Олаф. Калым. Пліта. «Нос». Сана. Старана. Штат. Парыж. Нота. Бар. Юта. Трактат.

Па вертыкалі: Капенгаген. Пат. Атлет. Рол. Рэаліст. Лаўра. Дата. Пік. Прафан. Армяк. Адан. Шар. Роба. Шатэн. Сыта. Ага. Жарт. Лён. Карэц. Кут. Мэта. Тлум. Акарына. Жвір. Сымон. Шрам. Самалёт.



Хачу выказаць вялікую ўдзячнасць урачу-кардыёлагу Навагрудскай цэнтральнай раённай бальніцы Ігару Пятровічу САКОЛЬНІКУ за спагадлівы і прафесійны падыход да сваіх пацыентаў. Вельмі прыемна ўсведамляць, што наша медыцына можа быць і прафесійнай, і чалавечай. Здароўя Вам, паважаны Ігар Пятровіч, шчасця, поспехаў у працы і асабістым жыцці!

Профессии нужней
Нам просто
не сыскать!
Пусть нелегка дорога,
Но Вы даны от Бога
Лечить
и врачевать!

З павагай, Л.І. СТАСЕВІЧ.

Кажуць, што...

У ДНЯПРЫ ЗАВЯЛІСЯ «ЧУЖЫЯ»?



Магілёўцы перадаюць адзін аднаму чуткі пра страшыдлу. З вуснаў у вусны, з мабільніка на мабільнік. Горад запаланіў відэазапіс: на драўляным насціле ляжыць нешта накшталт вялікага малюска. У цуда-юда тыркаюць палкай, і яно махае хвастом і раздзімае жабры. Калі сказаць шчыра, то відовішча не надта прыемнае, тым больш што яно дапаўняецца расповедам пра жахлівае здарэнне.

Маўляў, на Фацінскім заліве ў Магілёве істота атакавала мужчыну (ці то купальшчыка, ці то рыбака), якога даставілі ў бальніцу. Самыя «дасведчаныя» паведамлялі, што пачвара нібыта прысмакталася да цела і нават прабіла шчупальцам лёгкае чалавека.

Пагадзіцеся, што ўзнікаюць асацыяцыі з вядомым фільмам Рыдлі Скота «Чужы» альбо, яшчэ дакладней, з творам пісьменніка Роберта Хайнлайна «Куклаводы» пра іншапланетных паразітаў, якія прысмоктваліся на спіны людзей і кіравалі імі. Нешта падобнае, ці не так? Аднак у рэальнасці аказалася, што падабенства ёсць толькі ў жанры. Гэта фантастыка!

Па-першае, магілёўскія медыкі не пацвярджаюць наяўнасці пацыента, які б пацярпеў на вадзе ад нейкай жывёлы. Па-другое, спецыялісты ў справе аховы жывёльнага і расліннага свету катэгарычна абвяргаюць чуткі пра дняпроўскага монстра. А праўда ў тым, што да Магілёва дабраўся запіс, які раней атрымаў вялікую вядомасць у рускамоўным інтэрнэце, і з падачы нейкага мясцовага жартаўніка пайшоў у наш народ. Паводле пошукавых сістэмаў Сеткі, відэа насамрэч зрабілі больш за год таму ў расійскім Каменск-Уральскім Свярдлоўскай вобласці: людзі знайшлі істоту ў рацэ Ісець і знялі на камеру мабільнага тэлефона.

Пачварай быў шчыцень, вядомы прадстаўнік сямейства маленькіх ракападобных класа жабраногіх. Гэта жывёліна распаўсюджана на ўсіх кантынентах, акрамя Антарктыды. Яны добра жывуць у сырасці і цемры: на берагах вадаёмаў і каля балот. Шчытні, паведамляюць энцыклапедыі, нават больш старажытныя за вымерлых дыназаўраў, бо маюць унікальную сістэму выжывання. А цяпер іх утрымліваюць нават у хатніх акварыумах. Запіс з мабільнага тэлефона робіць падманлівае ўражанне аб памерах шчытня: падаецца, што гэта нешта не вельмі маленькае, хоць рэальныя памеры гэтай жывёліны бываюць ад 2 да 12 сантыметраў. Страху дадалі шматлікія паведамленні з інтэрнэту: прычым калі ў Екацярынбургу інфармавалі пра напад шчытня на чалавека, то ў Чалябінску тут жа абвяргалі прыдумку і параўноўвалі яе з легендай пра гіганцкага ўральскага полаза.

Карацей, страшная гісторыя пра шчытня стала сёлета і магілёўскай легендай. Але аматараў рыбалкі і плавання просяць не турбавацца: ні «чужых», ні «куклаводаў» на Магілёўшчыне ўсё ж няма.

Алена КАЗЛОВА.

Школьнікі будуць здаваць залік па ПДР

Міністэрства адукацыі зацвердзіла спецыяльную праграму па вывучэнні правілаў дарожнага руху, распрацаваную Дзяржаўтаінспекцыяй МУС Беларусі. Пачынаючы з верасня «дарожная грамата» даводзіцца да выхаванцаў дзіцячых садкоў, школьнікаў, студэнтаў, людзей працоўнага ўзросту і пенсіянераў з улікам іх узросту.

— Праводзіць заняткі будуць супрацоўнікі ДАІ разам з дасведчанымі педагогамі адзін раз на месяц, — кажа **старшы інспектар УДАІ МУС Станіслаў САЛАВЕЙ.** — Пры правядзенні заняткаў для кожнай узроставай катэгорыі рэкамендуецца прымяняць індывідуальны падыход. Калі ў дзіцячым садку вітаюцца гульнявыя формы навучання — пераходзіць дарогу маленькіх дзетак вучыць міліцыянер, пераапрануты ў казачнага героя, — то для вучняў старэйшых класаў найбольш актуальная тэма скутараў і матацыклаў. Згадзіцеся, складана на пальцах растлумачыць ПДР, для гэтага ў нас ёсць відэаролікі, плакаты, падручнікі. Частку заняткаў плануецца правесці ўласна на дарозе.

Карэспандэнт «Звязды» вывучала ПДР на адкрытым уроку разам з вучнямі 4 класа сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 37 Цэнтральнага раёна горада Мінска.

Прадмет па вывучэнні Правілаў дарожнага руху, як і раней уваходзіць у склад «Асновы бяспекі жыццядзейнасці». Толькі зараз на вывучэнне ПДР выдзяляецца больш часу і, каб дзеці больш адказна ставіліся да новаўвядзення, вучням 2-9 класаў па выніках навучання давядзецца здаваць залікі.

— Новая праграма, у прыватнасці, для школьнікаў, аптымальная, — лічыць **дырэктар сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 37 Цэнтральнага раёна горада Мінска Уладзімір МУХА.** — Але толькі пры правільнай падачы. Адна справа зрабіць запіс у журнале, іншая — данесці інфармацыю да вучня. Мы даверылі праводзіць урокі дасведчанаму педагогу з аўташколы ТАА «Будвертыкалінвест», з якой мы ўжо даўно сябруем. Я лічу, што спецыяліст зробіць гэта больш якасна, чым настаўнік, які нават не мае пасведчання кіроўцы.

Галоўная мэта абучэння дзяцей — як мага раней прывіць навыкі бяспечных паводзінаў на дарозе, бо ўзровень дзіцячага траўматызму па-ранейшаму высокі. Сёлета ў ДТЗ у Беларусі загінула 29 дзяцей, 441 атрымалі траўмы.

Надзея ДРЫЛА. Фота аўтара.

«Чароўны трусік» едзе ў Кіеў

(Заканчэнне.
Пачатак у нумары за 12 верасня.)

Ад Беларусі на дзіцячым конкурсе «Еўрабачанне-2009» будзе выступаць 13-гадовы Юра Дземідовіч з Мінска. На прэс-канферэнцыі пасля фіналу нацыянальнага адбору Юра расказаў пра свае планы, а яго мама — пра тое, з чаго пачынаўся музычны шлях сына.

— Юра, ты выконваеш і акадэмічны спеў, і эстрадны. Дзе больш хвалявання?

— Хваляванне заўсёды ёсць. Ці то гэта экзамен, ці якісьці конкурс альбо фестываль. Яно прысутнічае. Але калі выходжу на сцэну, праз хвілін трыццаць яно знікае. Адразу так лёгка становіцца...

— Ці ёсць аднадумцы сярод сяброў?

— У мяне шмат сяброў. Але, як я ўжо казаў, ёсць сябры, а ёсць проста таварышы. Аднадумцы — так, мы збіраемся, нешта абмяркоўваем.

— Чым захапляешся?

— Люблю гуляць у футбол, займаюся шахматамі.

— Юра, яшчэ задоўга да фіналу твая песня была ў фаварытах. Як ты сам ацэньваеш сябе, ты быў лепшым у фінале? І хто-небудзь з канкурэнтаў табе спадабаўся?

— Я лічу, што кожны з канкурсантаў меў права ўдзельнічаць у «Еўрабачанні». У кожнага быў моцны нумар, добры. Трохі мацнейшы, трохі слабейшы. Але кожны стараўся паказаць сябе. А наконт сябе?.. Я яшчэ не бачыў сваё выступленне «збоку».

— Ці пішаш «Чароўнага трусіка-2»?

— Не, не пішу, але ёсць некалькі версій песні на іншых мовах: на беларускай, напрыклад. Мне таксама яна вельмі падабаецца, вельмі прыгожа гучыць. Беларуская мова сама па сабе вельмі прыгожая.

На пытанне журналістаў, што Юра будзе рабіць у найбліжэйшыя дні, якім чынам збіраецца адпачываць і куды паедзе, хлопчык адказаў проста: пайду ў школу.

«Я люблю свой каледж, — прызнаўся 13-гадовы аўтар «Чароўнага трусіка». — І мне не церпіцца хутчэй пабачыцца з аднакласнікамі».

Песню «Чароўны трусік» 13-гадовага школьніка да самага фіналу актыўна абмяркоўвалі ў інтэрнэце: адны называлі яе шэдэўрам, іншыя бачылі ў ёй праявы нават нейкіх культаў.

— Было вельмі няпроста, — дзеліцца перажываннямі мама Юры **Таццяна Міхайлаўна.** — Цэлае лета на нас ішлі атакі. Вельмі шмат негатыву вылівалася. Спачатку было непрыемна, пасля сталі прывыкаць, а затым увогуле не заходзілі ў інтэрнэт. З Божай дапамогай адбіліся. Сёння, калі ўсё ўжо мінула, стала трохі спакайней.

Увогуле ў нас у сям'і музыкантаў не было. Юра першы. З трох гадоў сам сабе пастаянна штосьці напяваў. Мог паставіць касету і вывучыць песню. Мне людзі ўжо пачынялі падказваць, каб я аддала яго ў музычную школу. Калі Юру было пяць гадоў, я прывяла яго ў музычную школу № 2. Набор там ужо скончыўся, верасень быў на дварэ. І мне спачатку сказалі, што я спазнілася з тэрмінам. Але я ўсё ж папрасіла дырэктара яго праслухаць. Ён яму як пачаў спяваць! Той паклікаў яшчэ двух выкладчыкаў, каб паслухалі, і Юру без пытанняў узялі!

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

На сёння ў Юры ўжо багаты вопыт выступленняў. Сярод самых яркіх — спеў псалмоў з Бібліі на ідыш разам з сусветна вядомым нарвежскім хорам хлопчыкаў, якія спяваюць на ўручэнні Нобелеўскай прэміі. У найбліжэйшы час, як расказаў мастацкі кіраўнік Юры **Уладзімір ГЛУШАКОЎ,** Юра будзе спяваць перад Патрыярхам Кірылам, візіт якога чакаецца ў Мінск. Магчыма таксама выступленне Юры на канцэрце гурта «The Prodigy».

— А наконт удасканалення нумара, магу сказаць адно, — удакладняе спадар Глушакоў. — Мы будзем над ім яшчэ працаваць і пастараемся зрабіць як мага больш яркім.

Саму ж песню ўжо пераклалі на французскую, нямецкую і кітайскую мовы. Калі ж набраць у пошуку словы: Юрый Дземідовіч «Чароўны трусік» на рускай мове, інтэрнэт выдае запыты на 38 тысячах (!) старонках.

Самае цікавае, што журы нацыянальнага адбору напачатку зусім адхіліла дэма-запіс хлопчыка і не хацела прапускаць яго нават у паўфінал, гэтаксама як і песню Паліны Клішковай з Магілёва. Але рашэнне было перагледжана і пазней Юру разам з Палінай усё ж далучылі да ліку паўфіналістаў. Вы не паверыце, але менавіта гэтыя дзеці спадабаліся гледачам больш за ўсё: у фінале Паліна заняла другое месца, а Юра стаў пераможцам.

Ілья ЛАПАТО.

Крымінал

ВАЯЖОР З ФАЛЬШЫЎКАМІ

У Мінску праваахоўнікі затрымалі 43-гадовага расіяніна, які перад гэтым збыў падробленую банкноту вартасцю ў сто долараў ЗША непрацуючаму мінчаніну.

Узялі прайдзісвета ля дома № 70 па Партызанскім праспекце. Як высветлілася, махляр «засвечваецца» ўжо не ўпершыню: раней яго судзілі за падробку дакументаў. А пры асабістым аглядзе ў затрыманага было знойдзена яшчэ сем аналагічных купюр, якія, хутчэй за ўсё, ён планаваў таксама збыць даверлівым кліентам. Гэта ў чарговы раз пацвярджае тое, што грамадзянам пры аперацыях з наяўнай валютай варта ўсё ж такі мець стасункі толькі з банкамі, як не парушаючы правілы правядзення валютных аперацый, так і не рызыкуючы набыць «ката ў мяшку».

Ігар ГРЫШЫН.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.43	19.25	12.42
Віцебск —	6.32	19.16	12.44
Магілёў —	6.33	19.16	12.43
Гомель —	6.31	19.11	12.40
Брэст —	6.58	19.40	12.42
Гродна —	7.00	19.40	12.40

Месяц

Апошняя квадра 12 верасня. Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Ксеніі, Васіля, Івана, Мікалая, Міхаіла.*

К. *Кацярыны, Марыі, Мікіты.*

Фота Марыны ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА +24..+26°С	КІЕЎ +22..+24°С	РЫГА +17..+19°С
ВІЛЬНЮС +19..+21°С	МАСКВА +19..+21°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +12..+14°С

Дзве даты

15 верасня

У 1922 годзе ў Мінску заснавана Беларуская дзяржаўная і ўніверсітэцкая бібліятэка. У 1926 годзе яна была падзелена на Беларускую дзяржаўную бібліятэку (з 1993 года — Нацыянальная бібліятэка Беларусі) і бібліятэку Белдзяржуніверсітэта. У краіне з гэтай нагоды адзначаецца Дзень бібліятэк.

1906 год — выйшаў першы нумар першай легальнай газеты на беларускай мове «Наша доля». Выдавалася ў Вільні. Рэдактар-выдавец — І. Тукеркес. Актыўны ўдзел у выданні газеты бралі Іван і Антон Луцкевічы, паэтэса Цётка. У першым жа нумары «Нашай долі» адбыўся літаратурны дэбют Якуба Коласа, тут быў надрукаваны яго верш «Наш край». Выйшла толькі шэсць нумароў газеты, у снежні таго ж года яна была забаронена царскімі ўладамі.

1890 год — нарадзілася Агата Крысці, сусветна вядомы класік дэтэктыўнага жанру. З'яўляючыся ўжо вядомым аўтарам, у анкетнай графе «род заняткаў», яна заўсёды пісала: «замужняя дама», лічачы гэта самым дакладным адказам.

Цытата дня:

«Навука супакойвае. Мастацтва ж існуе, каб не даваць спакою».

Жорж Брак (1882—1963), французскі жывапісец.

ВАДЗЯНЫ

У верасні, незалежна ад цёплага надвор'я, катэгарычна забаранялася купацца. Казалі, што вада ў гэты час набірае «глыбіню», рыхтуецца да зімовага спачыну. Акрамя гэтага баяліся «нашкодзіць» вадзяному, які таксама ў гэты час «збіраецца адпачываць».

● Гаспадар рэк, азёраў і іншых вадаёмаў — вадзяны — злы дух, які ў народзе насіў назву «вадзяны чорт». Лічылася, дзе ёсць вада, там ёсць свой вадзяны. Прычым у адным вадаёме можа быць некалькі вадзяных, яны могуць жыць сем'ямі, сярод іх абавязкова будзе старэйшы, якому ўсе будуць падпарадкаваныя. Часцей за ўсё месцам іх жыхарства лічыліся ціхія, глыбокія месцы, дзе жывуць донныя рыбы — шчупакі і самы.

● У народзе лічылі, што вадзяны ўладарыць над усімі рыбамі: можа пераманіць іх з суседняга вадаёма ў свой, ці наадварот, разагнаць па іншых вадаёмах; можа схаваць на глыбіні, а можа падняць на паверхню. Рыбакі свята верылі ў тое, што вадзянога трэба задобрываць, каб ён вёў рыбу ім у сетку.

● Па народных уяўленнях, вадзяны з'яўляецца ахоўнікам рыбакоў, пчаляроў і млынароў. Таксама існуе шмат казак, у якіх распавядаецца пра тое, як яны ходзяць адзін да аднаго ў госці, і нават начуюць. Але калі вадзяны разлютуецца, то перш за ўсё яго злосць закране таго, хто бліжэй. Менавіта таму людзі, якія залежалі ад воднай стыхіі, імкнуліся задобрыць вадзянога, папрасіць яго дапамогі ў сваіх справах: «Хто сябруе з вадзяным, у таго і дождж своечасова на полі, і рыбы ў сетках дастаткова».

● Ахвяраванні і падарункі вадзяному прыносілі на пачатку рыбалоўнага сезона, пры будаўніцтве млына ці гаці. Акрамя таго, на год прыпадала некалькі такіх дзён: 16 красавіка, 22 мая, 26 верасня, 19 снежня.

● Паўсюдна лічылася, што вадзяны, які не атрымаў свайго падарунка, разлаваўшыся, можа парушыць плаціну (гаць), зруйнаваць млын, парваць сетку ці нарабіць якой іншай бяды.

● Акрамя таго, вадзяны мог пакараць рыбака за тое, што той выбраляў сетку ў святочныя (а значыць, святыя) дні; калі рыбу вудзілі ў тыя дні, калі гэта было забаронена; калі чалавек гучна размаўляў каля вады — турбаваў вадзянога.

Усміхнёмся!

— Доктар, скажыце — а наркоз у вас агульны або мясцовы?

— Хворы, не разумнічайце. Дапівайце сваю другую шклянку гарэлкі і паўзіце ў аперацыйную!

☺

Два прыяцелі.

— Чым на выхадных займаліся?

— Ды я жонцы прапанаваў у кіно схадзіць, а яна мне — у тэатр...

— Спектакль спадабаўся?

☺

Хто знайшоў пашпарт на імя Аксаны Лось, прашу не смяяцца над фатаграфіяй.

☺

Маці:

— Так, Вераніка, мусіць, мы цябе распесцілі... Прыйдзецца цябе пакараць!

— Як гэта — ВЫ распесцілі, а МЯНЕ караць?

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 5029. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12